Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

ЛіМ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ISSN 0024-4686

№ 19 (4462) 9 мая 2008 г.

У нумары:

«Я жывы і здаровы...»

Апошнія лісты з фронту 20-гадовага паэта і журналіста Аляксея Вялічкі.

Стар. 5

Далёкае і блізкае

Новы раман А. Дзятлава «Над бездань» — пра пакутлівы і гераічны ваенны час.

Стар. 6

«Чырвоны гваздзік» — гэта пазіцыя

У вакальным ансамблі універсітэта — толькі выкладчыкі і толькі мужчыны.

Стар. 10

Лангбард быў бы задаволены?

Нечаканая прапанова аб увекавечанні імя Максіма Багдановіча.

Стар. 11

Леся Беларуска

Пэўнасці няма: міф ці рэальнасць?

Стар. 14

ПАЧАЛАСЯ ПАДПІСКА НА II ПАЎГОДДЗЕ 2008 г.

Для індывідуальных падпісчыкаў: 1 месяц — 6720 руб. Падпісны індэкс — 63856

Ведамасная падпіска: 1 месяц — 8710 руб. Падпісны індэкс — 638562

Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў: другое паўгоддзе, на 1 месяц — 4500 руб. Падпісны індэкс — 63815

Льготная падпіска: 1 месяц — 6820 руб. Падпісны індэкс — 63880

Каб год для вас быў неблагім — падпішыцеся на «ЛіМ»!

Са святам Перамогі!



САЛДАТЫ ПЕРАМОГІ

Шмат год ішлі яны
Праз бітвы і трывогі
Ў апошні дзень вайны
І ў першы — Перамогі.

Аб ім былі іх сны,
І ўсе вялі дарогі
Ў апошні дзень вайны
І ў першы — Перамогі.

Дурманіў пах сасны,
Хіліўся бэз пад ногі
Ў апошні дзень вайны
І ў першы — Перамогі.

Ды засеў куль двайны
Слаў вораг на аблогі
Ў апошні дзень вайны
І ў першы — Перамогі.

І падалі сыны
З-пад Нёмана і Волгі
Ў апошні дзень вайны
І ў першы — Перамогі.

Алег ЛОЙКА

Фота Кастуся Дробава

Уласнасць мае свае законы

У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі прайшоў рэспубліканскі семінар, дзе былі абмеркаваны пытанні, якія непасрэдна тычыліся работы бібліятэк, шырокага выкарыстання імі сучасных інфармацыйных тэхналогій, выпрацоўкі прапаноў па ўдасканаленні заканадаўства ў сферы аўтарскага права. Гэта дазволіла б цэнтрам культуры, дзейнасць якіх разглядаецца ў якасці неад'емнай часткі паўсядзённага жыцця грамадства, якасна выконваць асветніцкія функцыі.

Дарэчы, семінар так і называўся: "Дзейнасць бібліятэк як суб'ектаў аўтарскага і сумежных правоў". Гэта добра, што ў Беларусі апошнім часам назіраецца цікавасць да ўдасканалення нарматыўна-прававой базы, што рэгулюе скарыстанне інтэлектуальнай уласнасці, да захавання аўтарскага і сумежных правоў ва ўмовах аўтаматызацыі бібліятэк. У семінары прынялі ўдзел прадстаўнікі Камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці. Гутарка ішла аб дзяржаўнай палітыцы ў сферы інтэлектуальнай уласнасці, аб заканадаўстве краіны ў галіне аўтарскага права і сумежных правоў, аб калектыўным кіраванні маёмаснымі правамі ў Рэспубліцы Беларусь і магчымых напрамках удасканалення заканадаўства ў гэтай галіне. У абмеркаванні гэтых і іншых пытанняў прынялі ўдзел: генеральны дырэктар Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці Леанід Варанецкі, начальнік аддзела аўтарскіх і сумежных правоў НЦІУ Сяргей Шэбска, а таксама супрацоўнік гэтага ж цэнтра Андрэй Лучанок, начальнік Цэнтра па калектыўным кіраванні маёмаснымі правамі Аляксей Бічурын ды іншыя.

Валянцін БАРЫСЕВІЧ

У імя жыцця

Нядаўна пісьменніку і гісторыку Леаніду Маракову споўнілася 50 гадоў. Юбілей ён адзначыў прэзентацыяй новай кнігі "Сшытак забітага кантрабандыста", а таксама сайта (www.marakou.by), дзе сабрана каля 20 тысяч біяграфій ураджэнцаў Беларусі, якія сталі ахвярамі сталінскіх рэпрэсій.

Кніга "Сшытак забітага кантрабандыста" выйшла ў выдавецтве "Мастацкая літаратура". Яна заснавана на дакументальных крыніцах і змяшчае 30 дэтэктыўна-містычных апавяданняў.

Падчас імпрэзы юбіляр атрымаў ганаровую ўзнагароду — ад сяброў гістарычнага клуба "Спадчына". Гучалі пажаданні, падзякі Л. Маракову за вельмі працаёмкія і неабходныя даследаванні. Яго сайт дапамагае многім знайсці звесткі пра рэпрэсаваных сваякоў.

Л. Маракоў — стваральнік унікальных энцыклапедычных даведнікаў "Рэпрэсаваныя літаратары, навукоўцы, работнікі асветы, грамадскія і культурныя дзеячы Беларусі", "Рэпрэсаваныя праваслаўныя свяшчэнна- і царкоўнаслужыцелі Беларусі. 1917—1967", манаграфіі пра свайго дзядзьку, вядомага беларускага паэта і перакладчыка Валерыя Маракова, расстралянага ў крывавым 1937-м. Акрамя таго, Л. Маракоў вядомы і як аўтар кніг прозы "Непамяркоўныя", "100 мініяцюр", "Трое" ды інш.

Працавіты пісьменнік не збіраецца падводзіць вынікі і спыняцца на дасягнутым. Ён працягвае працу над дзесяцітомным даведнікам, а таксама ў праектах — новы зборнік апавяданняў і нават сцэнарый дэтэктыўна-прыгодніцкага поўнаметражнага фільма.

Саша ДОРСКАЯ

СМІ: захаванне самабытнасці краіны

Адной з цэнтральных падзей сёлетняй XII Міжнароднай спецыялізаванай выстаўкі "СМІ ў Беларусі" быў III Беларускі інфармацыйны форум "СМІ ў эпоху глабалізацыі: актуальныя аспекты". Яго арганізатарамі выступілі Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Пастаянны камітэт Саюзнай дзяржавы пры падтрымцы Выканаўчага камітэта Садружнасці Незалежных Дзяржаў, Міжнароднага "Еўразійскага руху" і Еўразійскай акадэміі тэлебачання і радыё.

У гэтым буйным мерапрыемстве, якое праходзіла ў канферэнц-зале Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, бралі ўдзел каля 350 чалавек: прадстаўнікі дзяржаўных і мас-медыйных структур, супрацоўнікі рэспубліканскіх, абласных і раённых перыядычных выданняў, вядучыя палітолагі і грамадскія дзеячы Беларусі, Расіі і краін СНД.

Уступным словам форум адкрыла першы намеснік міністра інфармацыі Беларусі Лілія Ананіч. Яна ў прыватнасці адзначыла: *"У гэтыя дні ў нашай краіне праходзяць маштабныя інфармацыйныя падзеі, якія прыцягнулі ўвагу сусветных сродкаў масавай інфармацыі. Сваё прывітанне ўдзельнікам і гасцям XII Міжнароднай спецыялізаванай выстаўкі "СМІ ў Беларусі" і III Беларускага інфармацыйнага форуму накіраваў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, якое было агучана на адкрыцці выстаўкі"*.

Работа форуму складалася з тэматычных сесій. Першая мела назву "Глабалізацыя: пагроза дэсуверэнізацыі і шматпалярная альтэрнатыва", якую адкрыла выступленне Льва Крыштаповіча, намесніка дырэктара НДІ тэорыі і практыкі дзяржаўнага кіравання Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Доктар філасофскіх навук, прафесар Л. Крыштаповіч падкрэсліў, што наяўнасць шырокага доступу да аб'ектыўнай інфармацыі з'яўляецца важнай умовай фарміравання палітычнай культуры насельніцтва, таму што аб'ектыўная і праўдзівая інфармацыя дазваляе адэкватна рэагаваць на маючыя месца палітычныя працэсы і садзейнічаюць сапраўднаму разуменню перспектыў грамадскага развіцця. Таму сацыяльная адказнасць СМІ пачынаецца з сумлення кожнага журналіста і павінна базіравацца на прынятых грамадствам нормах і стандартах сумленнасці. А маральныя праблемы неабходна ўключыць у вучэбныя праграмы, якія датычаць падрыхтоўкі журналістаў.

Таксама выступалі супрацоўнік Інстытута прынцыпаў Атацюрка і гісторыі Турэцкай рэвалюцыі пры Стамбульскім універсітэце Мехмет Перынчэк, намеснік загадчыка кафедры ідэалогіі і палітычных навук Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Уладзіслава Сямёнава, прафесар Расійскага дзяржаўнага гуманітарнага універсітэта Людміла Адзілава ды іншыя. Выступоўцы аналізавалі шырокае кола пытанняў — сучасная геапалітычная сітуацыя ў свеце, насаджэнне аднапалярнага светаўладкавання як галоўная пагроза незалежнасці і суверэнітэту дзяржаў, амерыканскае бачанне свету і еўразійская шматпалярнасць як альтэрнатыва ў рамках глабальных інтэграцыйных працэсаў...

На тэматычнай сесіі "СМІ ў эпоху глабалізацыі: уплыў грамадства або ўплыў на грамадства" гаворка вялася пра ролю сродкаў масавай інфармацыі ў фарміраванні грамадскай думкі, ролю грамадства ў фарміраванні інфармацыйнай палітыкі, пра сучасныя цэнтральныя і рэгіянальныя электронныя і друкаваныя СМІ, пра распрацоўку агульнай інфармацыйнай стратэгіі краін постсавецкай прасторы... Тут выказваліся вядомы тэлежурналіст Міхаіл Таратута, шэф-рэдактар часопіса "Журналіст" Мікалай Міхайлаў, прафесар кафедры гісторыі журналістыкі і літаратуры факультэта журналістыкі БДУ Алег Слука, палітычны аглядальнік часопіса "Беларуская думка" Віктар Гаўрыш, прафесар БДТУ Уладзімір Казлякоў...

Вельмі актуальныя пытанні былі ўзняты ў другой палове дня работы трэцяга Беларускага інфармацыйнага форуму: "Духоўныя каштоўнасці і выклікі аднапалярнай глабалізацыі", "Сеткавыя выклікі і інфармацыйнае грамадства", "Эканоміка як фактар глабалізацыі. Эканамічны суверэнітэт дзяржавы ва ўмовах глабальнай канкурэнцыі". Гэтыя тэмы тлумачацца сацыяльнымі, псіхалагічнымі і іншымі ўмовамі апошняга дзесяцігоддзя, што, дарэчы, асабліва выразна адлюстроўваецца сёння на экранах тэлевізараў, дзе масавая культура ўжо дасягнула эфекта "псіхічнай рэлаксацыі", гэта азначае поўнага расслаблення, калі ў эфіры ды і ў друкаваных сродках масавай інфармацыі эстэтызуецца вульгарнае, пачварнае, брутальнае, фізіялагічнае.

Як падкрэсліў у час форуму Генрых Юшкявічус, віцэ-прэзідэнт Еўразійскай Акадэміі тэлебачання і радыё, саветнік ЮНЕСКА, акадэмік Расійскай Акадэміі інфарматызацыі, член Брытанскага каралеўскага тэлевізійнага грамадства, сапраўдны член Таварыства інжынераў кіно і тэлэбачання: "Большая частка тэлевізійных праграм не мае нічога агульнага з культурай народаў Расіі, з яе традыцыямі і сапраўднай шкалой чалавечых каштоўнасцей".

Не засталіся па-за ўвагай удзельнікаў форуму і іншыя надзённыя тэмы: "Глабалізацыя: сучасная геапалітычная сітуацыя ў свеце. Роля СМІ і грамадзянскіх інстытутаў у стварэнні шматпалярнасці", "Новая роля дзяржавы ў новай глабальнай эканоміцы ведаў", "Літаратурная творчасць як феномен ненарматыўнага сацыяльнага рэгулявання", "Праблемы талерантнасці ў асвятленні міжнацыянальных адносін", "Сеткавыя выклікі і інфармацыйнае грамадства", з глыбокім аналізам якіх выступілі: дырэктар Цэнтра геапалітычных экспертыз, лідэр Міжнароднага "Еўразійскага руху", доктар палітычных навук Аляксандр Дугін, дэкан эканамічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта Міхаіл Кавалёў, сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі, доктар юрыдычных навук, прафесар Сяргей Трахімёнак, сакратар Саюза журналістаў Масквы, рэдактар аддзела "Прафесія" часопіса "Журналист" Валерый Яўсееў, намеснік дырэктара ЗАТ "Тэхніка і камунікацыі", выканаўчы дырэктар "Інфармацыйнага таварыства" Сяргей Енін.

З тэмай "Саюзная дзяржава і сучасная геапалітычная сітуацыя" на форуме выступіў Дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Павел Барадзін. Ён спыніўся на важнейшых напрамках інтэграцыйнага развіцця Саюзнай дзяржавы ў галіне эканомікі, сельскай гаспадаркі, ваеннага супрацоўніцтва, распавёў аб праекце стварэння магутнага транспартнага калідора з Заходняй Еўропы праз Беларусь і Расію ў Паўднёва-Усходнюю Азію, які дазволіць у 2—3 разы скараціць дастаўку грузаў з паўднёвых рэгіёнаў у Еўропу, значна палепшыць жыццё чатыром мільярдам людзей. "Менавіта цесныя партнёрскія адносіны Расіі і Беларусі, — падкрэсліў Павел Барадзін, — могуць стаць "лакаматывам" (накшталт Францыі і Германіі ў рамках Еўрапейскага Саюза) інтэграцыйнай палітыкі ў рамках СНД".

Дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Павел Барадзін уручыў лісты Падзякі генеральнаму дырэктару БЕЛТА Дзмітрыю Жуку, дырэктару Нацыянальнага прэс-цэнтра Рэспублікі Беларусь Івану Сакалоўскаму, дырэктару РУП "Міжнародны цэнтр інтэграцыйнай інфармацыі. Грамадскі прэс-цэнтр Дома прэсы" Таццяне Бяловай.

На другі дзень форуму яго ўдзельнікі сустракаліся з кіраўніцтвам Мінскага гарвыканкама, наведвалі факультэт журналістыкі БДУ, бралі ўдзел у разнастайных мерапрыемствах выстаўкі "СМІ ў Беларусі". Адбыўся таксама рынг-дыспут пра ролю рускай мовы ў беларускай літаратуры, пра супрацоўніцтва творцаў, які вёў дырэктар РВУ "Літаратура і Мастацтва" Алесь Карлюкевіч. У дыспуце прынялі ўдзел пісьменнікі Навум Гальпяровіч, Сяргей Трахімёнак, Алесь Кажадуб і Андрэй Скарынкін.

Валянцін БАРЫСЕВІЧ, Віктар КАВАЛЁЎ

На здымках: падчас шматлікіх мерапрыемстваў III Беларускага інфармацыйнага форуму "СМІ ў эпоху глабалізацыі: актуальныя аспекты".

Фота Кастуся Дробава і Віктара Кавалёва

Віншуем!

Нечаканы чалавек

Генадзю Бубнаву — 60

Усё было нечаканым. Спярша ён, чатырнаццацігадовы хлопчык, моцна здзівіў чытацкія колы Мсціслаўшчыны і асабліва аднавяскоўцаў, аднакласнікаў і настаўнікаў, калі надрукаваў падборку вершаў у раённай газеце. Падчас вучобы ў Маскоўскім універсітэце імя Ламаносава ўразіў студэнтаў і выкладчыкаў, калі надрукаваў вершы ў часопісе «Новый мир». (Неўзабаве прыхільнікі паэзіі пазнаёміліся з паэтычнымі кнігамі Генадзя Бубнава "Связующая нить", "Ржаной полдень", "Вещий камень").

У 1989 годзе артыкулам "Левый и правый, или Время умирать и время жить" на старонках "Нёмана", а пазней "Всемирной литературы" пачала друкавацца нечаканая эсэістыка Г. Бубнава — арыгінальныя даследаванні паняційна-лагічных сувязяў, на якіх грунтуецца эвалюцыя прыроды і чалавека. "Египетский меридиан", "Пламенная плоть", "Дьявольская беременность", "Homo sapiens: перезагрузка» — далёка не поўны спіс яго твораў.

І ўсё ж не адно асабістая творчасць была ягоным клопатам. 28 год аддаў Генадзь Фёдаравіч Бубнаў часопісу "Нёман", з іх — 19 гадоў на адказнай пасадзе намесніка галоўнага рэдактара. У 2003 годзе ён узначаліў часопіс "Всемирная литература", які хутка, дзякуючы яго шырокай эрудыцыі, высокаму літаратурнаму густу, уменню арганізаваць калектыў супрацоўнікаў, стаў аўтарытэтным выданнем Беларусі. Але ж праз пяць гадоў Генадзь Бубнаў зноў жа нечакана рашыў пакінуць адказную і пачэсную пасаду і, як кажуць у пісьменніцкім асяродку, пайшоў на творчую працу.

Віншуем Генадзя Фёдаравіча з годным юбілеем, зычым яму моцнага здароўя і новых творчых здзяйсненняў.

Супрацоўнікі рэдакцыйна-выдавецкай установы "Літаратура і Мастацтва"

Салон запрашае пісьменніка

Чарговым госцем літаратурна-музычнага салона "Ліра", што працуе пры Слуцкай гарадской дзіцячай бібліятэцы, быў дзіцячы пісьменнік Валерый Квілорыя. З-пад яго пяра выйшлі кнігі для сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту "13-ты карась, або Неверагодныя прыгоды васьмікласнікаў Шуркі і Леркі ў сямі гісторыях" і "У пагоні за Шалёнай Каракаццай". Кнігі выпушчаны пад эгідай дзіцячай рэспубліканскай газеты "Зорка". На старонках кніг ёсць усё: і загадкавыя здані, і пошукі скарбаў, і вераломныя піраты. На думку вучняў з Лучнікоўскай сярэдняй школы, школ № 4, 7, 9, 10 горада Слуцка, што прыйшлі на прэзентацыю, кнігі Валерыя Квілорыя — вясёлыя і займальныя, а па меркаванні настаўнікаў і бібліятэкараў — душэўныя ды пазнавальныя.

Галіна ШАХНОВІЧ, загадчык Слуцкай гарадской дзіцячай бібліятэкі

У краіне Янкі Маўра

У рамках тыдня беларускай мовы і літаратуры для вучняў 7-х класаў СШ № 2 г. Мар'іна Горка адбылася вечарына "Цэлы свет — дзецям", прысвечаная 125-годдзю з дня нараджэння вядомага дзіцячага пісьменніка Янкі Маўра.

Да свята была падрыхтавана кніжная выстава "Чалавек з крылатай фантазіяй", а таксама праведзены конкурс на лепшы малюнак паводле твораў Янкі Маўра.

Пра жыццё і творчую дзейнасць Янкі Маўра расказала галоўны бібліятэкар аддзела абслугоўвання і інфармацыі Пухавіцкай ЦБ Валянціна Сухава. Асаблівую ўвагу яна звярнула на кнігу нашага земляка, ураджэнца Пухавіцкага раёна пісьменніка Пятра Рунца "Чалавек з крылатай фантазіяй", у якой змешчаны цікавыя эпізоды з жыцця і творчасці Янкі Маўра. Мы бачым пісьменніка як чалавека мудрага і даследчага, уважлівага і чулага да людзей.

Як Іван Міхайлавіч Фёдараў узяў сабе такі псеўданім? Чаму вядомая шылераўская фраза "Маўр зрабіў сваю справу, маўр можа ісці" яго зацікавіла? Пра гэта прысутным паведамілі Валерыя Арышчанка і Ульяна Ярмолік.

Цяжка было выбраць настаўніцы беларускай мовы і літаратуры Ганне Скавыш пераможцу віктарыны паводле творчасці пісьменніка, бо дзеці вельмі добра ведаюць такія творы Янкі Маўра, як "Палескія рабінзоны", "ТВТ", "У краіне райскай птушкі" і інш.

Вельмі прыемна, што і сёння маладое пакаленне зачытваецца яго цудоўнымі творамі, дзе сур'ёзнае, неверагоднае перамяжоўваецца з жартоўным і смешным.

Таццяна АЛЕКСАНДРОВІЧ, загадчыца аддзела абслугоўвання і інфармацыі Пухавіцкай ЦБ

Упершыню па выніках III міжнароднага літаратурнага конкурсу "Руская прэмія" ў лік лепшых рускамоўных пісьменнікаў 2007 года трапілі беларусы — Дзмітрый Строцаў і Алена Казанцава.

«Руская прэмія» — беларусам

Мэта конкурсу, заснаванага ў 2005 годзе некамерцыйнай арганізацыяй "Інстытут еўразійскіх даследаванняў", — "спрыяць захаванню і папулярызацыі рускай мовы як унікальнай з'явы культуры постсавецкай прасторы, садзейнічаць развіццю міжнароднага гуманітарнага супрацоўніцтва". Да ўдзелу ў літаратурным спаборніцтве запрашаюцца пісьменнікі былога СССР (акрамя Расіі), якія пішуць на рускай мове.

У 2007 годзе на конкурс было даслана 375 твораў з 13 дзяржаў СНД і Прыбалтыкі. Сярод значнай колькасці прэтэндэнтаў беларускі паэт Дзмітрый Строцаў здолеў стаць адным з лепшых, заняўшы трэцяе месца ў намінацыі "Паэзія". Дзмітрый займаецца не толькі творчай дзейнасцю, але і з'яўляецца кіраўніком выдавецкага праекта "Новые Мехи". Сярод літаратурных набыткаў аўтара — кнігі "38", "Лишние сутки", "Остров Це", "Виноград". Пра тое, якія пачуцці выклікала перамога, Строцаў кажа: "Я не расцэньваю сваё "месца" як выйгрыш у нейкім адзінаборстве. У першую чаргу, гэта — падзея для беларускай культуры і літаратуры. Тое, што ў фінал трапілі два беларусы, значыць, што наша літаратура звярнула на сябе ўвагу". Цяпер паэт рыхтуе зборнік вершаў "Лоскутная ода", куды ўвойдуць і творы, прадстаўленыя на літаратурным конкурсе. Акрамя таго, Строцаў займаецца распрацоўкай тэмы "Мінская школа рускамоўнай паэзіі 70-х гадоў XX стагоддзя".

У ліку выданняў паэтычнай серыі "Минская школа" выйшлі кнігі Алены Кошкінай, Алены Казанцавай, калектыўны зборнік маладых аўтараў "Знаки препинания". Рыхтуюцца да выхаду кніга Міхаіла Ганчарова. "Я лічу, што беларускамоўная літаратура павінна законна даміняваць у Беларусі, — выказвае свой пункт гледжання Дзмітрый Строцаў. — Нягледзячы на тое, што склалася сітуацыя, у якой большасць насельніцтва даволі даўно размаўляе на рускай мове, беларуская мова адраджаецца, і паспяхова. Пра гэта сведчыць добрая дынаміка маладой беларускамоўнай літаратуры. Аднак, нельга змяншаць і ролю рускамоўнай творчасці ў Беларусі".

Ганна КОТ

Адукацыя праз усё жыццё

Цяжка аспрэчваць, што ў сучасным грамадстве пастаяннае павышэнне ўзроўню сваіх ведаў, пашырэнне кругагляду, працы над сабой — абавязковая ўмова поспеху. Асабліва высокія патрабаванні прад'яўляюцца сёння да прафесіяналізму і ведаў кіраўніка. Ад спалучэння вопыту і валодання сучаснай інфармацыяй, здольнасці ствараць пазітыўны мікраклімат у калектыве, умення пераконваць, самому вучыцца і вучыць іншых залежыць поспех дзейнасці ўсяго калектыву.

Сёння ўзрастае патрэба ў кіраўніках новага тыпу для бібліятэк усіх формаў прыватнасці: яны павінны ўмець кіраваць не толькі аб'ектамі, але і працэсамі, фарміраваць рынак бібліятэчных паслуг, бібліятэчных рэсурсаў, укараняць навейшыя інфармацыйныя тэхналогіі.

Таму у красавіку гэтага года ў бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў прайшла 3-я Міжнародная школа дырэктараў гарадскіх і раённых сетак публічных бібліятэк Беларусі "Мастацтва выніковага кіравання сучаснай бібліятэкай". Сярод пытанняў, якія разглядаліся на занятках Школы: сучасная бібліятэка і новыя інфармацыйныя тэхналогіі, кіраванне персаналам, бар'еры і механізмы ўкаранення інавацый, праектная дзейнасць бібліятэк. Мэта Школы дырэктараў — павышэнне прафесійнага ўзроўню кіруючых кадраў бібліятэк рэспублікі, навучанне сучасным тэхналогіям кіравання, развіццё прафесійных міжнародных камунікацый. Школа дырэктараў існуе ўжо тры гады і мае станоўчыя водгукі. Сёлета да мерапрыемства далучыліся прафесар кафедры бібліятэчнага і музейнага менеджменту факультэта бібліятэчна-інфармацыйных дысцыплін Вышэйшай школы тэхнікі, эканомікі і культуры г. Лейпцыга доктар Маркус Вальц і дацэнт, галоўны рэдактар бібліятэчна-бібліяграфічнай класіфікацыі, прафесар кафедры бібліятэказнаўства Акадэміі перападрыхтоўкі кіруючых кадраў культуры, мастацтва і турызму, заслужаны дзеяч культуры Расіі Эдуард Сукіасян. Акрамя актыўнай работы па праграме заняткаў, ім была прачытана адкрытая лекцыя на тэму "Сучаснае ў сферы каталагізацыі і класіфікацыі: праз два гады" для студэнтаў універсітэта і праведзены адкрыты семінар "Сучасная бібліятэка і новыя інфармацыйныя тэхналогіі" для спецыялістаў бібліятэк горада Мінска.

Мерапрыемствы праходзілі ў выглядзе майстар-класаў, семінараў, практыкумаў, творчых семінараў-майстэрняў, лекцый-прэзентацый.

Закрыццё Школы дырэктараў закончылася "круглым сталом". Удзельнікі выказалі словы шчырай удзячнасці і задавальнення ад мерапрыемства, выказалі пажаданні і надалей сустракацца ў сценах бібліятэкі універсітэта культуры і мастацтваў, унеслі прапановы ў праграму наступнай, 4-й Школы дырэктараў.

Таісія ГУРКО, вядучы метадыст бібліятэкі БДУКМ

«Ён першы сеяў зярняты...»

Пад такой назвай прайшла ў Магілёўскім абласным Палацы культуры вобласці літаратурна-драматычная вечарына па творчасці Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, прымеркаваная да 200-годдзя з дня яго нараджэння.

У зале ціха гучала беларуская народная музыка. На кніжнай выставе "Больш за ўсё я бацькоўскаму краю адданы..." былі прадстаўлены творы беларускага дудара розных гадоў выдання, літаратура пра яго жыццёвы шлях і творчасць.

Вядучы вечарыны Алег Дзечукоў і Ірына Цінякова ўвагу прысутных засяродзілі на тым, што дзяцінства першага сейбіта зярнят беларускай літаратуры шчыльна звязана з Магілёвам. Кандыдат гістарычных навук, дацэнт дзяржаўнага універсітэта харчавання Ігар Пушкін распавёў пра гэты перыяд жыцця класіка. Ён эмацыянальна дэкламаваў урывак з паэтычнай аповесці "Гапон" Дуніна-Марцінкевіча, у якім ёсць яркія эпізоды з гісторыі Магілёва.

Навучэнцы Магілёўскай дзіцячай школы мастацтва № 2 імя Міхаіла Салдатава парадавалі прысутных срэбным звонам цымбалаў — выканалі некалькі беларускіх народных песень.

Удзельніца народнага тэатра Палаца культуры вобласці Дар'я Дзмітрук прачытала маналог з оперы "Ідылія".

З прэм'ерай песні "Партрэт Стэфы" на словы Дуніна-Марцінкевіча і музыку сучаснага беларускага кампазітара Эдуарда Зарыцкага выступіла студэнтка Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А. А. Куляшова Яўгенія Крэтава.

Віктар АРЦЕМ'ЕЎ

Скрыжаванні яго лёсу

Напярэдадні 63-й гадавіны Перамогі, а менавіта 22 красавіка бягучага года, вядомы беларускі пісьменнік, аўтар раманаў "Дубовая града" (1965), "Віхры на скрыжаваннях" (1970), "Пасля смерчу" (1975), "Мутныя росы" (1999) ды шматлікіх апавяданняў Уладзімір Канстанцінавіч Федасеенка адзначыў 82 гады з дня нараджэння. Кавалер ордэнаў Чырвонай Зоркі, Вялікай Айчыннай вайны I ступені, а таксама ўзнагароджаны за ваенныя і грамадзянскія заслугі медалямі "Партызану Вялікай Айчыннай вайны I і II ступені", Францыска Скарыны, шматлікімі граматамі, ён, Ганаровы грамадзянін горада Жлобіна, і цяпер імкнецца быць карысным для народа і краіны.

Вясною сорак першага года, напярэдадні вайны, Уладзіміру Федасеенку споўнілася ўсяго пятнаццаць гадоў. Нарадзіўся ён у працавітай, вялікай сялянскай сям'і Канстанціна і Юліі Федасеенкаў у вёсцы Мормаль Жлобінскага раёна і быў як пестуном лёсу, так і яго пасынкам. Пестуном — паколькі прырода шчодра надзяліла яго талентам, абаяльнасцю, пачуццём прыгожага. І дзякуючы таму, што застаўся жывы і тады, калі побач з ім, разведчыкам, рваліся бомбы, снарады, не раз глядзеў "смерці ў вочы". І таму, што гэтак ярка, таленавіта і праўдзіва адлюстраваў падзеі ваеннага ліхалецця ў раманах "Дубовая града" і "Віхры на скрыжаваннях", якія сталіся для многіх чытачоў любімымі кнігамі.

Пасынкам жа лёсу ён стаў не па сваёй волі. Напоўніцу адпіць з чашы — непаразумення, зайздрасці, паклёпу — спаўна давялося Уладзіміру Федасеенку пасля вайны. А ўсё таму, што ён, жадаючы ўвасобіць на паперы (у апавяданні, рамане) сапраўднасць паказу тых падзей, сведкамі і ўдзельнікамі якіх былі многія, — не ішоў на кампраміс з уласным сумленнем, а пісаў аб тым, што перажыў сам. І, нягледзячы на нядобразычлівыя выпады некаторых літаратараў, накшталт, "ізноў вы, Уладзімір Канстанцінавіч, пішаце не гэтак як усе", былы разведчык, удзельнік вайны, інвалід вайны другой групы не пагаджаўся з апанентамі. Пісаў творы аб далёкіх падзеях Вялікай Айчыннай вайны — як падказваюць яму сэрца і сумленне.

Уладзімір Федасеенка, аўтар многіх апавяданняў і раманаў зноў і зноў звяртаецца да драматычна напружаных, трагічных абставін вайны, адлюстроўвае складаныя вобразы і характары герояў таго часу, паказвае іх мужнасць пры выкананні свайго абавязку. Дарэчы, аб людзях, якія аднаўляюць разбураную вайной гаспадарку, радасці мірнага жыцця, каханні апавядаецца ў трэцім рамане пісьменніка "Пасля смерчу". Майстэрства аўтара твораў аб вайне высока ацанілі пісьменнікі Іван Мележ, Іван Шамякін, Піліп Пестрак, Іван Навуменка ды іншыя.

Пісьменнік, ветэран вайны Уладзімір Федасеенка, безумоўна, майстар слова. Ён напісаў нямала старонак высокай прозы.

"Як хутка бяжыць час, — кажа пісьменнік Уладзімір Федасеенка, — Неўпрыкмет прайшлі шэсцьдзесят тры гады. Зелянее некалі апаленая порахам зямля. Стаяць помнікі салдатам-вызваліцелям і мемарыялы ў гонар іх подзвігу. Але да гэтага часу не ўсіх мы ведаем, хто загінуў на гэтай зямлі, не ўсім пастаўлены помнікі, не ўсе абазначаны магілы".

За час вайны будучаму беларускаму пісьменніку давялося прайсці з баямі не адну сотню кіламетраў дарог, узрытых бомбамі і снарадамі. Быў цяжкапаранены. Трапіў у эвакашпіталь ля Гомеля. Калі папраўіўся, то вярнуўся дадому.

Пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў Уладзімір Федасеенка рашыў здзейсніць задуму дзяцінства. Як і многія яго аднагодкі, марыў стаць мараком. Менавіта з гэтай мэтай і паступіў на суднамеханічнае аддзяленне Гомельскага рачнога тэхнікума, курс навучання ў якім паспяхова закончыў у 1946 годзе. Аднак да мора было далёка, таму ўладкаваўся і пачаў працаваць у Гомельскім абкаме камсамола. Потым былі вучоба ў Мінскім юрыдычным інстытуце, Вышэйшай партыйнай школе, праца ў ЦК КПБ (выконваў абавязкі загадчыка сектара друку), рэдакцыях маладзёжных і рэспубліканскіх газет.

Вось гэтак паступова, крок за крокам, Уладзімір Федасеенка з былога разведчыка знішчальнага батальёна і студэнта дарос да пісьменніка, дзе раскрыліся не толькі яго цвёрдая грамадзянская пазіцыя, але і талент. Першае апавяданне было надрукавана на старонках газеты "Звязда" ў далёкім 1951 годзе. З таго часу Уладзімір Канстанцінавіч напісаў нямала твораў, у якіх распавядаецца аб характары беларуса, адарванага ад мірнай стваральнай працы, яго гераізме ў гады Вялікай Айчыннай вайны і ўпэўненасці ў перамозе ў цяжкай бітве з нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Больш пяцідзесяці гадоў пісьменнік прысвяціў творчай працы. У яго раманах: "Дубовая града", "Віхры на скрыжаваннях", "Пасля смерчу", "Мутныя росы" адлюстравана ў мастацкіх вобразах складаная гісторыя народа, на долю якога выпала нямала выпрабаванняў.

У адной з кватэр у Мінску жывуць васьмідзесяцідвухгадовы ветэран, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, пісьменнік Уладзімір Канстанцінавіч Федасеенка з жонкай Лізаветай Аркадзьеўнай. Тут жа ў сталіцы рэспублікі загадчыкам аператыўнай хірургіі ў Другім радзільным доме працуе сын ветэрана вайны Аляксандр Федасеенка, а педагогам у адной са школ для даравітых мастакоў выкладае яго дачка Тамара. Якая ж прафесія ў сям'і Федасеенкаў самая важная — пісьменніка, педагога ці хірурга? Пытанне, бяспрэчна ж, рытарычнае, паколькі галоўнае, каб прафесія акрыляла чалавека, як нялёгкая пісьменніцкая праца акрыліла ў далёкім 1951 годзе на напісанне высокамастацкіх твораў удзельніка вайны Уладзіміра Федасеенку, на шляху да Вялікай Перамогі ў якога было нямала небяспечных скрыжаванняў.

Валянцін БАРЫСЕВІЧ

Фота Кастуся Дробава

Пачалася падпіска на II паўгоддзе

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Індывідуальная (індэкс — 63856)
на 1 месяц — 6720
на 3 месяцы — 20160
Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў (індэкс — 63815)
на 1 месяц — 4500
на 6 месяцаў — 27000
Ведамасная (індэкс — 638562)
на 1 месяц — 8710
на 3 месяцы 26130
Льготная ведамасная (індэкс — 63880)
на 1 месяц — 6820
на 6 месяцаў — 40920

«МАЛАДОСЦЬ»

Індывідуальная (індэкс — 74957)
на 1 месяц — 6720
на 3 месяцы — 20160
Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў (індэкс — 00592)
на 1 месяц — 4800
на 6 месяцаў — 28200
Ведамасная (індэкс — 749572)
на 1 месяц — 9030
на 3 месяцы 27090
Льготная ведамасная (індэкс — 00731)
на 1 месяц — 7240
на 6 месяцаў — 43440

«ПОЛЫМЯ»

Індывідуальная (індэкс — 74985)
на 1 месяц — 6930
на 3 месяцы — 20790
Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў (індэкс — 00471)
на 1 месяц — 4800
на 6 месяцаў — 28200
Ведамасная (індэкс — 749852)
на 1 месяц — 9240
на 3 месяцы 27270
Льготная ведамасная (індэкс — 00727)
на 1 месяц — 7560
на 6 месяцаў — 45360

«ВСЕМИРНАЯ ЛИТЕРАТУРА»

Індывідуальная (індэкс — 74863)
на 2 месяцы — 8290
Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў (індэкс — 00594)
на 2 месяцы — 5800
на 6 месяцаў — 17400
Ведамасная (індэкс — 748632)
на 2 месяцы — 10230
Льготная ведамасная (індэкс — 00729)
на 2 месяцы — 7660
на 6 месяцаў — 22980

«НЁМАН»

Індывідуальная (індэкс — 74968)
на 1 месяц — 7350
на 3 месяцы — 22050
Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў (індэкс — 00235)
на 1 месяц — 5200
на 6 месяцаў — 31200
Ведамасная (індэкс — 749682)
на 1 месяц — 10240
на 3 месяцы 30720
Льготная ведамасная (індэкс — 00728)
на 1 месяц — 7560
на 6 месяцаў — 45360

Сёння вельмі прэстыжна ведаць не толькі творчасць класікаў, але і сучасных беларускіх пісьменнікаў, адкрываць для сябе новыя імёны з плеяды маладых аўтараў.

Водар спелай антонаўкі

У кніжцы "Война безжалостной была", што пабачыла свет у Магілёўскай абласной друкарні імя С. Собаля, змешчана 12 работ пераможцаў абласнога конкурсу сачыненняў "Гісторыя маёй сям'і ў кантэксце Вялікай Айчыннай вайны". Сярод лепшых работ канкурсантаў — сачыненне навучэнкі Краснапольскай раённай дзяржаўнай гімназіі імя М. М. Антонава Каці Цыганковай "Памяць пра дзядулю захоўвае антонаўка". З гэтай нагоды падумалася: на радзіме слыннага паэта Аляксея Пысіна, салаўіным, глыбінным раёне, знявечаным чарнобыльскай катастрофай, вырастаюць, набіраюцца жыватворнай сілы юныя творцы.

Каця вельмі пранікнёна распавядае пра тое, што ў іх на агародзе ёсць старая яблыня, антонаўка. Водар спелага яблыка восенню не дае ёй спакою. Яе бабуля, калі пачула, што сыны сабраліся спілаваць старое дрэва, моцна плакала.

"...Я параўнала бабуліны слёзы з грыбным дажджом, які таксама ціхі і шчодры. Сэрца маё сціснулася ад болю неразумення. Пацалаваўшы бабулю, я прысела да яе, не рашаючыся парушыць цішыню. У руках бабуля штосьці трымала, прыціскаючы да грудзей. Нечакана для мяне бабуля расціснула далоні і працягнула іх да мяне. На састарэлых далонях ляжаў невялікі даспелы яблык. Узяла яго і скрозь яго паглядзела на сонейка — у яблыку было бачна насенне. Бабуля цяжка ўздыхнуўшы, пачала свой аповед..."

Яна расказала Каці пра тое, што гэтыя яблыкі любіў яе дзядуля, які ў першую восень вайны добраахвотнікам пайшоў на фронт бараніць Бацькаўшчыну. Развітваліся каля гэтай яблыні. Дзядуля з'еў яблык, каб запамятаць яго смак і цяпло дома. А другі, сагрэўшы сваім цяплом, аддаў ёй, як штосьці важнае і дарагое.

"Праз месяц атрымала я ад яго першае франтавое пісьмо. Салдат пісаў пра свой першы бой, і аб тым, як знішчыў першага гітлераўца і як сумуе па дому, сям'і і сваей яблыньцы". Яшчэ некалькі пісьмаў атрымала салдатка. А праз паўтара года прыйшла пахавальная...

Каця ўзрушана зазначае ў сваім сачыненні пра бабулін куфэрачак.

"На Дзень Перамогі даставала бабуля свой куфэрак і ставіла асцярожна на кут пад бажніцу з пажоўклым фотаздымкам майго дзядулі, чарку, кавалачак чорнага хлеба, пахавальную і першае франтавое пісьмо — жоўты трохкутнік.

Яшчэ больш зразумелым мне стаў клопат бабулі пра яблыньку: у летнюю спёку кожны вечар палівала яе цёплай вадой, вясной бяліла яе ствол, акучвала вакол зямлю, узімку ўхутвала яе ад марозу. Часта стаяла бабуля, абняўшы яе ствол, аб чымсьці вяла гамонку з яблынькай.

Яблыня для маёй бабулі — як яе адзіны каханы Іван. Пасля вайны яна больш не выйшла замуж. Гэта з ім яна ціха размаўляла. Яго аберагала, аб ім клапацілася ўсе пасляваенныя гады, заўсёды чакала яго.

Мой дзядуля загінуў у баях пад Курскам, няма ў жывых і маёй любай бабулі, але іх яблыня як сімвал любові і чысціні, сімвал Перамогі расце і цяпер. Хоць не дае больш ураджаю, але яна маёй сям'і вельмі дарагая. І ўвесь клопат пра яе ўзялі на сябе мы — прадаўжальнікі дзядулінага роду".

Фёдар ГАНЧАРОЎ

Апошнія лісты з фронту 20-гадовага паэта і журналіста Аляксея Вялічкі

На зямлі нашай светлай
Добра жыць і любіць,
Аб чацвёртым, чацвёртым
Мы не можам забыць.
Пімен Панчанка

Апошнія лісты з фронту. Іх напісаў у 1942-м годзе свайму бацьку, ураджэнцу вёскі Родня Клімавіцкага павета, старшаму палітруку Яўстафію Вялічку ў рэдакцыю газеты "За гонар Радзімы" яго сын, чырвонаармеец-сувязіст Аляксей Вялічка — былы супрацоўнік даваеннай Касцюковіцкай раённай газеты "Сталінскі прызыў". Гэта былі яго апошнія словы родным.

У няроўным баі смерцю храбрых загінуў мужны воін-беларус. А ягоны бацька, прайшоўшы нялёгкімі дарогамі вайны, вярнуўся дахаты жывы і здаровы, чаго і жадаў яму ў сваіх лістах сын.

Апошнія лісты з фронту. Гэта праўдзівыя дакументы мінулай вайны. А таму так каштоўныя яны цяпер, пранесеныя праз гады ў салдацкіх гімнасцёрках, шчодра палітыя потам і крывёю.

Простыя і шчырыя радкі, напісаныя ад усяго сэрца. Тым, хто не пашкадаваў свайго жыцця дзеля нашага дня сённяшняга. Мы прыводзім іх без усялякай праўкі.

«Я жывы і здаровы...»

* * *

"Добры дзень, тата! Віншую цябе з вялікім святам, днём 1 мая і жадаю самых найлепшых поспехаў табе ў тваім жыцці і рабоце. Сёння я атрымаў паштоўку ад Тані, у якой яна паведаміла мне твой адрас. Раней я атрымаў ад цябе паштоўку ў якой адраса твайго не было, ды і да таго ж яна, г. зн. паштоўка, доўга блукала, пакуль трапіла да мяне. У ёй ты пісаў, што паслаў мне грошы, але я іх не атрымаў, напэўна таму, што там, куды яны былі пасланы, мяне тады не было. Пішы аб сабе, як жывеш, кім працуеш у газеце. На якім участку фронту ты знаходзішся. Можа, ведаеш што-небудзь аб маці. Калі ведаеш Уладзіміраў адрас, то паведамі яго мне. Я жывы і здаровы, знаходжуся ў кавалерыі. Працую сакратаром камсамольскага прэзідыума падраздзялення сувязі. Пакуль усё. Будзь здаровы. Чакаю хуткага адказу.

Мой адрас: палявая пошта, станцыя 447-10, літар "Б". Твой Аляксей Вялічка".

21 красавіка 1942 года.

* * *

"Добры дзень, дарагі тата! Сёння я атрымаў тваё пісьмо, напісанае 11.5.1942 г. Усе пісьмы, якія ты мне пісаў, я атрымаў. Грошы ж яшчэ не атрымаў. Тата, ты пытаешся калі Цярэнцій пакінуў Родню. Пакінуў ён яе 7 ліпеня, так што пра маці нічога не ведае. У той дзень, калі яго бралі ў армію, я якраз быў у Родні. Якава тады яшчэ не бралі. Я заставаўся дома. Да майго ўходу ў армію рэдактарам "Сталінскага прызыву" быў Аляксеенка. Свае два вершы я надрукаваў у беларускім часопісе "Полымя рэвалюцыі". З Касцюковіч амаль што ўсе жыхары эвакуіраваліся. Я многіх сустракаў у дарозе. Я чуў, што яны знаходзяцца амаль усе ў Акцюбінску. Эльперы знаходзяцца ў г. Чкалаве. Майсей быў некаторы час са мной, але потым аказаўся баязліўцам. Герасічкін Яшка, ты, напэўна, яго ведаеш, зараз у шпіталі. Ён быў паранены. Мы разам з ім заканчвалі курсы радыстаў. Я зараз працую па спецыяльнасці. Акрамя таго, яшчэ працую на камсамольскай рабоце.З нецярпеннем чакаю таго моманту, калі буду адрапраўлены на фронт у коннагвардзейскую часць. Іцкоў у той час працаваў заг.складам. Зараз ты, пэўна, мяне б не пазнаў — значна змяніўся. Тані я ўжо даўно напісаў пісьмо, але адказу ўсё яшчэ не атрымаў. Ну, пакуль усё, будзь здаровы. Да хуткай сустрэчы. Чакаю адказу. Твой сын Аляксей Вялічка".

19 мая 1942 года.

* * *

"Добры дзень, дарагі тата! Грошы 200 руб. я атрымаў. Дзякую за іх. Я табе паслаў пісьмо, у якім адказваў падрабязна на ўсе твае пытанні. Ты яго, напэўна, ужо атрымаў. Я жывы і здаровы. Жыву па-старому. На днях сустрэў аднаго хлопца са Шклова. Ён мне нешта расказаў новае. У пісьме напішу табе аб гэтым. Калі яшчэ будзеш высылаць грошы, то шлі хутчэй тэлеграфным пераводам, а то яны так ідуць доўга і мяне могуць не застаць. Жадаю выдатнага здароўя і бадзёрасці. Пакуль. Да пабачэння. Будзь здаровы. Твой сын Аляксей Вялічка".

25 мая 1942 года.

* * *

"Добры дзень, дарагі тата! Учора я паслаў табе паштоўку, у якой прасіў, каб ты паслаў мне грошай. Сёння адбыліся некаторыя змяненні. Адрас мой мяняецца. Так што дасылаць грошы не трэба, а таксама і пісьмы. Чакай новы адрас. Я жывы і здаровы. Усяго добрага. Будзь здаровы. Твой сын Аляксей".

26 мая 1942 года.

А зараз прывядзём яшчэ адзін ліст с фронту. Гэта пісьмо былого сябра Аляксея Вялічкі — Аляксандра Цурыкава да ягонай сястры Таццяны.

* * *

"Добры дзень, Таня! Пісьмо, напісанае Вамі 12.7.42 г., давялося атрымаць мне, г. зн, таварышу Алёшы, бо ён ужо не мог яго атрымаць. І таму я рашыў Вам даць на яго кароткі адказ. Алёша загінуў у адным з баёў яшчэ ў чэрвені месяцы, гэта было 25 чэрвеня. Наш полк трымаў абарону. Алёша даваў сувязь аднаму з эскадронаў. У гэты дзень перастала біцца сэрца гэтага маладога чалавека. З Алёшам я жыў увесь час, як з родным братам, пачынаючы з Касцюковіч і канчаючы паездкай на фронт. Мы з ім былі таксама ў адным узводзе. Пілі, елі з аднае міскі. Шкада было, калі пасля жорсткага бою немец быў адкінуты за раку і на полі бою засталося цела Алёшы. Таня, словам Вам цяпер усё ясна і я ў разважанні вялікія ўнікаць не буду. Хачу толькі аднаго, каб па атрыманні майго пісьма Вы напісалі адказ, атрымалі Вы яго ці не? Каб я быў спакойны. Пакуль усё, больш пісаць няма што. Таму да пабачэння. Аляксандр Цурыкаў. Мой адрас: палявая пошта, станцыя 860, п\я 50, 121 к\полк, радыёўзвод. Цурыкаву Аляксандру Мікалаевічу".

Сястра, першай даведаўшыся аб тым, як загінуў брат, адразу ж бярэцца за пяро і піша свайму бацьку на фронт.

* * *

"Добры дзень, дарагі тата! Сёння я атрымала вестку аб тым, што Алёша загінуў. Я проста не магу нічога табе пісаць, так я засмучана. Адзін брат у мяне і той загінуў, як гэта цяжка, нават не верыцца, што ўсё гэта здарылася. Я яму паслала пісьмо вельмі даўно, але ён яго не атрымаў, таму што яго ўжо не было ў жывых. Ён загінуў 25 чэрвеня і пісьмо атрымаў яго таварыш, які мне і паведаміў, пасылаю табе пісьмо гэтага таварыша Алёшы. Тата! Калі б ведаў, як мне яго шкада, у мяне нават няма яго здымка. Не ведаю, як усё гэта перажыць. Расказваюць, што ў Шклове (**ад аўтара**: *у Шклове пасля звальнення з Чырвонай Арміі і ўдзелу ў вызваленні Заходняй Беларусі, вайне з белафінамі працаваў Я. М. Вялічка да Вялікай Айчыннай вайны загадчыкам арганізацыйнага аддзела райкампартыі, адкуль у першы жа дзень вайны пайшоў на фронт*), былі вельмі моцныя баі, таму што там Днепр. Праклятыя немцы закапалі 600 чалавек жыхароў у зямлю жывымі. Калі ім прыйдзе канец, гэтым звярам. Больш нічога не магу пісаць. Як атрымаеш гэта пісьмо, паведамі. Таня".

Здавалася, што больш лістоў да бацькі ад сына не захавалася. Роўна праз месяц пасля апошняй весткі ад яго, 25 чэрвеня 1942 года, ён загінуў на ўкраінскай зямлі як герой у няроўнай сутычцы з фашыстамі.

Але пакуль мой матэрыял рыхтаваўся да друку ў Касцюковіцкім краязнаўчым музеі па маёй просьбе былі адшуканы яшчэ два малавядомыя лісты Аляксея Вялічкі, адпраўленыя з фронту.

* * *

Добры дзень, тата!

Учора я атрымаў ад цябе паштоўку. А сёння пісьмо. Ты пытаешся, чаму я поўных восем месяцаў нічога не пісаў аб сабе. Спачатку я не ведаў твайго адрасу, г. зн. дзе ты знаходзішся, але ўсё ж я Тані ўвесь час пісаў пісьмы, а ад яе не атрымаў ніводнага. Толькі калі я знаходзіўся ў гор. Сердабоку, я атрымаў ад цябе паштоўку адрасаваную ў г. Слабада. У ёй ты свайго адрасу не паведаміў, а паведаміў адрас Тані. Я ёй пісаў пісьмы, але адказу не атрымаў. І вось толькі зараз ад Тані я даведаўся твой адрас. У гэтым пісьме пастараюся апісаць табе сваё жыццё падрабязна з пачатку Айчыннай вайны і па сённяшні дзень.

У Касцюковічы я прыехаў 22 чэрвеня. У армію быў прызваны там жа 12-га ліпеня. Дні праз тры пасля таго, як я выехаў з дому, мама мне выслала грошай тэлеграфным пераводам. Я ёй пісаў тады некалькі пісьмаў, але адказу не атрымаў. У Касцюковічах я да самага адыходу ў армію жыў у свайго таварыша, аднакласніка Верам'ёва Н. З. З ім разам пайшлі ў армію.

1-га ліпеня я паступіў на работу ў рэдакцыю газеты "Сталінскі прызыў". Працаваў там адказным сакратаром да прызыву. Ужо знаходзячыся ў арміі 29 ліпеня ў гор. Казельску сустрэў Цярэнція. Ён адпраўляўся на фронт. Восенню і зімой я шмат дзён здзяйсняў марш. Давялося адолець больш тысячы кіламетраў. Шмат чаго новага даведаўся і ўбачыў у гэты час. У гор. Ліўны служыў у адной часці з Чукавым. Зараз служу ў кавалерыі. Закончыў курсы радыстаў. Працую таксама сакратаром камсамольскага прэзідыума падраздзялення сувязі.

У Касцюковічах я жыў нядрэнна. Надрукаваў у часопісе тры сваіх вершы. За іх атрымаў 275 рублёў. Зараз у мяне адна мэта, адны імкненні — гэта помсціць гітлераўскім бандытам за сваю Радзіму. А пасля вайны, калі не загіну, паступлю вучыцца ў літаратурны інстытут.

Тата, с. Родню, пэўна, зраўнялі з зямлёй. Там праходзіў вельмі вялікі бой. Таксама здорава пацярпелі і Касцюковічы. З гітлераўцамі мне даводзілася ўжо сустракацца будучы ў камсамольскім знішчальным атрадзе. Яны — нікчэмныя баязліўцы. Тата, я табе паслаў ужо адно пісьмо. Ты яго, пэўна, атрымаў. Я таксама вельмі рады, што ты жывы і здаровы. Пасля вайны сустрэнемся. Да пабачэння. Будзь здаровы. Твой сын Аляксей. Калі ёсць грошы, то прышлі".

1 мая 1942 года.

А вось гэтую паштоўку Аляксей адправіў бацьку праз месяц.

* * *

"Добры дзень, дарагі тата! У цяперашні час я знаходжуся ў дзеючай Чырвонай Арміі, у гвардзейскай часці. Яшчэ будучы ў запасной часці, я перад адпраўкай на фронт паслаў табе дзве паштоўкі. Ты іх пэўна атрымаў. Я жывы і здаровы. Жыву нічога. Пішы, як ты жывеш, якія змяненні адбыліся ў тваім жыцці? Што новага? Са мной у адным узводзе служыць Фрадкін, той, які працаваў у фінаддзеле. Прывітанне ад яго. Пакуль усё. Твой сын Аляксей".

12 чэрвеня 1942 года.

На трынаццаты дзень пасля адпраўкі гэтай паштоўкі Аляксей загіне.

Вось як гэта здарылася паводле ўспамінаў аднапалчан аб апошніх хвілінах жыцця франтавога сувязіста Аляксея Вялічкі.

"121 гвардзейскі кавалерыйскі полк утрымліваў абарону на адведзеным для яго ўчастку фронту. Вораг неаднаразова кідаўся ў шалёныя атакі, але нашы байцы стойка адбівалі іх. Немцы падцягнулі вялікія сілы падмацавання. Камандаванне палка атрымала загад: заняць новыя зручныя рубяжы абароны.

Неабходна было змотаць кабель сувязі. Зрабіць гэта было загадана Аляксею Вялічку. Калі ён амаль закончыў выкананне гэтай баявой задачы, яго акружылі фашысты. Яны імкнуліся захапіць сувязіста жывым. Адважны баец трапнымі аўтаматнымі чэргамі адбіваўся ад насядаўшых фашыстаў.

Скончыліся патроны. У байца засталіся толькі гранаты. Яны паляцелі ў ланцуг наступаючых ворагаў. Але сілы былі няроўныя. Каб не трапіць жывым у рукі гітлераўцаў, апошняй гранатай ён падарваў сябе і варожых салдат".

Так апісваў гэты трагічны момант у сваім матэрыяле "Подзвіг сувязіста" загадчык пазаштатнага аддзела ваенна-патрыятычнага выхавання У. Ламінскі ў адным з нумароў Касцюковіцкай раённай газеты "Сцяг камунізму" за 15 снежня 1975 года.

* * *

Ад аўтара:

Простыя пажоўклыя салдацкія трохкутнікі, зробленыя са школьнага сшытка. Яны як самыя дарагія рэліквіі захоўваліся дзесяцігоддзі ў сямейным архіве бацькоў Аляксея. І толькі нядаўна выпадкова сталі здабыткам грамадскасці.

"Я жывы і здаровы...." Так часта пісаў у сваіх пісьмах сын бацьку. Так, ён загінуў, але назаўсёды яго імя застанецца ў памяці ўдзячных нашчадкаў. Імя журналіста-героя Аляксея Вялічкі, які здзейсніў подзвіг.

Іван ЛАПО

г. Клімавічы

Тэма Вялікай Айчыннай вайны — гэта мацярык, які зноў і зноў будуць адкрываць, вывучаць і адлюстроўваць у сваіх творах пісьменнікі, гледзячы праз прызму свайго часу на ваеныя дзеянні і баталіі і ўзнаўляючы жыццё простых людзей, якія вымушаны былі жыць у холадзе і голадзе, трываць здзекі акупантаў, дапамагаць партызанам і чакаць вызвалення. Як трапна сказаў калісьці ў дзённікавым запісе М. Танк, для нашчадкаў будзе цікава даведацца не толькі пра тое, што рабілася на франтах, але і што адчувалі, знаходзячыся пад акупацыяй, просты земляроб і звычайная жанчына-маці. І трэба сказаць, што такія мастацкія рэчы з'яўляюцца з-пад пяра нашых пісьменнікаў.

Далёкае і блізкае

Да іх ліку трэба аднесці і новы раман Алеся Дзятлава "Над бездань", пра які ў анатацыі сказана, што "падзеі твора ахопліваюць 1940—1945 гады, няпросты, пакутлівы і гераічны час". Чаму празаік, наважыўшыся напісаць пра ваенныя гады, "зачапіў" і тыя, якія папярэднічалі ім? Справа ў тым, што А. Дзятлаў вырашыў прасачыць драматычны лёс героя рамана настаўніка Кавальчука, які перад вайной без аніякай віны трапіў пад прэс сталінска-берыеўскіх рэпрэсій. Перад чытачом праходзіць жыццё чалавека, які вымушаны быў жыць з кляймом "ворага народа". Поўнае трагізму і жыццё яго жонкі Кацярыны, якая засталася адна з малымі дзецьмі на акупаванай тэрыторыі. Вось у двух словах "кіты", на якіх трымаецца раман.

Зрэшты, А. Дзятлаў не ўпершыню закранае балючую тэму, піша пра чалавека, які да вайны быў незаслужана абвінавачаны, але ў ліхую для краіны хвіліну не пайшоў у паслугачы да акупантаў, а ў адрозненне ад некаторых "патрыётаў", што пісалі пасквілі і даносы, стаў на яе абарону. Не будзем гадаць, хто паслужыў прататыпам галоўнага героя твора Кавальчука. Можа, хто-небудзь з блізкіх родзічаў пісьменніка. Надта добра ведае ён псіхалогію персанажа, праўдзіва малюе яго паводзіны і думкі ў складаных абставінах і выпадках. Праўдзіва ўзнаўляе аўтар і даваеннае жыццё, атмасферу няпростага часу, калі вакол панавала падазрэнне і няўпэўненасць у заўтрашнім дні. У поўны рост паўстаюць на старонках рамана і другарадныя героі, якія таксама рупяцца, радуюцца і пакутуюць разам з іншымі персанажамі, галоўным чынам, з жонкай Кавальчука, Кацярынай. Па сутнасці, Кацярына — цэнтральная фігура рамана, вакол якой разгортваюцца падзеі твора і сканцэнтравана ўвага аўтара.

Па сваім таленце Алеся Дзятлава можна смела аднесці да ліку "бытапісальнікаў". Яго цікавяць не інтрыгі, вакол якіх часцей за ўсё раманісты будуюць сюжэт твора, а ў першую чаргу абставіны, у якія трапляюць яго героі.

Пачынаецца раман з таго, што на новае месца жыхарства прыязджае настаўнік Кавальчук са сваёй жонкай Кацярынай і маленькім сынам. Тут ён знаходзіць сабе прыстанішча пасля таго, як пабываў пад арыштам у аддзеле НКУС. Кавальчук знаёміцца з калегамі па будучай працы, дырэктарам школы Літвінюком, тутэйшымі настаўнікамі Белашам і Гродавым. Ён спадзяецца, што тут, у сельскай глушы, яму пашанцуе з галавой увайсці ў настаўніцкі клопат і для яго наступіць спакойнае жыццё, без інтрыг і цкавання, якія зведаў на ранейшым месцы. Але неўзабаве выяўляецца, што і тут не лепш. Дырэктар школы Літвінюк не давярае настаўнікам нават больш, чым іншым, Белашу, які не ліслівіць перад ім, паводзіць сябе самастойна і незалежна. Пасля адной непрыемнай сутычкі Літвінюк адкрыта пагражае настаўніку, бо яго, як і Кавальчука, аднойчы ўжо арыштоўвалі і дапытвалі. Абстаноўка ў настаўніцкім калектыве пагаршаецца і абвастраецца. У хуткім часе Белаша сярод ночы забірае чорны "вараронок". Але мітрэнга на гэтым не канчаецца. Варта было Кавальчуку кінуць нейкую неасцярожную фразу ў абарону Белаша, як пагроза навісае і над ім. Літвінюк не можа дараваць такога адкрытага заступніцтва. Неўзабаве той самы "варанок" прыязджае па Кавальчука. Дзе ён знаходзіцца і што робіць, можна толькі здагадвацца. Увага пісьменніка скіравана на Кацярыну, жонку Кавальчука, і тых, хто жыве і рупіцца, перажывае нягоды побач з ёй. Тым часам вайна і дакочваецца да вёскі і школы, прымушае паказаць кожнага, кім ён з'яўляецца на самай справе. Як неблагі псіхолаг, А. Дзятлаў здолеў прыкмеціць адну вельмі істотную рыску, што характэрна для людзей падазроных і баязлівых, — адчуўшы небяспеку, яны прыціхаюць, робяцца дабрачыннымі і рахманымі. Куды падзеўся звярыны інстынкт Літвінюка падпарадкоўваць сабе людзей, трымаць іх у страху і пакоры. Аказваецца, што не такі ён і смелы, як магло здацца на першы погляд. Як сапраўдны хамелеон, пад маскай патрыятызму ён умела хаваў аблічча кар'ерыста і двурушніка, жаданне вырвацца наперад, узвысіцца над усімі. Калі немцы занялі вёску і схапілі Літвінюка як партыйца ды кінулі на нейкі час у яму, ён, каб уратаваць жыццё, парваў на шматкі партыйны білет, які быў у кішэні, і закапаў пад сабой у пясок. Але і гэта не дапамагло баязліўцу і двурушніку, які тросся за ўласную скуру.

Выпукла і рэльефна паказвае А. Дзятлаў прыход з фронту, калі зямля стогне і дрыжыць пад гусеніцамі варожых танкаў і грузавікоў, якія рухаюцца сярод начы на ўсход, і гэтаму жалезнаму патоку і вэрхалу, здаецца, не будзе канца і краю. Прыход чужынцаў і небяспека, якая пагражае мірным жыхарам, прымушае іх згуртавацца, дапамагаць адно аднаму і акружэнцам, што выходзілі да сваіх. Пісьменнік праўдзіва паказвае іх разгубленасць, недаўменне: чаму замест таго, каб наступаць і ваяваць на чужой тэрыторыі, як ім абяцалі крамлёўскія верхаводы, яны павінны ганебна адступаць, крадком прабірацца да сваіх? Як ні дзіўна, але і ў гэты неверагодна трагічны час, яны не забываюць пра тую пільнасць, якую ўбівалі ім у галовы, і з недаверам і падазронасцю ставяцца да Кацярыны, якая па наіўнасці прызнаецца, што муж яе недзе ў савецкай турме. Аднак самі губляюць асцярогу, якой павінны прытрымлівацца на вайне, лезуць у рэчку купацца. Калі б Кацярына не папярэдзіла іх, што ў вёску нечакана наляцелі немцы, не мінуць бы ім бяды.

Далей А. Дзятлаў імкнецца прасачыць нялёгкую адысею Кацярыны, якая цягнулася праз усю вайну. Божа, колькі пакут і выпрабаванняў давялося ёй вытрываць за гэты час! Як ні парадаксальна сярод бед і трагедый здараліся ў яе жыцці і шчаслівыя моманты, калі, напрыклад, нечакана вярнуўся дамоў муж, вырваўшыся, можна сказаць, з кіпцюроў смерці. Гэта было для яе горкае шчасце і радасць. Бо неўзабаве пад сэрцам у жанчыны ўзварухнулася новае жыццё, і прыйшоў час, калі сярод баявых грымот і ваеннага бязладдзя на свет з'явіўся хлопчык. На вялікі жаль, мужа ўжо не было побач, ён падаўся ў партызанскі атрад. Кацярыне трэба было адной несці пакутніцкі крыж свайго жаночага лёсу, ратавацца самой і ратаваць ад бед малых сыноў.

Самае галоўнае і важкае ў рамане тое, што пісьменніку ўдалося выпукла, каларытна і выразна выпісаць вобраз простай беларускай жанчыны Кацярыны, вельмі тонка і глыбока прыкмеціўшы ў яе характары і ўнутраным абліччы нацыянальныя рысы жаночай адданасці і вернасці свайму мужу, дзецям і тым спаконвечным абавязкам і традыцыям, якія нясе жонка і маці.

Пра ўсе гэтыя перыпетыі празаік апавядае грунтоўна і пераканаўча, малюе карціны вайны яркімі мазкамі і фарбамі.

Як ні цяжка адзінокай Кацярыне, у якой на руках двое хлапчукоў, але ёй сяктак удаецца перакідацца па першым часе вайны. Праз яе светаўспрыманне А. Дзятлаў паказвае, як сельскія жыхары пачынаюць браць у рукі зброю і ўступаюць у барацьбу з акупантамі. Кацярына спачувае ім і ўвесь час думае пра свайго мужа, перажывае, як яму жывецца ў лесе. Магчыма, гэта душэўная пакута дапамае забыцца на ўласныя беды і нягоды, і з дапамогаю добрых людзей і старога і нямоглага суседа Гродава і яго вернай паплечніцы-жонкі, трымацца за жыццё, не ўпадаць у роспач і не губляць прысутнасць духу. А колькі было фізічных і душэўных перажыванняў! Кацярына вымушаны біцца, як рыба аб лёд, каб неяк выжыць. Яна перабіраецца ў лес, дзе атабарыліся сяльчане, каб пры адступленні немцы не пагналі з сабой на захад. Ноччу на зямлянкі наляцелі карнікі і вынішчылі людзей. Кацярыне пашчасціла ўратавацца толькі таму, што яна перайшла ў іншую, добра замаскіраваную, зямлянку. З лесу яна перабіраецца ў вёску, якая жыве пад пільнай вартай акупантаў і паліцаяў. Адсюль непадалёк школа, дашчанік, у якім яна нядаўна тулілася. Жанчына адпрошваецца ў вартавых, спяшае раніцай на сядзібу і ўскапвае рыдлёўкай грады, каб нешта на іх пасеяць. У вёсцы яе і застае вызваленне. Сюды ж вяртаецца з партызанскага атрада і яе муж, Кавальчук. Здаецца, шчасліва закончылася вайна для Кацярыны і яе мужа. Але не! На другую ноч у дзверы грукаюцца нкусаўцы і абіраюць з сабой Кавальчука. Аказваецца яны не забылі пра тое, што ён сядзеў у турме і вырваўся на волю, калі разам з іншымі везлі яго на ўсход і грузавік трапіў пад бамбёжку. Арыштам і заканчваецца цікавы, таленавіта напісаны, раман Алеся Дзятлава "Над бездань".

Але сказаць пра твор толькі гэта, было б да крыўднага мала і няпоўна. Самае галоўнае і важкае ў рамане тое, што пісьменніку ўдалося выпукла, каларытна і выразна выпісаць вобраз простай беларускай жанчыны Кацярыны, вельмі тонка і глыбока прыкмеціўшы ў яе характары і ўнутраным абліччы нацыянальныя рысы жаночай адданасці і вернасці свайму мужу, дзецям і тым спаконвечным абавязкам і традыцыям, якія нясе жонка і маці. Па душэўным багацці і шчырасці, унутранай прыгажосці і адухоўленасці вобраз Кацярыны нагадвае рафаэлеўскую Мадонну і вельмі блізкі да вобраза Сцепаніды з рамана В. Быкава "Знак бяды". Але Кацярына не з'яўляецца двайніком быкаўскай гераіні. Кацярына ў рамане А. Дзятлава "Над бездань" — самастойны, цікавы і арыгінальны персанаж, які здольны папоўніць галерэю нацыянальных вобразаў, што сімвалізуюць беларускіх жанчын.

Васіль МАКАРЭВІЧ

Кніжная паліца

У Мінску ў выдавецтве "Кнігазбор" выйшаў зборнік творчых партрэтаў майстроў беларускай песеннай лірыкі **Ірыны БАРОЎСКАЙ** *"Пад зоркаю кахання і любові"*. Разглядаецца творчасць такіх паэтаў як Я. Чачот. М. Танк, А. Русак, Н. Гілевіч, Г. Бураўкін, У. Верамейчык, В. Шніп, Л. Дранько-Майсюк, А. Бадак і іншых.

У "Кнігазборы" выйшаў зборнік вядомага крытыка і літаратуразнаўцы **Івана ШТЭЙНЕРА** *"Свет шчодры. Свет мяне паўторыць..."* Як напісана ў анатацыі, *"у гэтым манаграфічным даследаванні аналізуецца спадчына выдатнага пісьменніка XX стагоддзя Уладзіміра Караткевіча ў кантэксце славянскіх і еўрапейскіх традыцый, паказана сувязь лірыкі паэта з класічным жывапісам і прозай, вылучаны асноўныя адметнасці паэтыкі."*

У гомельскім выдавецтве "Сож" выйшла двухтомнае альбомна-ілюстраванае выданне *"Речица. Литературно-духовное наследие региона"*. Першы том *"Речицкая лирическая"* прысвечаны жыццёваму і творчаму шляху пісьменнікаў, што нарадзіліся ў Рэчыцкім раёне. Складальнікі **І. Штэйнер і С. Ханеня**, навуковы рэцэнзент акадэмік НАН РБ **У. Гніламёдаў**. Другі том *"А прекрасней Речицы места не найти..."* распавядае пра гісторыю горада, народныя калектывы, мастакоў, спартсменаў, вядомых і заслужаных людзей рэгіёна. Складальнікі **І. Штэйнер, І. Бароўская, М. Макарцоў**, навуковы рэцэнзент **У. Гніламёдаў**. Выданне выйшла пры падтрымцы Рэчыцкага райвыканкама і ўстановы адукацыі "Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф. Скарыны".

У выдавецтве "Кнігазбор" (2008) выйшла кніжка **Міхася КАЗЛОЎСКАГА** *"Нашчадак слаўных крывічоў"* (эцюд да партрэта Адольфа Клімовіча, чалавека і грамадзяніна). *"У кнізе расказваецца пра творчы і жыццёвы шлях знанага ў Заходняй Беларусі грамадскага і палітычнага дзеяча, аднаго з кіраўнікоў Беларускай хрысціянскай дэмакратыі і Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры Адольфа Клімовіча.* Прадмову напісаў Мар'ян Дукса.



У выдавецтве "Чатыры чвэрці" пабачыла свет кніга **"Рукапісная спадчына Янкі Купалы"** (каталог) (Мінск, 2008). *"Упершыню ўвазе даследчыкаў і прыхільнікаў творчасці Янкі Купалы прадстаўляецца магчымасць найбольш поўна пазнаёміцца з аўтографамі паэта і ўбачыць рукапісы яго твораў"* — напісана ў анатацыі кнігі.

Кніга выдадзена пад грыфам Міністэрства адукацыі краіны, Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы, Міжнароднага фонду Янкі Купалы. Выданне ажыццёўлена пры фінансаванні з Фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва.

Укладальнік А. Бурбоўская Ж. Дапкюнас і Я. Раманоўская. Навуковы рэдактар прафесар В. Рагойша.

Па законах класічнай драматургіі

Амаль у кожным нумары часопіса "Маладосць" можна сустрэць прыемную літаратурную навінку — адкрыццё новага паэтычнага імя, а разам з гэтым цікавыя і вынаходлівыя радкі, альбо ўвогуле арыгінальны празаічны твор. Два пераднавагоднія нумары таксама не сталі выключэннем. У іх была змешчана трагедыя Георгія Марчука "Арэст і Касандра". Уражвае тое, што ў згаданым творы пісьменнік звяртаецца да гістарычных падзей, якія адбываліся да новай эры ў Мікенах (Аргосе), у першы год пасля Траянскай вайны. Гэта адна з першых спроб у нашай драматургіі зазірнуць у такія гістарычныя далячыні, наблізіць іх да нашага часу, узнавіўшы падзеі ды інтрыгі, якія пляліся пры двары цара Агамемнана з удзелам яго прыбліжаных. Без асаблівых сцэнічных эфектаў, але па законах класічнай драматургіі развіваюцца падзеі, счэпліваюцца і цэментуюцца ў адно цэлае асобныя эпізоды і ўчынкі, узнаўляючы перад намі трагічныя старонкі жыцця і змагання царскіх асоб і іх клеўрэтаў. Дарэчы, Г. Марчук не навічок у драматургічным жанры, у яго творчым актыве некалькі дзесяткаў як друкаваных, так і недрукаваных сцэнічных твораў. Адны з іх пастаўлены на падмостках абласных і мінскіх тэатраў, па іншых зняты кінафільмы, якія паказваюцца па беларускім тэлебачанні, як, напрыклад, "Кветкі правінцыі" і "Пісьмо да Фелініі", іншыя чакаюць свайго часу. Магчыма, знойдзецца рэжысёр, які ўвасобіць на сцэне і гэтую трагедыю.

Сюжэт, пакладзены ў аснову твора, вельмі просты. Жонка цара Агамемнана Клітэместра падчас знаходжання мужа на вайне з Трояй становіцца палюбоўніцай яго зводнага брата Эгісфа, і яны плануюць захапіць царскі трон і ўладу. А калі цар вяртаецца з вайны, Эгісф забівае яго. Такім чынам, задума змоўшчыкаў здзейснена, і яны могуць радавацца ды жыць, купаючыся ў славе і раскошы. Але кроў людская не вадзіца. Сын Агамемнана даведваецца, хто віноўнік забойства, карае яго мечам і пры гэтым незнарок забівае і маці. Вось тыя сюжэтныя кіты, на якіх трымаецца трагедыя. Але як усё гэта ўвасоблена ў творы? Трэба падкрэсліць, што мастакоўская фантазія Г. Марчука даволі багатая і вынаходлівая. У першым эпізодзе жаніх дачкі цара Пілад разважае з Арэстам пра ўладу, а Агісфа, які перашкаджае яму жаніцца на Электры, міжволі заўважае, што аракул прадказаў для Арэста жахлівы ўчынак: яму наканавана здзейсніць у Мікенах забойства. Арэст не хоча верыць у гэта недарэчнае прадказанне. Ён упэўнены, калі ўжо яму і давядзецца забіць каго-небудзь, то гэта будзе лань.

Вось тая стрэльба, пра якую гаварыў калісьці Чэхаў. Прадказанне аракула — гэта той вузел, завязка твора і адначасова рухавік, што павінен развіваць сюжэт трагедыі. Перад Г. Марчуком стаяла няпростая задача, — як мага больш дакладна і псіхалагічна апраўдана ўзнавіць і перадаць абставіны, у якіх дзейнічаюць героі, крок за крокам прасачыць, праўдзіва і пераканаўча паказаць падзеі, якія і прывялі да трагедыі, што скончылася спачатку забойствам цара Агамемнана, а ўслед за гэтым і смерцю Эгісфа і царыцы Клітэместры. Пісьменнік прасочвае, праследжвае развіццё падзей і той інтрыгі, што спакон вякоў дзейнічае ў класічным трохкутніку, дзе сутыкаюцца муж з палюбоўнікам жонкі-здрадніцы.

Чаму пісьменнік звярнуўся менавіта да тых далёкіх часоў і стварыў трагедыю на незнаёмым для сябе матэрыяле? Відаць, хутчэй за ўсё па той прычыне, што атмасфера і падзеі, якія адбываліся ў далёкія ад нас часы на ўскраіне Рымскай імперыі, вельмі блізкія да таго, што дзеецца сёння ў краінах Лацінскай Амерыкі і на Блізкім Усходзе. Ваенныя перавароты і гвалтоўны захоп улады сталі звычайнай з'явай, якая нікога ўжо не здзіўляе. А калі да ўсяго гэтага дадаць яшчэ і тэрарызм, што, як чума, распаўзаецца па ўсім свеце, то стане зразумела, што ў трагедыі, якая адбылася да новай эры, усё гэта адлюстроўваецца, як у кроплі расы. Менавіта трагічнае дыханне далёкіх часоў дазваляе чытачам адчуць і трагічныя падзеі, што адбываюцца сёння на нашай планеце.

Цікава і тое, што празаік Г. Марчук напісаў свой твор у вершаванай форме.

Праўда, у большасці выпадкаў ён карыстаецца белым вершам і рыфмуе толькі тыя рэплікі, якія хоча вылучыць з усяго сказанага і падкрэсліць іх значнасць. Безумоўна, пісьменнік, бачна, не раз перачытаў Шэкспіра, вучыўся ў яго гаварыць сцісла, вобразна і шматзначна. Хто не спыніць увагі на прызнанні Эгісфа, які звяртаецца да Клітэместры ў трывожную для абодвух часіну: "Вось гэта як мне пражыць? Тут рукі, ногі — усё дрыжыць. І не з таго, што я згубіў уладу. Як мне цябе аддаць, маю прынаду?" У другім месцы яго выказванне нагадвае крылатае выслоўе: "Я з царскага, кажу ім, цеста, я — сын Фіеста!" Не менш вобразныя і рэплікі Клітэместры, калі яна гаворыць з Эгісфам пра свае пачуцці да яго і цара Агамемнана: "Крок да цябе, крок да яго — жаданняў раўнавага." Вобразнасць і дакладнасць прысутнічаюць і ў дыялогах іншых герояў.

Думаецца, што ў рэспубліцы знойдуцца рэжысёры, якія захочуць паставіць трагедыю на падмостках сваіх тэатраў, каб пазнаёміць з ёй шматлікіх гледачоў.

Сцяпан ВАСІЛЬЕЎ

Кніга пра любоў

Такой прозы не хапае.

Якой? Без выштукаў і фанабэрыі, без рэмінісцэнцый і алюзій, без гэтага дакучнага комплексу непаўнавартасці: "трэба пісаць не горш за..", "трэба быць арыгінальным, але гэта немагчыма, бо ўсё ўжо напісана і..."

Шмат хто з пісьменнікаў сёння забываецца на тое, што ў цэнтры, у сарцавіне творчасці знаходзіцца Любоў. І чым больш ты любіш ці прагнеш любові, тым лепш пішаш, малюеш, ствараеш музыку...

Пра гэта і шмат пра што яшчэ нагадвае новы раман Міхася Южыка "Марыянеткі і лялькаводы", які выйшаў нядаўна ў "Мастацкай літаратуры" (серыя "Дэбют").

Міхаіл Юр'евіч Сотнікаў (Міхась Южык) — з таго, апошняга "савецкага" пакалення, якое сфармавалася ў часы "перабудовы", бачыла, як падаюць каменныя волаты. У 1991-м Міхаілу Сотнікаву было 22 гады. Змянялася самая форма існавання, а разам з ёй змяняліся і людзі. У савецкага чалавека, "гаспадара свету і сусвету", проста выбілі з-пад ног глебу.

Ці пісаў тады Міхаіл Сотнікаў? Не ведаю. Малаверагодна. Але прамінуць "бум адраджэння" ён не мог. У віры тады былі ўсе. Хлынуў паток раней "немагчымых" выданняў: адзіная і непадзельная газетная "праўда" на вачах драбілася, дзялілася, нібы клетка ў спрыяльных умовах. Неверагоднае мноства меркаванняў падштурхоўвала да думкі, што адзінай для ўсіх ісціны — няма.

То быў час, як пішуць журналісты і кепскія крытыкі, крушэння старых і паўставання новых ідэалаў. Тады ж адбылося крушэнне ў жыцці Міхаіла Сотнікава: трагедыя назаўжды прыкавала яго да інваліднай каляскі. Так з'явіўся пісьменнік Міхась Южык. На сённяшні дзень ён — аўтар некалькіх раманаў, аповесцей, цыкла апавяданняў, а таксама зборніка вершаў.

На жаль, маё знаёмства з творчасцю Южыка адбылося толькі цяпер, калі я прачытаў раман "Марыянеткі і лялькаводы". Прозвішча, праўда, сустракаў на старонках "Маладосці" і "Полымя", але... Мы сёння вельмі мала чытаем адно аднаго, трэба сказаць. Падборку вершаў яшчэ агледзіш, а раман ці аповесць — не заўсёды. Аблудная лянота з-за перанасычанасці інфармацыяй: чалавек ужо не прымае буйнафарматныя тэксты, думка скарачаецца да памеру "эсэмэскі"... Праўда, выплывае з памяці маленькая, на калонку, маладосцеўская рэцэнзія Южыка на кнігу А. Асташонка "Жоўты колер белага снегу". Памятаю, як апаліў мяне гэты кароценькі тэкст: было відаць, што піша прафесіянал, для якога сам працэс пісьма — святарнае дзейства.

Што да рамана: аўтар не раскрывае месца і час, мастацкі хранатоп. Але кожнаму зразумела, што ўсё адбываецца ў Мінску недзе на сутыку тысячагоддзяў. Паводле пазнакі напрыканцы, кніга пісалася ў 2002—2003 гг. Шкада, што раман не пабачыў свет яшчэ ў 2003-м, адразу па напісанні. Усё ж такі сёё-тое губляецца ў часе, прыходзяць новыя рэаліі. Але Южык мэтанакіравана змяншае іх колькасць, ён імкнецца раскрываць чалавека, а яго ніякія рэаліі не змяняюць: страсці праз усе часы — адныя і тыя ж.

Аповед вядзецца нібы збоку, аўтар ні з кім сябе не атаясамлівае. Пачынаецца ж усё ў адным з гарадскіх тэатраў. Маладога, непрытульнага акцёра Сяргея Пугача "разбірае" дырэктар Бабаеўскі. Потым перад намі праносіцца жыццёвы шлях Бабаеўскага, пасля — ягонай палюбоўніцы Танькі Зарэмбы, пасля — сяброўкі Пугача Людкі Дробаш, і так два дзесяткі персанажаў, іх шляхі-дарогі, поўныя пошукаў шчасця, мільгаюць перад вокам пільнага апавядальніка, нібы вузельчыкі ў тканіне, вынікаючы адно з аднаго, чапляючыся адно за аднаго. Часам гаворка пра герояў ператвараецца ў мікранавелы.

Цэнтрам, кропкай судакранання з усімі персанажамі з'яўляецца Сяргей Пугач, пра якога мы, як ні парадаксальна, амаль нічога не ведаем, акрамя ўспрымання яго іншымі людзьмі. Але гэтыя ўспрыманні "на паверку" аказваюцца несапраўднымі, бо Пугач (ад комплексаў незаўважнага акцёра ці паводле нейкай сваёй мэты) маскіруецца пад іншых людзей, перад усімі героямі ён паўстае ў розных абліччах, грае нечую ролю, адно што не ў тэатры, а ў рэальным жыцці. Так ён самавыяўляецца, пражывае адразу дзесяць жыццяў на дзень. Сяргей Пугач — як Дон Кіхот Post-часу, ён уваходзіць у жыццё чужога чалавека і, часцяком, прымае тую форму, якая "тут і цяпер" патрэбная менавіта гэтаму чалавеку. Як Робін Гуд, Пугач перамагае бандытаў і надзяляе дабротамі ўбогіх. Яго "пашпартнага" ведаюць толькі тэатр, бацька — мастак Леанід Нільч Пугач і бацькаў сябар Валерый Адынец.

Тым не менш, тут мы маем справу не з раманам характараў, а раманам ідэй. Кожны з герояў — увасоблены, уцялеснены пошук шчасця; апелюючы да назвы рамана, можна сказаць, што персанаж — нібы марыянетка ў руках лялькавода-аўтара. У той жа час марыянетка гэтая — правадзейны герой п'есы "Жыццё", у якой грае сваю, непаўторную, адзінкавую ролю. Я так падрабязна тлумачу, бо не хачу, каб патэнцыйныя чытачы кнігі вырашылі, што Южык злядзіў у рамане нейкія гульні-скокі. Зусім не. У наяўнасці толькі "матыў" ці, хутчэй, "ідэя" гульні; рэчаіснасць жа застаецца праўдзівай — размаітай, неахопнай, складанай. Мікрасвет "марыянеткі" не парушае агульнай сацыяльнай карціны Мінска пачатку 2000-х гадоў.

Як вядома, большасць людзей не рэфлексуе на тэму сутнасці жыцця і смерці, на тэму красы, прызначэння мастацтва, уратавання чалавецтва і г.д. Гэта прэрагатыва інтэлігентаў. Класічнымі прадстаўнікамі гэтай слаўнай кагорты ў рамане з'яўляюцца Леанід Нільч Пугач (заможны мастак) і яго сябар Валерый Адынец (інжынер). Дыялог адбываецца пераважна паміж імі, прычым узнікае гэты дыялог паміж устаўнымі мікранавеламі "прыгодаў Сяргея". Круціцца ён вакол аднаго і таго ж: што робіцца з грамадствам і як гэтаму супрацьстаяць. Абодва суразмоўцы сыходзяцца на неабходнасці хрысціянскага стрыжня ў чалавечай душы, ды толькі Леанід Нільч, бадай што, адно дакляруе сваю прылучанасць да ідэалу, а заўсёды вясёлы Валерый Адынец спавядае яго ўсёй сваёй істотай (яго брат-блізнюк доўгія гады памірае ў псіхічнай лякарні). Дыялогі Пугача-старэйшага і Валерыя Адынца часам нагадваюць познія раманы Дастаеўскага (і як радасна ўсведамляць, што ёсць яшчэ празаікі, якія арыентуюцца на Фёдара Міхайлавіча, а не на псеўдамастацкую літаратуру, імя якой — легіён)...

Разам з тым, калі чытаеш, адчуваецца пэўная "камернасць" напісанага. Тут вельмі многа аўтара, яго выпакутаваных сам-насам думак. Я б азначыў жанр гэтага твора як "філасофскі раман". Шмат якія разважанні, праўда, падаюцца наіўнымі; напрыклад, пра тое, што нашаму грамадству, у рэшце рэшт, стане блага ад несупыннага тэлевізійнага danse macabre. І яно, маўляў, вернецца да спрадвечных хрысціянскіх ідэалаў і каштоўнасцей, прыйдзе іншы час. Хочацца адказаць словамі Панчанкі: "Не, Іван Дамінікавіч, ужо не настане!" Цяпер ужо ясна: працэсы, што пачаліся напрыканцы 1980-х — незваротныя. Ускосным чынам пра гэта сведчыць і канчатковы раманны лёс Дон Кіхота Сяргея Пугача...

Але раскрываць сюжэт у рэцэнзіі — справа няўдзячная. Няхай людзі самі возьмуць і пачытаюць гэтую кнігу дабротнай, вельмі беларускай прозы. У ёй — кадр з нашага жыцця, ён як быццам на пэўны час трапіў у аб'ектыў і быццё паплыло далей, марыянеткі ж, "засыпаныя нафталінам", засталіся ў куфрах. Але на нейкае імгненне мы, магчыма, усвядомілі нешта важнае, мікракосм аднаго тэатра стаў макракосмам Тэатра ў шэкспіраўскім сэнсе, гэта значыць, і часткай нас саміх.

Магчыма, і мы самі на нейкі момант сталі бліжэй адзін да аднаго.

Ціхан ЧАРНЯКЕВІЧ

Уладзімір ПРАВАСУД

З салдацкага сшытка

* * *

Спяваюць песню
хлопцы маладыя,
Як праз агонь
і непраглядны дым,
Каб не спазналі больш
вайны жывыя,
Ішоў салдат бязвусы, малады.
Ішоў ён пад Масквой
і пад Смаленскам,
Змагаўся ў заснежаных палях,
Граміў фашыстаў
у пасёлку энскім,
На захад свой
скіроўваючы шлях.
Ён вынес за траіх,
а, можа, болей,
Такі яму цяжкі дастаўся лёс.
І зморанасць сваю,
і смутак з болем
Да Перамогі той салдат данёс.
Яго не згаснуць справы баявыя
І подзвігу яго ў вяках
свяціць і жыць...
...Спяваюць песню
хлопцы маладыя,
Гатовыя той подзвіг паўтарыць.

У дазоры

Ноч плыве над краем. У дазоры,
Не знайшоўшы месца на начлег,
Ходзіць месяц паўнашчокі. Зоры,
Нібы вішні, падаюць на снег.

Цішыня стаіць наўкол такая:
Чутна, як скрыпіць на небе воз
Нейкага сузор'я, як блукае
На дарогах лютаўскі мароз,

Як па дрэвах скача ён, гарэзнік,
Стрэліць для пацехі дзе-нідзе...
Раптам ноч і цішыню прарэзаў
Вокліч, нібы выстрал:
"Хто ідзе?!"

Нават зоркі ласкава, не строга
Са сваёй бяздоннай вышыні
Ўдзячна так глядзяць
на вартавога —
Вартавога нашай цішыні.

Нібы ім вядома ўсё на свеце —
І нікому гэта не адняць, —
Што стаіць ён,
каб на ўсёй планеце
Скрозь была такая цішыня,

Каб заўжды і ўсюды ў дазоры,
Не знайшоўшы месца на начлег,
Месяц над зямлёй кружыўся, зоры,
Нібы вішні, падалі на снег.

Прывал

Спіць у смузе сцямнелы небасхіл.
Як каша, перамешана дарога.
Ідзём мы з поўнай выкладкай
і строга,
Сабраўшы у кулак астаткі сіл.
І вось апошні ззаду пераход.
Дзе толькі сёння ногі не насілі!
Прывал. І змора ўсіх скасіла —
Спіць непрабудным сном
гвардзейскі ўзвод.

Цяпло і песня радуюць вясну.
Пад дахам неба
спяць арлы-салдаты.
Здаецца, што і залпам
нат з гарматаў
Іх не разбудзіш ад такога сну.
Зачырванеў, заружавеў усход.
На змену песні
жайранка ўрачыста
Труба зайграла нашага гарніста —
І зноўку на нагах
гвардзейскі ўзвод,
Гатовы да любога пераходу,
Каб адстаяць і шчасце, і свабоду.

На вучэннях

Цішыня, ў смузе заспаны ранак.
Сырадой-туман ахутаў дол.
Выйшлі на ўзлесак нашы танкі,
Узарваўшы цішыню наўкол.

Выйшлі, развярнуліся на ўзлеску
Гэтай перадранішняй парой.
І наперад, як пяецца ў песні,
Рушылі на "ворага" у бой.

Рухаецца грозная лавіна
Неўтаймоўнай сталі і агню.
Мужныя і смелыя ў машынах,
І мацней іх дружба за браню.

Бараніць заўжды Радзіму-маці!
Прыкрываць ад ворагаў сабой,
Каб быў мір заўжды
ў кожнай хаце,
Каб на ўсёй планеце быў спакой.

...Скончан "бой".
І зноўку на стаянку
На зыходе стомленага дня
Стройнаю ідуць калонай танкі —
Нашая надзейная браня.



Лёля БАГДАНОВІЧ

Свята Перамогі

Здароў былі, лясы, дубравы,
Лугі, палеткі і сады!
Дарогамі бацькоўскай славы
Мы зноў вяртаемся сюды.
Пазарасталі папялішчы,
Ды боль у сэрцах не заціх.
Вайной чацвёрты
кожны знішчаны.
Ці ж мы забыліся пра іх?
Радзіма! Мар маіх калыска!
Куток азёраў і буслоў!
Сягоння ў Бярэсці, і ў Мінску
Адзначым памяць тых гадоў,
Як знікла чорная навала —
Узняўся Перамогі сцяг.
Пад мірным небам
ты заззяла
Усімі фарбамі жыцця.

Ветэранам

Яно прыйшло,
нарэшце, свята,
У медалях адшліфаваных,
Настрой святочны
і прыўзняты —
Ідуць па плошчы ветэраны.
Калоны кожны год радзеюць.
А вочы... Маладыя вочы!
У іх вясна цвіце надзеяй.
Нага ў нагу трапляе, крочыць.
Здароўя, доўгіх год, цярпення
Я ветэранам пажадаю.
Заўсёды галаву й калені
Прад іхняй мужнасцю схіляю!

Шчыры дзякуй!

Занадта дорага
далася Перамога.
Салдатаў мала павярталася
з вайны.
Ніколі не забудзе той былога,
Хто зведаў кошт жыцця
і цішыні.

Кідаўся хто пад грузны
танк з гранатай
І закрываў гарачым сэрцам
кулямёт.
Зямля сырая
маладых засватала.
Салодка спяць
ужо не першы год.

І не прачнуцца ім ужо ніколі,
Не ўзяць на рукі любае дзіця,
Не лётаць белым голубам
на волі,
Не зведаць чар
зямнога пачуцця.

Лёс дараваў ім іншыя спакусы,
Яны жыццё паклалі дзеля нас.
Вам шчыры дзякуй,
хлапчукі бязвусыя!
Мы дажывём
і дапяём за вас...

* * *

Кажуць, у вайны твар
не жаночы.
Можа, й праўда.
Ды нага ў нагу
Побач з хлопцамі
дзяўчаты крочылі
Праз завеі, маразы, дрыгву.

З-пад агню
параненых выносілі
На худзенькіх
змораных плячах.
Моклі пад дажджом
сырою восенню,
Замярзалі
ў студзеньскіх снягах.

Сапраўды, ў вайны твар
не жаночы.
Дык чаму ж сузор'ямі
з нябёс
Пазіраюць
тых дзяўчатак вочы,
Чый вайной
знявечаны быў лёс?

Фота Віктара Кавалёва

Валерый ЧАРНЫШЭЎСКІ

* * *

Там, дзе бярозы шэпчуць вершы,
Дзе спіць у лузе цішыня,
На жытнім полі
ў сорак першым
Свой след пакінула вайна.

Прылягу я каля дубровы
І ноччу чэрвеньскай трава
Пра тую бітву кажа словы,
Каб памяць сэрца ажыла.

Ты, поле памяці салдацкай,
Пра бой апошні раскажы.
Пра медсясцёр тых
з медсанбата,
Што пахаваны ля мяжы.

Ў той час, як танкі грукаталі,
Ў крыві рамонкі палягліі.
Байцоў дзяўчаты ратавалі,
Сабе ж ратунку не знайшлі.

Яны параненых цягнулі
Цераз кустоўе, праз лугі,
Наўкола іх звінелі кулі,
Гарэлі дрэвы у агні...

О поле бою, поле бою!
Не пагражае забыццё
Тым, хто ахвяраваў сабою,
Каб спела жыта і жыццё.

Ніна РАДЗІВОНЧЫК

Не сейце, людзі, зло...

Не сейце, людзі, зло,
Зло — бумеранг,
Праз мноства пакаленняў,
Нашчадкам, як не вам,
Зноў вернецца яно.
І некалі
не хопіць моцы вам,
Каб вытрымаць,
дайсці ці дасягнуць,
Ці, можа,
да жыцця каго вярнуць,
Не хопіць іскры той у целе
ці ў душы,
Якую недзе нехта
патушыў.
Не сейце, людзі, зло —
Нібы асот, яно
Учэпіста уп'ецца ў вашы душы,
Усё найлепшае заглушыць —
І чорнае саспее зерне зноў, —
І так — бясконца.
У прорву кіньце зло,
На самае на дно,
Каб там,
Ні свету Божага не бачачы,
Ні сонца,
Навекі згінула яно.

...Не сейце, людзі, зло.

Чаравік з таўшчэзнай падэшвай

Анатоль СМАЛЯНКА

Сцяпан Гаўрылавіч Купрэвіч, калі, бывае, я завітаю да яго, любіць распавядаць пра франтавое жыццё: не дзіўна, амаль год правёў у акопах, на маршах, у баях... Зразумець чалавека можна. Жыве ён са сваёй Ганнай на хутары ў Налібоцкай пушчы. Глухамань! Рэдка тут бываюць людзі, асабліва зімой. Таму і пагутарыць ім хочацца. Адзін сын ёсць, але і той пасля звальнення з войска прыжыўся на радзіме жонкі ў Новасібірску і пра сябе нагадвае толькі лістамі.

Аднойчы ў будні дзень я зазірнуў да Сцяпана. Аўчарка ростам з цяля ад злосці на незнаёмца рвала ланцуг, не гаўкала нават, а хрыпела, рыкала.

— Біл, у будку! — стары выйшаў з хлява і, накульгваючы, наблізіўся да мяне. — О, каго я бачу! Здароў! Якім ветрам цябе занесла да нас? Біл, каб ты спрах, сціхні! У будку! Хадзем у хату! Ганна, ты дзе? Госць у нас!..

Перад ганкам зняў гумовыя боты, ногі сунуў у самаробныя тапкі, лапсердак кінуў на плот. Бачу — ад склепа тупае яго жонка Ганна — худзенькая, невялічкая сівая кабета з кошыкам бульбы. Павіталася і пакланілася ў пояс.

— Праходзь, не саромейся, — запрашае мяне Сцяпан, адчыняе дзверы. — Што там чуваць у сталіцы? Кажуць, тэлевізійную вежу будуць ставіць? Добра было б, мы тады ўсе праграмы ўбачым...

У зале на стале хутка з'явілася закуска: сала, дамашняя каўбаса, масла, марынаваныя грыбочкі, агуркі і, зразумела, паўлітра гарэлкі "Два буслы". Увесь час, пакуль Ганна соўгалася з посудам ды ежай, мы перакідваліся кароткімі фразамі. Селі за стол.

— Мусіць, гады тры не бачыліся? — Сцяпан Гаўрылавіч наразае хлеб. — Бяжыць час, і з кожным днём усё бліжэй і бліжэй да гэтай, што стаіць і чакае з іржавай касой, каб скасіць — і ў магілу... Давай, браток, за ўсё добрае! Дзякуй, што не прайшоў міма, праведаў нас!

Паступова гутарка набыла імпэт. Гаварылі аб усім: чаму цэны растуць як на дражджах, пра тэрарыстаў, бабка Ганна пра свае балячкі раз-пораз успамінала, пра сына, які чамусьці забыўся пра іх.

— Нага часта ные, — паскардзіўся Сцяпан. — Асабліва калі надвор'е мяняецца.

— Але ж бачу, без чаравіка ходзіце, мо выкінулі? — пытаюся.

— Не, — адказвае дзядзька. — той, што з фронту прынёс, даўно парваўся, нікуды не варты стаў... няма ў раёне добрага шаўца, каб змайстраваў гэткі ж...

— Як-ніяк, свая нага, без мыліцы абыходзімся, — заўважае Ганна, якая дарэчы, не лічыць яго інвалідам, а гэта вельмі не падабаецца мужу.

— А ты хоць ведаеш, як я яе выратаваў? Не? — Глядзіць на жонку, замаўкае, затым ідзе да фотаздымкаў у рамках, што вісяць на сцяне: — Паглядзі, якім я быў перад вайною! Мацак! Асілак!

З фотаздымка на мяне глядзіць хлапчук з вясёлым позіркам.

— За Віслай была справа, да Германіі — рукой падаць. Мяне моцна паранілі ў правую нагу, вышэй калена. Памятаю, санітары прывалаклі ў санчасць, потым у шпіталь адвезлі. Хірург паглядзеў — і адразу на аперацыю. Балела страшна, але я быў пры памяці і пачуў, што нагу хочуць адрэзаць... Хірург (прозвішча яго забыў) мяне нават і слухаць не стаў: "Вы, радавы Купрэвіч, хочаце тут камандаваць? Нам лепш ведаць. На аперацыю!". Тады не вельмі цырымоніліся: у адзін момант руку ці нагу адцяпаюць і вокам не паспееш міргнуць.

Зноў клічу хірурга і ціха так пытаю: "Таварыш ваенурач, ці кахалі вы каго-небудзь хоць раз у жыцці так, каб свету белага не бачылі, моташна было, дзень і ноч каханая перад вачыма стаяла?.." Глядзіць на мяне са здзіўленнем: "А чаму вы пытаецеся?" І я шчыра, вось як табе, распавёў пра сваё каханне, ды так, што ажно ў самога слёзы на вачах выступілі: і пра тое, як у блакаду мы хаваліся на балоце, і як цалаваліся пад разрывы мін і снарадаў, як ратаваліся, а потым Ганначка мая роўма раўла, калі адпраўляла мяне на фронт.

— Выпіў кілішак і мелеш абы-што, — жонка з усмешкай перапыніла гэтую тыраду, але Сцяпан зрабіў выгляд, што не пачуў.

—Дык вось, хірург яшчэ раз уважліва аглядзеў нагу, — распавядаў далей дзядзька. — Потым кажа: "Каханне — справа сур'ёзная, адказная і не да кожнага яно прыходзіць. Буду думаць, салдат. Ты маё сэрца надта крануў..." Адным словам, нагу ўкараціў на адзінаццаць сантыметраў, загадаў зрабіць мне такі чаравік, каб менш кульгаў ды хадзіў без мыліцы. Але ж гэтая яго дабрыня ледзь не пашкодзіла мне. Значыцца, прыйшоў дамоў. Мая Ганна — уся радасць і шчасце. Пачалі мы з ёю жыць у любосці і згодзе...

— ...Ты лепей раскажы, як цябе хацелі цалкам здаровым зрабіць, — азвалася жонка з кухні — заварвала там гарбату.

— Нікому не казаў пра гэта, а табе, госцю, раскажу, — працягваў Сцяпан. — Выклікалі мяне на медкамісію: тады штогод выклікалі чамусьці, мабыць, думалі, што нага можа зноў вырасці... Апрануў я святочны касцюм, ну як жа, у райцэнтр еду. Сяджу ў прыёмнай. Людзі заходзяць, выходзяць, швэндаюцца начальнікі розныя... Але вось і мяне дзяўчо кліча. Я пінжак папраўіў з медалямі, ды ў кабінет. "Дзень добры усім", — кажу, і стаю перад імі, быццам перад камандзірамі. "Як здароўе, настрой?" — пытаецца адзін, мусіць, самы галоўны. "Якое ў інваліда здароўе! Рана дае аб сабе знаць", — адказваю.

Сцяпан не на жарт расхваляваўся, набліжаючыся ў расповедзе да самага галоўнага. Ён устаў, падышоў да прыпечка, прыкурыў цыгарэту, пусціў дым у комін.

— Дык вось, — працягваў стары. — Адна фіфа з нафарбаванымі вуснамі і доўгімі кіпцюрамі глядзіць на мяне і непрыемным такім голасам гаворыць: ходзіць ён добра, здароўе ў яго нядрэннае, хопіць яму і другой групы, а можа, і трэцяй... Усе зашукаліся, адзін з адным перашэптвацца пачалі, а у мяне, братка, у душы полымя шугае... "Гэта што ж робіцца? Здзек з чалавека! — Я і не вытрымаў: "А ты, паважаная, з пафарбаванымі кіпцюрамі, ведаеш, што такое атака? Не? Дык я пакажу!" — "Толькі не гэта, Сцяпан Гаўрылавіч!" — замахалі рукамі медыкі. "Не, браточкі родненькія, вам трэба ведаць, як там усё адбываецца. Ротны на ўсё горла камандуе: "Прымкнуць штыкі! У атаку! Упярад!" Выскачылі з акопаў насустрач фашысцкаму ланцугу. І пачынаецца самае страшнае: сцяна на сцяну, паветра напаўняецца крыкамі: "Ура! За Радзіму! За Сталіна!!" Скрозь мацюкі, стогны... Пырнуў я з усяго лёту аднаго гітлераўца ў жывот, а вырваць штык ніяк не магу... Потым другога закалоў, але тут хтосьці мне па галаве ўдарыў... Упаў... Падхапіўся. Крычу што ёсць моцы. Сеча — па ўсім полі, выбухі, стрэлы... Вось і траншэя. Было ў нашай роце мусіць, хлопцаў 500, а дабеглі да яе мо з сотню... Ротны зноў голас падае: "Замацавацца!" Пачалі прыводзіць сябе ў парадак і тут — артналёт. Міна, а мо снарад жахнуў у траншэю... І ўсё. Траіх напавал, а мне — асколак у нагу".

"Тое, што вы тут нам расказалі, да вашай інваліднасці ніякага дачынення не мае". — "Як гэта не мае? А мой кавалак нагі — гэта што, дарэмна?.." — "Але ў вас нага, а не мыліца? — тая вядзьмарка вырачыла зенкі і з'едліва так пытае: — Чамусьці яе вам пакінулі?" — "Мне было васемнаццаць гадкоў, куды я без нагі? Як араць, касіць, працаваць?.. Хірург чулы чалавек быў, зразумеў мае пачуцці, мой боль", — адказваю. «Ну і што з гэтага?» — зноў тая мымра дапытваецца.

Мне стала так крыўдна, што я нават прысеў на табурэтку, хуценька зняў свой чаравік на тоўстай падэшве — і стаю перад імі на левай назе, як гусь у халоднае надвор'е. Правая нага целяпаецца і да падлогі не дастае... Яны ахнулі, глядзяць на мяне.

"Прайдзіцеся па пакоі", — загадвае мужчына. Я чыкільгаць пачаў туды-сюды... "Усё зразумела, можаце абуваццa". Так і засталася ў мяне першая група на ўсё астатняе маё жыццё.

— А ці носіце вы той чаравік? — пытаюся ў яго і з жартам дадаю: — Цяпер у модзе абутак на тоўстай падэшве, фарсіць маглі б...

— Сапсаваўся зусім, а драўляны нікуды не варты, цяжка цягаць такую калоду. Ды і хто возьмецца за гэткую справу, — разважае Сцяпан, выходзіць у сенцы, корпаецца ў кладоўцы, вяртаецца назад і паказвае той, франтавы, які яму выдалі пасля шпіталя.

Бяру стары абутак, кладу ў цэлафанавы пакет і абяцаю ў Мінску знайсці шавецкую майстэрню, каб зрабілі гэткі ж лёгкі чаравік з падэшвай таўшчынёй адзінаццаць сантыметраў.

Міхась ПАЗНЯКОЎ

З маміных аповедаў

Дабрата

Праз вёску адступалі фашысты. Нашы гналі ворага на захад, не даючы яму замацавацца.

Пранесліся апошнія варожыя матацыклы і аўтамашыны, на вуліцу пачалі выходзіць, выбіраючыся са сваіх сховішчаў, ацалелыя людзі — старыя, жанчыны, дзеці. За лесам чуцен быў ужо гул нашых танкаў. Ішло доўгачаканае вызваленне! Усе рушылі насустрач.

Раптам затарахцеў нямецкі матацыкл. Ён выскачыў на сярэдзіну вуліцы і спыніўся якраз перад купкай сяльчан. Перапалоханы белабрысы немец адчайна плакаў, кляў Гітлера, вайну. Потым кінуў на зямлю аўтамат і стаў таптаць яго. Пасля дастаў з кішэні фотакартку, на якой усміхаліся прыгожая чарнявая жанчына і дзве маленькія дзяўчынкі з бялюткімі, падобнымі на матылькоў, банцікамі на светлых галоўках, падносіў маўклівым людзям і, заліваючыся слязьмі, на незразумелай сваёй мове энергічна тлумачыў ім так добра знаёмае.

— А дзе ж ты, дзе вы ўсе раней былі, калі плакалі мы?.. Цябе чакаюць дзеці. А хто верне нашых, расстраляных, спаленых?!.

Гэта сказала баба Марфа, у якой фашысты замучалі сына і спалілі ягоную сям'ю: жонку і траіх малых дзетак.

— Трэба было раней клясці свайго Гітлера паганага, — працягвала старая. — Едзь да сваіх дзетак і жонкі, а гэта, — яна ўзяла аўтамат у рукі, — кінь назаўсёды. Едзь і глядзі, каб і твае дзеці і дзеці тваіх дзяцей ніколі не стралялі ў людзей.

Немец пакорпаўся ў матацыкле, завёў яго і паехаў далей. Усе глядзелі з хвіліну яму ўслед. Глядзела і старая Марфа.

— Хай дачакаюцца дзеткі бацьку. Хай дабярэцца да сям'і салдат, — перахрысціла яна яго ўслед.

Я пачуў гэты аповед ад маці яшчэ ў маленстве. І запомніў на ўсё жыццё. Напэўна, каб расказаць іншым...

Вінтоўкі

Маці зашывала латаныя-пералатаныя Сярожавы штонікі, калі ў весніцы загрукаталі нечым металічным. Яна зірнула ў акно. З вуліцы даляцелі звычныя ўжо за другі год акупацыі нямецкія пагрозы.

— Хутчэй на печ! — скамандавала маці двум сынам: сямігадоваму Сярожу і пяцігадоваму Толіку, а сама паспяшалася з хаты, каб няпрошаныя госці не выламалі веснічкі.

Два гітлераўцы з вінтоўкамі ў руках зайшлі на двор.

— Яйка, шнапс, матка! Шнэль, шнэль! — запатрабавалі ваякі і ўпэўнена пашыбавалі ў хату.

Паставіўшы зброю ў кут, акупанты прыселі да стала, паказваючы ўсім выглядам, што яны доўга чакаць не збіраюцца.

— Дзеці ў мяне, паночкі, і самім...

— Партызане? — грозна абарваў яе маладзейшы немец, — тыцнуўшы пальцам у партрэт на сцяне.

— Не! Гэта мой фатэр. Ён памёр яшчэ да вайны, — спалохалася маці.

Яна дастала з шуфляды два яйкі і некалькі маленькіх скрылікаў сала ў місачцы. Адрэзала дзве лусты выпечанага ўчора хлеба, прынесла відэльцы.

— Шнапсу няма, — маці скрыжавала на грудзях натруджаныя рукі.

Малодшы фашыст падышоў да печы і адкрыў заслонку. Згледзеўшы чыгунок з бульбай, загадаў падаць яго на стол.

Пагергетаўшы, немцы прыняліся за страву. Доўга нюхалі хлеб.

— Гут! Зэр гут, матка!

На печы заварушыліся дзеці, дзве пары вачэй свідравалі ворагаў. Няпрошаныя госці падхапіліся з-за стала. Але пераканаўшыся, што пагрозы для іх не існуе, супакоіліся.

Нетаропка пакончыўшы з харчамі, задаволеныя, гітлераўцы падзякавалі гаспадыні і накіраваліся да дзвярэй. І раптам іхнія твары знерухомелі, пабялелі, вочы забегалі па баках.

Кут, куды яны паставілі свае вінтоўкі, быў пусты.

Перапалоханыя салдаты кінуліся на печ, зазірнулі пад ложак, засноўдалі па хаце. Потым выбеглі ў сенцы, але зброі не знайшлі. Нідзе не было і малых.

— Матка! Капут! — падбег да яе старэйшы немец. — Пастраляйт усіх, хата — жыг! Матка, вінтоўка шукайт!..

Маці не на жарт занепакоілася, але не разгубілася. Яна ведала, што можа чакаць яе з дзецьмі — немінучая смерць.

— Паночкі, дзеці пажартавалі, палічылі вінтоўкі за цацкі, — заплакала маці, — пагуляць захацелі.

Яна борзда ўзабралася па лесвічцы на гарышча, дзе зашыліся Сярожа з Толікам, непрыкметна выслізнуўшы з хаты. Адшукаўшы пад анучамі вінтоўкі, узрадаваная, схапіла іх і апусціла ўніз.

— Вось бярыце, каб яны згарэлі разам з вашым Гітлерам, які распачаў вайну...

Схапіўшы зброю, немцы выбеглі з хаты, як аблітыя варам.

— Дзе кіндэр? Дзе кіндэр? — пагрозна зіркалі яны па баках. — Партызанэн!

— Малыя яны, дурненькія яшчэ, — галасіла маці...

Патаптаўшыся яшчэ некалькі хвілін, немцы падаліся на вуліцу.

Уздыхнуўшы з палёгкай, маці шчыльна зачыніла веснічкі.

— Мама, не плач... Не плач, мамачка, — падбеглі да яе малыя жэўжыкі. Мы схавалі вінтоўкі, каб яны нікога не застрэлілі...

— Дурненькія, — памякчэла маці, абдымаючы сыноў. — Тата ваш на фронце ваюе. Хутка ён усіх фашыстаў прагоніць.

Арт-пацеркі

Днямі ў сталіцы завяршылася Рэспубліканская выстаўка дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Яна была адкрыта напярэдадні веліконага свята ў Палацы мастацтва і прадставіла работы творцаў-жанчын. Разнастайная экспазіцыя беларускіх мастачак, якія, працуючы ў адмысловых тэхніках, дэманструюць багатыя выразныя

магчымасці керамікі, ствараюць маляўнічыя роспісы па шоўку і г.д., сталася сапраўдным вясновым падарункам для гледачоў.

Самабытны музычны сімвал, інструментальны голас Беларусі — старажытная дуда спаконвеку вяртаецца на сваё гістарычнае месца. І наша краіна пачынае ўспрымацца як цэнтр дударскай культуры Усходняй Еўропы. Ёсць майстры, якія вырабляюць, апроч беларускіх дудаў, і шведскія sakspipa, і нямецкія dudelzak. У Мінску дзейнічае Дударскі клуб, з 1992 г. праводзіцца Міжнародны "Дударскі фэст" (адзіны ва Усходняй Еўропе), які ўжо стаў штогадовым. На фестывальных пляцоўках можна пачуць беларускія, галісійскія, шатландскія, шведскія, нямецкія, літоўскія і латышскія дуды. Вось

і сярод гасцей нядаўняга "Дударскага фэсту-2008" значыліся дудары з Балгарыі, Літвы, Новай Зеландыі, Польшчы, Расіі, Украіны, Эстоніі... Гучала, як заўсёды, музыка розных напрамкаў і стыляў: ад аўтэнтычнага фальклору да рок-кампазіцый, што прываблівае самую шырокую аўдыторыю. Матэрыялы, даклады традыцыйнай навуковай канферэнцыі, праведзенай у межах фэсту, плануецца выдаць асобным зборнікам, рыхтуецца і выпуск відэафільма "Дударскі фэст 1992 — 2008".

Больш як паўтара дзесятка мастакоў прадставілі свае палотны на выстаўцы "Срэбра і золата". У аснову гэтага незвычайнага праекта быў пакладзены сапраўдны мастацкі падыход: палотны экспанентаў аб'ядналася каларыстычная

адметнасць — спалучэнне срэбнага і залацістага таноў, адсутнасць іншых выразных фарбаў у колеравай гаме прадстаўленых работ. Выстаўку паглядзелі наведнікі сталічнага Палаца мастацтва.

С. ВЕТКА

Фота Кастуся Дробава і аўтара

«Чырвоны гваздзік» — гэта пазіцыя

Вакальны ансамбль "Чырвоны гваздзік" быў створаны ў 1973/74 навучальным годзе. Тады на адным з факультэтаў Беларускага дзяржаўнага інстытута народнай гаспадаркі ўзнікла неардынарная ідэя: стварыць хор, і каб яго ўдзельнікі, як прапанаваў на той час загадчык кафедры замежных моў Сяргей Галаўко, былі толькі выкладчыкі і толькі мужчыны. Ён і стаў кіраўніком новага калектыву, бо скончыў у свой час Мінскае музычнае вучылішча імя М. Глінкі, доўга працаваў у Дзяржаўным народным хоры БССР, а потым у хоры Беларускага тэлебачання і радыё.

"Чырвоны гваздзік", унікальны ансамбль энтузіястаў спеваў, існуе ўжо 35 гадоў. Яму даводзіцца выступаць не толькі ў роднай ВНУ, але і на прадпрыемствах, у калгасах, у розных іншых установах і нават краінах. А першае выступленне адбылося ў час агляду-конкурсу мастацкай самадзейнасці факультэтаў колішняга Інстытута народнай гаспадаркі ў красавіку 1974 г. Сем выкладчыкаў (С.Галаўко, Б. Любчэўскі, В.Саломка, В.Соусь, М. Рабаконь, В. Танковіч, М. Яловіч) выступілі з песнямі "Чырвоны гваздзік" А. Астроўскага на словы Л. Ашаніна і беларускай народнай "Ці ўсе лугі пакошаны". Поспех быў вялікі. Вось і вырашылі працягваць рэпетыцыі, павялічыць колькасць удзельнікаў, часцей з'яўляцца на сцэне, і не толькі перад студэнцкай аўдыторыяй.

Калектыў паступова папаўняўся новымі талентамі. Да нас прыйшлі яшчэ нікому не вядомыя спевакі: прафесары, дацэнты розных кафедраў ды іх загадчыкі, дэканы, іх намеснікі, кіраўнікі розных службовых падраздзяленняў. Сёння далёка не ўсе з іх працуюць у нашым універсітэце, але на рэпетыцыі і канцэрты прыходзяць. Канцэртмайстрам ансамбля доўгі час заставаўся Эміль Наско, член Беларускага саюза кампазітараў.

Што іх цягне да спеваў, да ўдзелу ў ансамблі? Каб даведацца пра гэта, калісьці нават анкету склалі, прапанавалі артыстам з народа адказаць на пытанні, кшталту: што прывяло цябе ў ансамбль "Чырвоны гваздзік"? што адчуваеш як яго ўдзельнік? якія нязручнасці і перашкоды ён стварае табе? пра што думаеш на сцэне, настройваючыся на песню? што трэба змяніць ансамблю? і г.д. Адказы былі цікавыя і змястоўныя. Яны сведчылі пра тое, наколькі вялікае месца ў жыцці ўдзельнікаў "Чырвонага гваздзіка" займае музыка, спевы, сама творчая атмасфера калектыву. Калегі пераважна казалі, што сюды іх прывяло жаданне спяваць, любоў да песні, традыцыя спявання ў сям'і ці звычка школьных, студэнцкіх гадоў, імкненне далучыцца да суполкі цікавых людзей. Прызнаваліся, што, "здаецца, дзесятак гадоў зваліўся з плячэй", што "з'явілася адчуванне, быцам ты здольны даць людзям нешта яшчэ, акрамя сваіх прафесійных ведаў", што "хочаш паказаць студэнтам: выкладчыкі не нейкае там "сухар'ё", а жывуць поўным разнастайным жыццём і сваім прыкладам заклікаюць моладзь да гэтага". Мноства сустрэч з аўдыторыяй розных узроўняў прынесла ансамблю грамадскае прызнанне. Калектыў носіць ганаровае званне "народны", узнагароджаны шматлікімі граматамі і дыпломамі, ў тым ліку Ганаровай граматай за высокае выканальніцкае майстэрства, прадэманстраванае на Усесаюзным тэлевізійным конкурсе "Таварыш песня", заключны канцэрт якога мільёны тэлегледачоў бачылі напярэдадні юбілею Перамогі савецкай краіны ў Вялікай Айчыннай вайне. У той дзень "Чырвоны гваздзік" выконваў "Лясную песню" У. Алоўнікава на верш А. Русака.

Пра калектыў гэты нямала пісалі. "Артысты з народа", "Спявае і рэктар і дацэнт", "В ансамбле только преподаватели" — вось загалоўкі некаторых са шматлікіх артыкулаў пра яго. У 1987 г. Нацыянальная кінастудыя "Беларусьфільм" выпусціла дакументальную стужку "Красная гвоздика", якая неаднойчы дэманстравалася ў кінатэатрах былога Савецкага Саюза, а таксама па тэлебачанні СССР і Беларусі.

Вядома, калектыў наш не маладзенькі. Таму апошнім часам выступаем у роднай установе ўсё радзей. Ці, можа, і цікавасць да нас знікла? Але ж калі мы ўдзельнічаем у канцэртах, дык упэўніваемся ў тым, што нашы спевы гледачам падабаюцца. Песні ў выкананні "Чырвонага гваздзіка" ўспрымаюцца з прыемнасцю і выклікаюць гром апладысментаў.

Успамінаю, як не адразу ўсё атрымлівалася. Спатрэбілася шмат гадоў руплівай працы, пакуль нас заўважылі. А не заўважыць было ўжо немагліва. Нашы бясконцыя рэпетыцыі давалі ўсё больш станоўчы вынік, выступленні паўсюль мелі вялікі поспех. І вось — узнагарода афіцыйная. Яе мы атрымалі ў 1978 г., заняўшы першае месца на абласным аглядзе калектываў мастацкай самадзейнасці выкладчыкаў і супрацоўнікаў ВНУ. Гэта падштурхнула нас узяцца за больш складаны рэпертуар, вызначыць і свой мастацкі напрамак. Аранжыроўкі песень рабіліся ўсё больш складанымі, шматгалосымі, выкананне ў суправаджэнні фартэпіяна, баяна ці акапэльна набывала акадэмічнае гучанне.

Нас пачалі заўважаць і прафесіяналы і запрашаць для ўдзелу ва ўрадавых мерапрыемствах, канцэртах, розных конкурсах, фестывалях і г.д. А ў 1980 г. калектыву надалі ганаровае званне "народны". Знакаміты беларускі фальклярыст, народны артыст СССР, лаўрэат Дзяржаўных прэмій, стваральнік і мастацкі кіраўнік Дзяржаўнага народнага хору БССР Генадзь Цітовіч, якога мы лічым сваім хросным бацькам, тады казаў: "Чырвоны гваздзік" я слухаў не адзін раз і адразу адзначу: бачна вялікая праца. Нараджэнне такога ансамбля, у якім спяваюць людзі з многімі навуковымі тытуламі бясконца занятыя на сваёй працы, — з'ява далёка не ардынарная. І прытым, як хораша спяваюць!". У красавіку 2005 г. мы пацвердзілі ганаровае званне "народны" ўжо сёмы раз.

Доўгі час лічылася, што наш калектыў — з'ява надзвычайная. Сёння, як мне вядома, гэта не зусім так. У некаторых ВНУ даўно існуюць змяшаныя харавыя калектывы высокага майстэрства, у складзе якіх і мужчыны, і жанчыны. Ёсць жаночыя хоры і вакальныя ансамблі. Мужчынскіх ансамбляў, праўда, — не густа.

Разуменне таго, што ў наш нялёгкі час песня не толькі ўпрыгожвае жыццё, але і дае магчымасць узвышацца над штодзённымі праблемамі, дапамагае спевакам трымацца, не старэць. Вось чаму нашы мужчыны выглядаюць зграбнымі, падцягнутымі, значна маладзейшымі за свой узрост. Менавіта таму сёння лічаць за гонар прыходзіць у свой калектыў, спяваць у ім былыя ўдзельнікі ансамбля, якія ўжо не працуюць у эканамічным універсітэце.

Кожны тыдзень я сустракаюся з прыгожымі, цікавымі, адукаванымі прафесіяналамі БДЭУ і заўсёды заўважаю новыя і новыя рысы ў характарах, новыя здольнасці, новыя прафесійныя дасягненні. Іх прафесійны рост, у першую чаргу, робіць гонар і мне як кіраўніку ансамбля, а яшчэ большы гонар нашай установе, бо прафесійнае майстэрства педагога складаецца не толькі з выкладання той ці іншай дысцыпліны ў студэнцкіх аўдыторыях, але і з іншых кампанентаў нашага штодзённага жыцця.

Амаль усе выкладчыкі, што пяюць у ансамблі, былі сведкамі альбо ўдзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны, тых далёкіх вогненных гадоў, пра якія складзена вельмі многа прыгожых песень. Менавіта з гэтай прычыны ў нашым рэпертуары ёсць песні на патрыятычную тэму. Яны карыстаюцца вялікай папулярнасцю ў нашых канцэртах. Выконваем мы іх з асаблівым задавальненнем і з усведамленнем таго, што выхоўваем у моладзі жаданне самім спяваць у хоры, ансамблі ці сольна і, галоўнае, выхоўваем любоў да спеваў. Людзі старэйшага пакалення, ды і моладзь, ведаюць такія песні і падпяваюць нам.

"Чырвоны гваздзік" выконвае задачы не толькі прапагандыста народнай, патрыятычнай, лірычнай, жартоўнай песні, якімі багаты беларускі народ, наш фальклор. Думаецца, што актыўная жыццёвая пазіцыя ўдзельнікаў Народнага мужчынскага вакальнага ансамбля прафесараў і дацэнтаў БДЭУ ўплывае на якасць выкладання, на агульны ўзровень культуры студэнтаў. Той выкладчык, які нічым не цікавіцца, акрамя як фармальным выкананнем сваіх абавязкаў, г. зн. пунктуальна прыходзіць на службу, не спазняецца, але і не затрымліваецца пасля праведзеных заняткаў, абрастае штампамі, не можа ўдасканальвацца, творча расці і годна перадаваць свае веды студэнтам. І наадварот, хто займаецца шматбаковай дзейнасцю, актыўна ўдзельнічае ў навукова-даследчай, навукова-метадычнай, грамадскай рабоце, значна цікавей праводзіць заняткі ў студэнцкіх групах, бо, дзякуючы сваім багатым ведам, вопыту, робіць лекцыю больш творчай, рознабаковай, жывой.

Адным словам, прафесія выкладчыка, тым больш у ВНУ, абавязвае чалавека быць прыкладам высокай культуры, творчых адносін да працы. І жыццёвая пазіцыя ўдзельнікаў нашага ансамбля адпавядае гэтаму адказнаму абавязку.

Сяргей ГАЛАЎКО,
кандыдат педагагічных навук, прафесар кафедры раманскіх моў Беларускага дзяржаўнага эканамічнага універсітэта, заслужаны работнік культуры Рэспублікі Беларусь

Японія цяпер бліжэй

У жыхароў і гасцей Горак з'явілася унікальная магчымасць — зрабіць экскурсію ў загадкавую краіну — краіну Узыходзячага сонца, падзівіцца на старадаўнія храмы, убачыць кімано, бліжэй пазнаёміцца з яе самабытнай культурай. Такі багаты гасцінец прэзентавала нам пасольства Японіі ў Беларусі — у асобе другога сакратара гэтай установы Фукуда Набуюкі і прадстаўніка пасольства Марыны Астроўскай.

Японія — самая ўскрайкавая з усходніх краін, размешчаная на 4000 выспах, з якіх толькі 4 вялікія і густанаселеныя. У старажытнасці астраўное становішча было выгоднае для Японіі. Доўгі час яна заставалася непрыступнай і не ведала вонкавых войн. Яе абмінула нават спусташальнае для многіх краін мангольскае нашэсце. Мангольскі флот, які падступіў да японскіх берагоў, быў моцна пабіты тайфунам і патануў. У Японіі захаваліся шматлікія старадаўнія будынкі, храмы і палацы, гіганцкія крыптамерыі, якім больш як трыста гадоў.

Выклікае цікавасць традыцыйная ежа японцаў, начынне для чаёвай цырымоніі. Прыцягваюць увагу маскі тэатра Но, а традыцыйныя японскія лялькі ўражваюць сваім дзівосным убраннем. На выставе "Традыцыі і культура Японіі" прадстаўлены і прабацькі сусветна вядомай рускай матрошкі — невялікія драўляныя лялькі "кокэсі".

Спадар Фукуда Набуюкі падзякаваў арганізатарам выставы і выказаў надзею, што наша супрацоўніцтва будзе працягвацца.

Таццяна КАРАЕЎСКАЯ,
старшы навуковы супрацоўнік Горацкай карціннай галерэі

Ініцыятыва

Лангбард быў бы задаволены?

Добра памятаю, як 9 снежня 1981 года насупраць Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета ва ўрачыстай абстаноўцы адкрывалі помнік Максіму Багдановічу (скульптар Сяргей Вакар). Сотні людзей прысутнічалі. Сярод іх — тагачасныя кіраўнікі Урада БССР, Саюза пісьменнікаў Беларусі, розных арганізацый і ўстаноў. Як усе радаваліся, што "наш Максім" пасля столькіх гадоў неразумення ("мадэрніст", паэт "чыстае красы", стваральнік "мастацтва дзеля мастацтва"), а то і шальмавання (апалагет "дробнай буржуазіі", выразнік "контррэвалюцыйных настрояў"), нарэшце ганараваны выдатным помнікам! Ды яшчэ ў такім месцы! Лічы, у цэнтры горада, на плошчы Парыжскай Камуны, перад оперным тэатрам...

Праўда, сёй-той не мог зразумець такога суседства: Максім Багдановіч і — оперны тэатр. Яму тут жа растлумачвалі: Максім Багдановіч — адзін з нацыянальных геніяў. Помнік яму павінен стаяць на прэстыжным месцы, каб многія яго бачылі і нават той, хто мала ведае яго асобу і творчасць, даведаўся пра незвычайны лёс паэта: нарадзіўся ў Мінску, з пяці гадоў жыў у рускім асяроддзі (Яраслаўль, Ніжні Ноўгарад) і — стаў класікам беларускай літаратуры. Ён — найбольш яскравы сімвал яднання трох усходнеславянскіх народаў: беларусаў, рускіх і ўкраінцаў. Зрабіў свой унёсак не толькі ў беларускую, але ў рускую і ўкраінскую літаратуры і культуры. Апрача таго, Максім Багдановіч уваходзіць у лік самых музычных паэтаў свету — і па мелодыка-інтанацыйным ладзе вершаў, і па колькасці песень, напісаных на яго словы. "Зорка Венера", напрыклад, у Заходняй Беларусі стала своеасаблівым нацыянальным гімнам, ролю гімна яна выконвае і сярод беларусаў замежжа. Дый сам паэт быў музычна адораны, праявіў сябе як выдатны музыказнавец. Рэцэнзаваў усерасійскі часопіс "Музыкальная жизнь", "Музыкальный словарь". У навуковай спрэчцы пра характар творчасці Мусаргскага перамог нават такога музычнага карыфея, кампазітара і выдатнага музыказнаўцу, як Барыс Асаф'еў — гл. артыкул "Об интересном мнении г. Глебова" (Игорь Глебов — літаратурны псеўданім Б. Астаф'ева. — ***Рэд.***).

Некаторыя казалі: "А ці не будзе помнік засланяць тэатр?" Пасля ж убачылі: помнік сваімі параметрамі не толькі не засланяе тэатр, а, наадварот, нават узвышае яго...

З тае пары прайшло 26 гадоў. Мінчане (і не толькі мінчане) ужо і не ўяўляюць плошчу перад оперным тэатрам без Максіма Багдановіча. Амаль заўсёды на пастаменце помніка ляжаць жывыя кветкі. Да паэта нярэдка прыязджаюць шлюбныя пары, у сэрцах якіх — "ні жуды, ні нуды, толькі радасць кахання", каб сфатаграфавацца разам з ім, выказаць сваю любоў да яго букетам жывых ружаў. Падыходзяць да помніка беларускія і замежныя турысты, пакольк ён хораша завяршае невялікі пешаходны турысцкі маршрут уздоўж вуліцы Максіма Багдановіча. Бо тут жа побач — месца, дзе стаяў дом, у якім нарадзіўся паэт (пра гэта сведчыць мемарыяльная дошка; варта было б аднавіць гэты невялікі драўляны будынак), трохі далей — Траецкае прадмесце, у якім знаходзіцца выдатны музей аўтара знакамітага "Вянка".

Чаму я завёў гаворку пра ўсё гэта? Ідзе капітальны рамонт Вялікага тэатра оперы і балета. Неўзабаве партэр і тэатральныя ложы запоўняць меламаны. **І як жа хораша было б, каб да гэтага часу і сам тэатр, і плошча перад ім (дакладней — сквер) сталі называцца імем Максіма Багдановіча!** Паэт, несумненна, варты таго! Дарэчы, у тэатра ўжо ёсць і свая "багдановічаўская" візітоўка. Калісьці ў ім з поспехам ішла опера Юрыя Семянякі (лібрэта Алеся Бачылы) "Зорка Венера" — пра аўтара аднайменнага верша. Оперу маглі б аднавіць, каб пачаць ёй першы сезон у абноўленым тэатры. А пасля, магчыма, гэтай операй распачынаць і наступныя тэатральныя сезоны.

Традыцыя даваць тэатрам оперы і балета імёны выдатных нацыянальных паэтаў, пісьменнікаў — даўняя і даволі пашыраная. Імя А. Пушкіна такія тэатры носяць (або насілі) у Ніжнім Ноўгарадзе і Кішынёве, М. Чарнышэўскага — у Саратаве, Т. Шаўчэнкі — у Кіеве, І. Франка — у Львове, Абая — у Алма-Аце, Ахундава — у Баку, Наваі — у Ташкенце, Махтумкулі — у Ашгабадзе, Айні — у Душанбе, Мусы Джаліля — у Казані...

Не забудзем, што сёлета спаўняецца 95 год з дня выхаду ў свет знакамітага "Вянка". А менш як праз тры гады мы будзем адзначаць 110-ю гадавіну з дня нараджэння нашага нацыянальнага генія.

Не сумняваюся, сам І. Лангбард, паводле праекта якога быў у 1930-я гады ўзведзены будынак тэатра оперы і балета, быў бы задаволены такім рашэннем. Нездарма музу Паэзіі ён хацеў устанавіць на фасадзе тэатра.

Вячаслаў РАГОЙША,
доктар філалагічных навук, прафесар

Ад рэдакцыі

На адным з чарговых пасяджэнняў штаба па рэканструкцыі будынка Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь вялася гаворка і пра помнік Максіму Багдановічу. Вырашана перанесці яго на тэрыторыю парку, прылеглага да будынка, і дзеля гэтага манумент будзе крыху перамешчаны (сёння ён знаходзіцца на рэстаўрацыі, пераўстаноўлены будзе да Дня Незалежнасці — 3 ліпеня), а цэнтральная частка прасторы перад тэатрам застанецца вольная. Менавіта архітэктурны праект добраўпарадкавання прылеглай тэрыторыі прадугледжвае адкрытую прастору з боку цэнтральнага ўваходу ў тэатр, размяшчэнне фантана, лавак, ліхтароў.

Рэканструкцыя будынка як помніка культуры XX стагоддзя максімальна набліжаная да першапачатковага праекта архітэктара Іосіфа Лангбарда. Работы па добраўпарадкаванні тэрыторыі і афармленні фасада павінны завяршыцца да 1 верасня. Будаўніча-мантажныя работы на гэтым аб'екце плануецца закончыць да 1 снежня. Так што час, каб абмеркаваць, а, магчыма, і ўлічыць прапанову Вячаслава Рагойшы, пакуль ёсць.

Пра Лёху ды Саню і добрых анёлаў

Іван Паўлаў, выпускнік рэжысёрскага курса незабыўнага Віктара Турава, — ужо не пачатковец у кіно: зняў стужку "Свежына з салютам", быў сарэжысёрам на фільмах "Глыбокая плынь" у Маргарыты Касымавай і "Навагоднія прыгоды ў ліпені" ў Алены Туравай. І вось завершана новая самастойная работа — "На спіне ў чорнага ката".



Фільм "На спіне ў чорнага ката" зняты паводле сцэнарыя Ігара Тароцкі. Гэта яго дэбют: малады аўтар падаў свой першы сцэнарый на конкурс, які штогод праводзяць Міністэрства культуры і Нацыянальная кінастудыя "Беларусьфільм". Сцэнарый усім спадабаўся. (Дарэчы, цяпер І. Тароцка запатрабаваны як сцэнарыст на маскоўскім ды ўкраінскім кінарынках). Яшчэ падчас здымак Іван Паўлаў вызначыў жанр новай стужкі як лірычную камедыю.

"І душа чалавека, і любоў, і каханне — усё тут прысутнічае, — кажа рэжысёр. А ўвогуле гэта гісторыя пра двух дзядоў — Лёху ды Саню, якія жывуць на Палессі, у найпрыгажэйшых мясцінах ля Прыпяці. У фільме ёсць два ірэальныя персанажы, якія адыгрываюць вельмі важную ролю, — анёлы Іван і Кэт, увасобленыя акцёрамі Аляксандрам Дзянісавым і Верай Паляковай. Добры анёл Іван возіць палешукоў па сталіцы на шыкоўным белым лінкальне (адзіным у Мінску). Спрыяе цудоўным акалічнасцям анёл Кэт; — яе відавочная адметнасць — заўжды ў ботах (аналогія з вядомым казачным персанажам — Катом у ботах)... Яны апякуюць дзядоў. Спачатку дапамагаюць старым выйграць шалёныя грошы, затым выпрабоўваюць Лёху ды Саню спакусамі вялікага горада і ўрэшце дапамагаюць ім развітацца з нечаканым багаццем. Ды, у адрозненне ад фіналу казкі Пушкіна пра Залатую рыбку, нашы старыя не застаюцца ля разбітых ночваў, бо яны шчырыя, добрыя, шырокай душы людзі. Прайшлі праверку грашамі — гэткі маральны іспыт на чалавечыя якасці. Ну, а чым урэшце заканчваецца гісторыя пра двух дзядоў — гэта ўжо няхай гледачы фільма самі ўбачаць. Скажу толькі, што яго жанр дзякуючы нечаканаму фіналу памяняўся з проста камедыі на лірычную".

Цудоўныя расійскія акцёры Міхаіл Жыгалаў і Валерый Прохараў увасобілі галоўных герояў. Ёсць эпізод з Філіпам Кіркоравым, які сыграў самога сябе. Практычна ва ўсіх астатніх ролях — нашы беларускія артысты.

"Мы правялі мноства проб на ролі дзядоў, у тым ліку і сярод беларускіх артыстаў. Але мастацкі савет зацвердзіў менавіта гэтую "салодкую парачку", — працягвае Іван Паўлаў. — Міхаіл Жыгалаў і Валерый Прохараў выдатна паказалі сябе на пробах, ігралі прафесійна і смешна. У здымачны перыяд хварэлі за вынік, гісторыя пра Лёху ды Саню ім спадабалася, таму і пагадзіліся працаваць — а не проста дзеля заробку, ды і за даволі сціплы, паводле маскоўскіх мерак, ганарар. Думаю, яны ўнеслі ў стужку гумар і глыбіню".

Артыст Аляксандр Дзянісаў дзеля таго, каб сыграць ролю добрага анёла Івана, у літаральным сэнсе пераадолеў акіян: прачытаў сцэнарый, дасланы яму ў Амерыку рэжысёрам фільма, і пагадзіўся прыехаць у Мінск.

"У сюжэце ёсць пэўнае падабенства з жыццёвай гісторыяй самога акцёра, — распавядае І. Паўлаў. — Мяне ўражвае ўнутраная моц гэтага чалавека, якога я паважаю найперш як асобу. Таму ўзнікла ідэя крыху перапісаць сцэнарый, сёе-тое дадаць і наблізіць персанаж да рэальнага лёсу яго выканаўцы. А жыццёвая гісторыя Аляксандра Дзянісава такая. 17 гадоў таму ён быў досыць паспяховым акцёрам Купалаўскага тэатра (лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР за ролю Дугіна ў "Радавых" Аляксея Дударава), які плённа здымаўся ў кіно (бадай, самая вядомая яго роля на экране — матрос Гамаюн з серыяла "Дзяржаўная мяжа"). Аднак дзеля ўратавання жыцця хворай дачкі, якой не змаглі дапамагчы ў СССР, з'ехаў разам з ёю ў Амерыку. Уратаванай дачцэ ўжо 27 гадоў... Я вельмі рады вяртанню Аляксандра Дзянісава на кінаэкран праз амаль два дзесяцігоддзі".

Здымалі фільм на мінскіх вуліцах і на Палессі. У стужку арганічна ўвайшлі кадры сапраўднага свята горада, на якім пабывалі дзяды. Лёха ды Саня настолькі арганічна ўвайшлі ў святочны натоўп гараджан, што некаторыя кадры нават нагадваюць здымкі схаванай камерай. Героі асвойваюць атракцыёны ў парку імя М. Горкага, цір у парку Чалюскінцаў. Ускладаюць кветкі да танка на пастаменце, бо і самі ў мірны час служылі ў танкавых войсках, а на свята горада прыпаў яшчэ і Дзень танкіста... Зрэшты, усе гэтыя неверагодныя прыгоды палешукоў у Мінску можна будзе неўзабаве пабачыць на экране і тады ўжо меркаваць, наколькі захапляльным і павучальным атрымаўся аповед.

Аляксандр ДЗМІТРЫЕЎ

На здымку: галоўныя героі фільма, увасобленыя Міхаілам Жыгалавым і Валерыем Прохаравым.

Фота аўтара

Толькі для дарослых

Казка! Толькі не для дзяцей, а для дарослых. Прычым, прынадная найперш для эстэтаў, музычных гурманаў. Ці проста — для здатных адгукнуцца на прыгожае, адчуць і ацаніць рэдкасны "колераві слых", якім быў адораны кампазітар Мікалай Рымскі-Корсакаў і які напоўніцу выявіўся ў казачна маляўнічай партытуры гэтай аднаактовай оперы. "Кашчэй Бессмяротны" — восеньская казачка, як пазначыў свой твор сам М. Рымскі-Корсакаў, — у ліку сёлетніх прэм'ер Нацыянальнага акадэмічнага тэатра оперы Беларусі. Маленькі шэдэўр опернай класікі, створаны кампазітарам на ўласнае лібрэта (паводле плана Я. Пятроўскага), атрымаў новае сцэнічнае жыццё пад музычным кіраўніцтвам дырыжора Івана Касцяхіна, у рэжысуры Галіны Галкоўскай і мастацкім афармленні Любові Сідзельнікавай. "Кашчэй Бессмяротны" — даволі змрочная фантастыка з мудрагелістым філасофскім падтэкстам, па-рэжысёрску нечаканым фіналам ("чорны гумар" безвыходнасці? кругазварот злых стыхій у прыродзе?). І з яскравымі персанажамі.

Святлана БЕРАСЦЕНЬ

На здымках: Іван-Каралевіч (Ілья Сільчукоў), Кашчэеўна (Аксана Волкава); Кашчэй Бессмяротны (Эдуард Мартынюк).

Фота Аляксандра Дзмітрыева

Прысуд

Вёска Стальбоўшчына знаходзіцца за дванаццаць кіламетраў ад Узды. У час вайны многія юнакі папоўнілі рады партызанскай брыгады імя Варашылава, а адзін з жыхароў капітан Мікалай Курыльчык нават стаў камандзірам партызанскай брыгады № 101 імя Аляксандра Неўскага.

Аднойчы ля помніка чырвонаармейцам, партызанам і мірным жыхарам, якіх расстралялі у час вайны фашысты, былыя партызаны сустрэліся са здраднікам, які адседзеў свой тэрмін у турме і вярнуўся ў вёску. Паміж імі адбылася гутарка.

Стахно Іван з суседняй вёскі Замосце, Дземідовіч Мікалай са Стальбоўшчыны і былы здраднік, не буду называць яго прозвішча, рашылі пагутарыць, як жыць далей. Зайшлі ў краму, узялі гарэлкі, закускі і выйшлі на двор.

— Хадзем, хлопцы, у кусты, прыгадаем былое, — сказаў былы паліцай.

— Хадзем пагамонім, — згадзіўся Іван Стахно.

— У кусты дык у кусты, — дадаў Дземідовіч. — Нам не прывыкаць сядзець у кустах і падпільноўваць фашыстаў і іхніх халуёў.

Былы здраднік адчуў пагрозлівыя ноткі ў голасе суседа.

— Забудзем, землякі, аб мінулым часе. Нам жа жыць разам, у адной вёсцы... Сустракацца на адных сцежках.

Падышлі да помніка.

— Спынімся, Коля, — прапанаваў Стахно. — Няхай прачытае гэты вылюдак прозвішчы тых, каго ён застрэліў.

— Я нікога не забіваў. Гэта эсэсаўцы, — дрыжачым голасам сказаў гітлераўскі паслугач.

— Хату нашу таксама не падпальваў?! — павысіў голас Іван.

— Не падпальваў. Гэта немцы.

— Немцы ведалі нашу хату і сядзібы іншых партызан Замосця?! — спытаў Стахно.

Здраднік маўчаў, мабыць, адчуваў і сваю віну.

— Не кіпяціся, Ваня, — сказаў Дземідовіч. — Мы ж у кусты ідзём. Вып'ем па чарцы, тады ўсё і скажам, што думаем.

Спыніліся ля фундамента спаленай немцамі школы. На руінах павырасталі бярозкі. Былы здраднік паставіў пасярэдзіне бутэльку, чарку, паклаў пачак пячэння, жменю цукерак. Стахно таксама дастаў бутэльку, прыладкаваў збоку.

— Наліваў, Коля, — прапанаваў здраднік. — Вып'ем міравую. Мы ж землякі, аднагодкі. Разам на вечарынках гулялі...

— Мне наліваў з маёй бутэлькі. З паліцэйскай піць не буду, — сказаў Стахно.

— Чаму, Ваня? Яны ж аднолькавыя, разам жа ў краме бралі, — пачырванеў былы нямецкі прыхвасцень.

— Розніца ёсць, вялікая розніца! Тваю ты трымаў у сваіх руках, а яны кроўю расстраляных людзей пахнуць.

— Я адмыў іх турмой. Думаеш, нас там па галоўцы гладзілі? І бізунамі білі, і кухталёў хапала. Жыць не хацелася.

— Кроў нявінных людзей да скону дзён не адмыеш... Хату маю паказваў немцам? Добра яшчэ, што мама і сястра схаваліся ў суседзяў. А Ціта і яго трох маленькіх дзяўчынак зможаш ажывіць? Зможаш адмыцца?

— Не гарачыся так, Ваня. Нам яшчэ много чаго прыгадаць яму трэба, — супакойваў сябра Дземідовіч.

Былы паліцай маўчаў. Думаў памірыцца з аднагодкамі, а тут порахам запахла.

— А яўрэяў у Стальбоўшчыне ў 1941 год хто расстрэльваў? Там немцаў не было...

— Нас староста прымушаў.

— Чаму ж ён мяне не прымусіў?

— Ты ж у паліцыі не служыў.

— А ты каму служыў? Немцам, фашыстам, якія хацелі зрабіць нас рабамі. А хто камуніста і яго сям'ю ля Ластаўшчыны расстраляў?! Ты там быў, ведаю.

Маўчаў здраднік. Хлопцы працягвалі ўспамінаць.

— Хто настаўніцу расстраляў? Яна ж з Брэста дадому на Гомельшчыну прабіралася.

— Разам стралялі па камандзе старасты. І ён страляў.

— Страляў, каб вас яе кроўю запэцкаць, у воўчую зграю зацягнуць, — гаварыў Стахно.

— А ў Астраўку хто ўсіх жыхароў знішчыў? Там жа ўся ўздзенская паліцыя была. І ты быў, — прадоўжыў Дземідовіч.

— Быў. Нас у ачапленне паставілі, каб ніхто не ўцёк.

— Немцы выкарыстоўвалі вас, як ганчакоў. Які грэх, Божа! Тваё нутро цяпер да касцей запэцкана. Не.. Не адмыўся ты ў турме і не адмыешся. Ніколі не адмыешся! На помніку прозвішчы 94 землякоў высечаны.

— Рана цябе выпусцілі з турмы. Расстраляць, ваўкалак, цябе мала. Прывязаць бы голым у лесе, каб камары цэлымі суткамі кроў тваю фашысцкую смакталі...

— Што мне прысудзілі, я адседзеў. Дзянёк у дзянёчак. Улада злітавалася: ідзі, працуй, не грашы. Жыві спакойна, сказалі.

— Спакойна, кажаш?! Не атрымаецца! Мы ж цябе вайной да смерці прысудзілі, — сказаў Дземідовіч. — Ты ад маёй кулі ўцёк, калі засаду ля вёскі рабілі... Я пакляўся тады прывесці партызанскі прысуд у выкананне, дзе б ні сустрэў цябе. І стрымаю клятву. Слова даю! Партызанскае!

— Правільна, Коля! Нашы людзі павінны дыхаць чыстым паветрам. Смерць паліцаям!

Здраднік спужаўся, усхапіўся на ногі, як падсмалены.

— Прэч адсюль! І гарэлку забяры! — крыкнуў Дземідовіч.

— Выпівайце! — гукнуў ужо здалёк ваўкалак.

— Ні цябе, ні тваёй гарэлкі не хочам! — крыкнуў Стахно, падняў бутэльку і разбіў аб камень.

* * *

Праз два дні былы здраднік знік з вёскі, больш яго тут ніхто ніколі не бачыў. Прапаў, як мыльная бурбалка...

Васіль ГУРСКІ

Пакет

Далучыўшыся разам з сябрамі-падпольшчыкамі (а іх было дванаццаць адважных хлопцаў, якія не раз удзельнічалі ў баявых аперацыях разам з партызанскімі разведчыкамі, у першую чаргу са злучэнняў Камарова, нашага мясцовага атрада "За Радзіму", злучэнняў Баці і нават Сабурава і Каўпака), да ўсенароднай барацьбы з фашыстамі, мы хацелі прадаўжаць падпольную работу ў роднай вёсцы Малы Малешаў, але начальнік разведкі партызанскай брыгады Каяфюк папярэдзіў: "Не, трэба ісці ў лес, бо пра вашу арганізацыю пагаворваюць аж у тураўскай жандармерыі і рыхтуюцца нечакана разграміць яе".

Дамовіліся і пагадзіліся: усёй камсамольска-маладзёжнай групай уліцца ў партызанскую брыгаду "Савецкая Беларусь" Пінскага злучэння, якую ўзначальваў легендарны Васіль Захаравіч Корж (Камароў). 15 мая 1943 года мы былі ўжо ў лагеры, у атрадзе імя Валерыя Чкалава. Вядома, не заседжваліся ў зямлянках, а адразу ўключыліся ў барацьбу. Я, напрыклад, паспеў ужо пабываць на "жалезцы" Лунінец — Сарны. Нягледзячы на тое, што немцы

Сустрэча з чырвонаармейцамі... Якая яна была цікавая! Ніхто нават не дакрануўся да ложкаў, на якіх нам прапанавалі адпачыць з вялікай дарогі. Не было канца сардэчным размовам. Адны цікавіліся дзейнасцю партызан, другія — жыццём армейцаў. Запісвалі песні, разам выконвалі іх. Будынак гудзеў. Ніхто не заснуў аж да самага вечара.

густа расставілі на чыгунцы вартавыя буданы, мы здолелі пусціць пад адхон аж шэсць варожых эшалонаў з жывой сілай і тэхнікай, якія накіроўваліся на ўсход. На чыгунку ішлі цэлым узводам аўтаматчыкаў. Наш узводны загадваў мне заўсёды лажыцца паміж рэек, бліжэй да будана, у якім фрышы, каб не заснуць, падвыпіўшы шнапсу, гарланілі песні. Я ж быў настроены ў любую хвіліну паслаць ім аўтаматныя чэргі, калі паспрабуюць вылезці адтуль. Але ўсё абыходзілася. Толькі тады, калі цягнікі ляцелі пад адхон, немцы адкрывалі бязладную страляніну. У вольныя дні пісаў вершы. Змяшчалі іх у сценгазеце, а таксама ў партызанскай газеце, якая выдавалася пры штабе Пінскага злучэння, пад псеўданімам Дубровін.

Аднойчы, пад канец восені 1943 года ў нашу зямлянку зайшоў пасыльны і, звярнуўшыся да нас, спытаў: "Хто з вас Клімовіч? Выклікае камандзір брыгады!". Хлопцы, што былі ў зямлянцы, пажартавалі: "Ідзі, ідзі, атрымаеш там "падзяку" ад камандзіра!"

З камбрыгам, капітанам П. Тамілавым, не раз сустракаўся, калі ўзначальваў падполле. З ім мяне пазнаёміў Каяфюк. Гэта было на беразе Прыпяці. Мы, падпольшчыкі, перавозілі на лодках групу партызан на левы бераг ракі, адкуль яны накіраваліся да Князь-возера, дзе іх чакалі дзяўчаты-масквічкі, якія былі прызначаны ў нашу брыгаду: адна радысткай, другая — медсястрой.

Калі ўвайшоў у штабную зямлянку, акрамя камбрыга там прысутнічаў і сам камісар брыгады І. Сматроў.

— Партызан Клімовіч прыбыў па вашым выкліку!

— Добра, добра, — прамовіў камісар. — Прысядзь. Ведаеш, Клімовіч, мы цябе пасылаем на адказнае заданне. Пяройдзеш лінію фронту і асабіста ўручыш пакет самому камандуючаму арміяй. Дам табе падмогу — партызана Касінскага. Яму крыху знаёма мясцовасць, дзе знаходзіцца штаб арміі, — гэта ва Украіне, у г. Оўручы, што на Жытоміршчыне. Другі партызан Шчавінскі, паляк. Заўтра раніцой прыйдзеш да нас, атрымаеш пакет. Сустрэнешся са сваімі памагатымі-спадарожнікамі. Дадзім вам па кані. Праўда, прыйдзецца ехаць без сёдлаў. Даедзеце да вёскі Букча, што на Тураўшчыне, здадзіце коней нашаму старасту, а там пёхам аж да лініі фронту. Толькі нікому ні слова.

Назаўтра мы, узнёслыя, бадзёрыя, ехалі па лясной дарозе, якая перасякала агромністую пушчу. Дабраліся да Букчы. Самой вёскі не было. Дзе-нідзе толькі тырчэлі каміны. Адразу было відаць, што тут "пагаспадарылі" фашысты. Далей ад папялішча, у лясных гушчарах, — зямлянкі, шалашы. Тут мы здалі коней старасту, партызанскаму сувязному. Разгаварыліся з ім. Разумны, кемлівы мужык. Шмат чаго пабачыў і перажыў. Староста пацікавіўся, куды я сабраўся. Адказаў, што іду на заданне. Мне хацелася папрасіць яго, калі не вярнуся, каб ён паведаміў маім бацькам і жонцы, але памятаў камандзірскае папярэджанне. Пераначаваўшы, рушылі па знаёмай мне дарозе. Не ўзрадавала яна нас. Вёска Тонеж таксама дашчэнту зруйнавана, а ў царкве фашысты спалілі больш двухсот жыхароў.

Па дарозе замест вёсак — папялішчы. Няма ні Сіманавіцкага Млынка, ні Данілег, ні Слабады, ні Дубніцкага, ні Сіманавіч, ні саміх Лельчыц. Пуста аж да Мазыра. Людзі з гэтых вёсак туліліся ў лясах, які стаў адзіным ратункам, сховай. Хто ўцалеў ад расправы, не скарыліся ворагу, прадаўжалі жыць і змагацца...

З-пад Лельчыц мы перабраліся на правы бераг Убарці, павярнулі крута на поўдзень, на Ельск, і, нарэшце, на Украіну. Там таксама адны папялішчы. І толькі перад самым Оўручам стаяла вялізная вёска, некранутая пажарам. Нават і цяпер праз столькі гадоў памятаю, што яна называлася Пясчаніца. Мы аказаліся за лініяй фронту. Гэта быў ужо савецкі тыл. Так удала нас правялі мясцовыя праваднікі: не бачылі ні немца, ні чырвонаармейца. Ідучы па вуліцы Пясчаніцы, сустрэлі трох асабістаў. Яны пацікавіліся, хто мы і куды ідзём. Пасадзілі ў машыну і давезлі да будынка, у якім знаходзіўся штаб арміі. Ля брамы — паставы. Я звярнуўся да яго, каб далажыў свайму начальніку, што прыйшла партызанская група аж з Піншчыны для сустрэчы з камандуючым арміяй. Імгненна выйшаў ад'ютант, але хутка вярнуўся назад і паведаміў, што загадана, каб нас пакармілі, звадзілі ў лазню і адвялі ў памяшканне, дзе знаходзіўся каменданцкі ўзвод, каб мы там адпачылі.

Сустрэча з чырвонаармейцамі... Якая яна была цікавая! Ніхто нават не дакрануўся да ложкаў, на якіх нам прапанавалі адпачыць з вялікай дарогі. Не было канца сардэчным размовам. Адны цікавіліся дзейнасцю партызан, другія — жыццём армейцаў. Запісвалі песні, разам выконвалі іх. Будынак гудзеў. Ніхто не заснуў аж да самага вечара. Заўважыў, што камандзіру ўзвода спадабалася мая люлька, на якой выгравіравана галава Мефістофеля. Падарыў яе яму ў знак сяброўства. З якім задавальненнем ён, насыпаўшы ў яе махоркі, закурыў. І раптам, пакапаўшыся ў сваім рэчмяшку, дастаў адтуль цудоўны венгерскі бінокль. І, аддаючы яго мне, зазначыў:

— Будзеш лепш углядацца, як немчура драпае ад партызанскага націску. Бяры, ды памятай франтавіка, а пасля вайны дзецям сваім раскажаш.

Атрымалі падарункі на памяць і Касінскі, і Шчавінскі. Распытвалі чырвонаармейцы ў апошняга, бравага дзядулі, аб тым, як ён, царскі афіцэр, стаў савецкім партызанам, на што той з гонарам адказаў:

— Жукаў таксама быў царскім афіцэрам, ды нават Георгіеўскі крыж атрымаў. Ён не за цара ваяваў, а Айчыну абараняў.

Хлопцам з каменданцкага ўзвода вельмі хацелася, каб Шчавінскі заспяваў сваю любімую польскую песню. А назаўтра раніцой мы былі ў штабе. Дзверы ў свой кабінет адчыніў сам генерал. Мы не паспелі прамовіць і слова, як ён першы павітаўся. А Шчавінскі, як толькі ўбачыў генеральскія пагоны, стаў у струнку і адрапартаваў:

— Таварыш генерал-палкоўнік! Партызанская група па загадзе нашага камандавання прыбыла!

Генерал задаволена пахваліў дзеда тройчы:

—Молодец, отец! Ай, молодец! Вот это партизан!

Кабінет камандуючага прасторны, на расстаўленых сталах рассцелены карты. Перад тым, як сесці, дастаў з кішэні пакет, урачыста аддаў генералу і вусна, слова ў слова, перадаў усё тое, аб чым мяне прасілі камбрыг з камісарам.

Па дарозе з Оўруча далятала гарматная кананада — нашы наступалі на Жытомір. Вярталіся ў лагер задаволеныя тым, што сустрэча з камандуючым арміяй была карыснай. Мы цвёрда верылі: разгромім ворага ўшчэнт, перамога не за гарамі. На адзінаццаты дзень пахода сядзелі ў штабной зямлянцы камбрыга. Ён і камісар брыгады адзначылі, што заданне мы выканалі паспяхова. Камбрыг паабяцаў: "Чакайце, хлопцы, узнагароды!". І сапраўды, усе трое атрымалі медалі "За адвагу".

— Ці ведаеш, Клімовіч, каму ты перадаў пакет? — пацікавіўся камбрыг.

— Так точна, ведаю! Камандарму 60-й арміі, Івану Данілавічу Чарняхоўскаму, генерал-палкоўніку.

Пад камандаваннем І. Д. Чарняхоўскага, двойчы Героя Савецкага Саюза, ужо ў званні генерала арміі, былі вызвалены Віцебск, Орша, Барысаў, Гродна, Мінск, Прыбалтыка. Але, на вялікі жаль, генерала арміі смяротна паранілі пад Кёнігсбергам.

Пазней, пасля вайны, ужо з гісторыі Вялікай Айчыннай вайны даведаўся, што гэтаму палкаводцу, самаму маладому, Вярхоўны галоўнакамандуючы даверыў камандаваць трэцім Беларускім фронтам, які разам з першым і другім Беларускімі франтамі ўдзельнічаў у наступальнай аперацыі "Баграціён". Пад камандаваннем І. Д. Чарняхоўскага, двойчы Героя Савецкага Саюза, ужо ў званні генерала арміі, былі вызвалены Віцебск, Орша, Барысаў, Гродна, Мінск, Прыбалтыка. Але, на вялікі жаль, генерала арміі смяротна паранілі пад Кёнігсбергам. Дарэчы, пад гэтым горадам загінуў мой брат Даніла, а брат Рыгор дайшоў да Берліна. Я ж быў цяжкапаранены пад Пінскам, служыў у мінроце 37-га гвардзейскага палка 12-й гвардзейскай дывізіі 61-й арміі першага Беларускага фронту. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, баявымі медалямі "За адвагу", "За баявыя заслугі" і "За Перамогу над фашысцкай Германіяй", шматлікімі юбілейнымі медалямі.

Мікола КЛІМОВІЧ,
інвалід Айчыннай вайны,
журналіст

Слуцкія фотапаштоўкі

Наўрад ці сёння знойдзецца той аматар айчыннай старасветчыны, хто не звярнуў бы ўвагу на старыя фотапаштоўкі. На іх можна ўбачыць і знаёмыя краявіды з адлегласці ў сотню гадоў, і незваротна страчанае. Для Слуцка, які ў выніку войнаў і дзейнасці чалавека фактычна не захаваў відавочных прыкмет мінуўшчыны, старыя паштоўкі ўвогуле з'яўляюцца дакументамі унікальнымі.



Папулярнасцю фотапаштоўкі карыстаюцца і ў наш час. Так, у 2006 годзе да Дня горада слуцкай друкарняй быў выдадзены камплект з пятнаццаці каляровых паштовак з краявідамі горада, а годам раней, да "Дажынак-2005", якія праводзіліся ў Слуцку, з'явіўся камплект з дванаццаці паштовак, для іх выкарыстаны здымкі сямі фотамайстроў, у тым ліку і мясцовых. Камплекты сталі сапраўдным падарункам для філакартыстаў, асабліва калі мець на ўвазе, што на працягу 1920 — 1990-х гадоў пабачыла свет усяго лічаная колькасць прысвечаных горада паштовак. Асаблівую цікавасць з іх сёння выклікаюць тыя, што падрыхтаваны на мяжы 1920 — 30 гадоў Слуцкім краязнаўчым таварыствам. Лаўры першаадкрывальніка слуцкай тэматыкі ў згаданай справе, між тым, належаць слуцкаму фатографу Саміру Юхніну, які выпусціў серыю фотапаштовак амаль сто гадоў таму.

Аб'ектыў майстра не абмінуў увагай ні адзін значны або адметны матыў. Зроблены здымкі мясцовых храмаў і навучальных устаноў, адлюстраваны гарадскія панарамы і галоўныя вуліцы, побытавыя гарадскія і вясковыя сцэнкі.

Выдадзеныя Юхніным паштоўкі цяпер захоўваюцца ў фондах музеяў і архіваў, іх збіраюць калекцыянеры. А тое, што пасля першага выдання Юхнін паўтарыў яго яшчэ два разы, сведчыць пра тое, што і ў свой час яны карысталіся папулярнасцю.

Па шмат якіх прыкметах, адлюстраваных на фотапаштоўках, часам першага выдання можна назваць перыяд 1910 — 1912 гадоў. Другое выданне, несумненна, з'явілася да пачатку Першай сусветнай вайны — у перыяд 1912 — 1914 гадоў. Нездарма, як і ў ранейшым выпуску, тут выкарыстаны надпісы і па-руску, і па-польску, а месцам выдання стаў горад у Прусіі. Трэцяе выданне пабачыла свет у 1915 — 1917-я гады, калі ішла вайна. З 1915 года Слуцк стаў прыфрантавым горадам і Юхнін, рыхтуючы гэты выпуск, не разлічваў на польскамоўнага спажыўца, таму абмежаваўся толькі рускамоўным варыянтам надпісаў. Немагчыма было карыстацца і паслугамі ранейшых выдавецтваў, бо яны аказаліся па іншы бок фронту. Афармленне адваротнага боку ўсіх паштовак трэцяга выдання аднолькавае, некаторыя з іх не маюць абазначэння выдавецтва, іншыя пазначаны Расійскім аддзелам Сусветнага паштовага саюза. Несумненна, што неспрыяльнымі ўмовамі, выкліканымі ваенным часам, тлумачыцца і асаблівасць друкарскага выканання, якое не ішло на карысць вонкаваму выгляду паштовак.

Прыкладна пяць гадоў раздзяляе першае і трэцяе выданні, і рыхтуючы апошняе, Юхнін замест некаторых сюжэтаў уводзіў новыя, якія лічыў для адлюстравання больш вартымі. У першую чаргу ён пазбаўляецца ад агульных панарам вуліц і замест іх падае аб'екты больш дакладныя. Напрыклад, на паштоўцы № 6 першага выдання бачым забудову вуліцы Шасейнай, а ў трэцім — пад тым жа нумарам паказана вуліца Трайчанская з будынкамі духоўнага вучылішча і ўваходнай манастырскай брамай; паштоўка № 7 першага выдання паказвае вуліцу Выгоду з подпісам, што гэта ўезд у горад з поўдня. Той жа від знаходзім у серыі другога выдання. У трэцім яго няма, пад № 7 ужо бачым жаночы пансіён.

Фатографа Юхніна на пачатку XX стагоддзя ў горадзе ведалі добра, аднак да нашага часу звестак пра майстра захавалася мала. Перш за ўсё, гэта кароткія тэксты на кардонных паспарту яго фотаздымкаў. Дзякуючы ім, а таксама зробленым у апошнія часы знаходкам даследчыка гісторыі беларускай фатаграфіі Надзеі Саўчанкі, можна зрабіць кароткі агляд жыцця і творчасці знакамітага слуцкага фатографа.

Самір Львовіч Юхнін не быў карэнным случаком. У горад ён прыехаў з Віцебска ў 1896 годзе ва ўзросце дваццаці шасці гадоў. Адкрыў фотасалон, які спачатку размяшчаўся ў арандаваным памяшканні, а потым ва ўласным доме на вуліцы Шасейнай. З'явілася сям'я, нарадзіліся сын і дачка.

Здымкі Юхніна, як гарадскія краявіды, так і салонныя фотапартрэты, адрозніваюцца класічнай выверанасцю кампазіцыі, выдатнай якасцю выканання. І гэта невыпадкова, бо ён сачыў за развіццём фотамастацтва, а паспяховы ўдзел у выставе 1907 года ў бельгійскім Антверпене, дзе яго работы былі адзначаны залатым медалём, сведчыць аб еўрапейскім ўзроўні творчасці майстра. На наступны год яго работы былі адзначаны і на радзіме — атрымалі пахвальны водгук на Слуцкай сельскагаспадарчай выстаўцы. Пасля рэвалюцыі ён захапіўся папулярнай у тыя часы краязнаўчай работай, рабіў здымкі сялян, новага сялянскага быту, помнікаў мясцовай архітэктуры. Аднак у 1927 годзе быў арыштаваны органамі АГПУ і ў красавіку 1928 года высланы ў горад Уладзімір. Там сляды фотамайстра губляюцца.

Той, хто знаёміцца з творчай спадчынай Саміра Юхніна, безумоўна, адзначыць, што галоўнай працай, дзякуючы якой ён у першую чаргу і ўвайшоў у гісторыю беларускага фотамастацтва, стала серыя фотапаштовак. Нягледзячы на тое, што фотапаштоўкі з відамі Слуцка з'яўляліся і пазней, тым не менш, як па колькасці экземпляраў і ахопу панарамы гарадскога жыцця, так і па майстэрстве выканання першая ў гісторыі Слуцка серыя фотапаштовак дагэтуль застаецца непераўзыдзенай.

Ігар ЦІТКОЎСКІ
Слуцк

На памежжы бязмежнага слова

Жоўта-блакітная самапіска з надпісам «Валынская дзяржаўная тэлерадыё-кампанія» — падарунак валынскіх тэлевізійшчыкаў — нібыта сама прыгадвае светлыя моманты двухдзённага літаратурнага свята ва ўкраінскім Луцку, на якім так хораша сябе паказалі ды суседзяў паслухалі пісьменнікі Валыні, Люблінскага ваяводства ды нашай Брэстчыны.

Пісьменніцкае сяброўства паміж суседнімі рэгіёнамі Беларусі і Украіны доўжыцца ўжо каля паўвека, яго запачаткоўваў яшчэ незабыўны Уладзімір Калеснік. Цяпер яно выходзіць на новы якасны ўзровень.

Загалоўнай часткай літаратурнага форуму стаўся афіцыйны прыём у абласной дзяржаўнай адміністрацыі, дзе пісьменнікаў павіталі і браславілі на плённую супольную працу кіраўнікі абласной адміністрацыі і абласной Рады Мікола Раманюк ды Анатоль Грыцук. Тут адбылася і грунтоўная размова пра канкрэтныя накірункі далейшых узаемаадносін, якія неўзабаве выліліся ў шырокамаштабнае пагадненне аб супрацоўніцтве.

Адразу пасля прыёму адбылася экскурсія па старым Луцку. Далей — рабочая сустрэча пісьменнікаў у медыя-цэнтры, дзе ішла нязмушаная гутарка пра стан спраў у пісьменніцкіх суполках рэгіёнаў, пра перакладчыцкія мажлівасці; гучалі прапановы наконт удасканалення літаратурнага супрацоўніцтва.

Завяршыўся першы дзень творчай вечарынай «На быстрыні слова і часу» ў Валынскім абласным тэатры лялек. Прыемна здзівіла поўная зала аматараў прыгожага слова, якія з непрыхаванай увагай лавілі кожнае слова выступоўцаў. А іх было не так і мала. З беларускага боку чыталі свае арыгінальныя і перакладныя творы аўтар гэтых радкоў, Іван Мельнічук, Аляксей Філатаў ды Ярына Дашына, з польскага — Войцэх Пестка, Збігнеў Фрончэк ды Кшыштаф Колтун, з украінскага Ніна Горык, Ганна Баграна, Васіль Гэй, Іван Чарнецкі і многія іншыя... Вечарына працягвалася некалькі гадзін.

Наступны дзень стаўся не менш насычаным справамі і падзеямі. Пасля афіцыйнай сустрэчы бакоў у тым жа медыя-цэнтры ў прысутнасці дзесяткаў журналістаў, у тым ліку прадстаўнікоў тэлерадыёаб'яднанняў, адбылося падпісанне Пагаднення аб супрацоўніцтве.

Жоўта-блакітная ручка з задавальненнем выводзіць на паперы шчырую ўдзячнасць арганізатарам фэсту: найперш старшыні Валынскай абласной арганізацыі Нацыянальнай суполкі пісьменнікаў Украіны Ніне Горык, а разам з ёю і экс-старшыні Васілю Гею, кіраўніцтву вобласці... Ручка выводзіць радкі, а побач россыпы прывезеных ад суседзяў кніг: валынскі літаратурны альманах "Свіцязь", альманах сучаснай украінскай літаратуры "Новая проза", "Трэцяе жаданне" Вольгі Ляснюк, "Чарнеслоў" Валянціны Штынько, "Між багамі і намі" Ганны Багранай з Кіева, "Яварнік" Васіля Гэя, "Верасень" Ніны Горык, "Сцежкі дахаты" Андрэя Бандарчука, "Тайнапіс цішы" Надзеі Гумянюк, "Грыбны дождж" Міколы Мартынюка... А яшчэ ж асобным стосам — польскія выданні. Ёсць з чаго выбіраць для перакладаў. І яны абавязкова будуць, праца ўжо распачалася. Неўзабаве, ужо сёлета, яна ўвасобіцца ў дзве кнігі, з якіх украінцы будуць чытаць беларусаў на сваёй мове, а беларусы ўкраінцаў — на сваёй. Украінскі бок узяўся прафінансаваць абодва выданні. А там — новыя справы, новыя сустрэчы. Ёсць цвёрдае спадзяванне, што наступная сустрэча адбудзецца ў нас на Берасцейшчыне.

Анатоль КРЭЙДЗІЧ

Юбілей

Маленькія акенцы ў вялікі свет

Так склалася жыццё. Летам у далёкім 1950 годзе група выпускнікоў Магілёўскага настаўніцкага інстытута папрасілася, каб размеркавалі іх на Краснапольшчыну. Сярод іх былі чатыры выхаванцы Наваельненскай сярэдняй школы і юнак з Міншчыны Аляксандр Марзалюк. То быў хоць і цяжкі пасляваенны час, але поўны рамантыкі і спадзяванняў.

Аляксандр Іванавіч па волі лёсу накіраваўся ў Гніліцкую сямігодку. Цёпла і па-бацькоўску сустрэў яго дырэктар-франтавік Р. Чарткоў. Аб нейкіх там кватэрах з усімі выгодамі ніхто тады і не думаў. Рыгор Паўлавіч уладкаваў Шурыка на кватэру да добрага чалавека, гаспадара і дбайнага сем'яніна Рамана Міхайлава. У яго і атрымаў сапраўдную школу сямейнага жыцця, якая надзвычай спатрэбілася Аляксандру Іванавічу ў далейшым.

А на педагагічным савеце далі добрую нагрузку па рускай мове і літаратуры. Атрымалася 27 гадзін. У дадатак яшчэ і класнае кіраўніцтва ў 6-м класе.

Але па сваёй прыродзе цікаўны і ўпарты Аляксандр Іванавіч цягнуўся да гістарычных ведаў. Перш-наперш ён пазнаёміўся з гісторыяй стварэння школы. Высветліў, што свой пачатак яна бярэ ў далёкім 1908 годзе, калі ў вёсках Бірулі і Гніліца на Краснапольшчыне былі адкрыты трохкласныя земскія вучылішчы. На пасяджэнні Чэрыкаўскай павятовай управы ў лістападзе было адзначана: "Член управы далажыў, што адкрытыя ў 1908 годзе земскія вучылішчы ў вёсках Бірулі, Вепрын і Гніліца знаходзяцца ў складаных умовах. Гніліцкае вучылішча, напрыклад, месціцца ў хатцы памерам 7х1 аршын, з маленькімі акенцамі. Яна не дагледжана, у ёй заўсёды холадна. Памяшканне Бірулеўскага яшчэ ў горшым стане. Адшукаць у вёсках лепшыя памяшканні не прадстаўлялася магчымым".

Потым было прынята рашэнне аб закрыцці вучылішча, па прычыне кепскіх умоў навучання. Але па просьбе вяскоўцаў школа не была закрыта, жыла і працавала, вучыла сялянскіх дзяцей. Першым настаўнікам з тутэйшых мясцін быў Іосіф Шапавалаў. Дырэктар Рыгор Паўлавіч Чарткоў адразу адчуў, што з Аляксандра Марзалюка атрымаецца неблагі настаўнік гісторыі і як мог дапамагаў прабіваць яму шлях да навукі. Калі восенню 1950 года яго прызвалі на вайсковую службу, то па-бацькоўску параіў вярнуцца ў свой педагагічны калектыў. Што Аляксандр і зрабіў пасля дэмабілізацыі. А потым зноў была вучоба ўжо на гістарычным факультэце. Малады настаўнік імкнуўся да спасціжэння гістарычнага мінулага, да ўладкавання сямейнага быту. Яму пашанцавала са спадарожніцай жыцця — жонкай, з якой ужо больш паўвека крочаць разам. Кацярына натхняла свайго Сашаньку на добрыя справы. Нарадзіла яму трох цудоўных дзетак, у тым ліку сына Ігара, цяпер доктара гістарычных навук, загадчыка кафедры археалогіі і спецыяльных дысцыплін Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А. Куляшова.

Сёння ўжо не Гніліцкая сямігодка, а Ленінская агульнаадукацыйная сярэдняя школа рыхтуецца да векавога юбілею. Аляксандр Іванавіч Марзалюк стаў слынным краязнаўцам Краснапольшчыны, стварыў цудоўны гістарычны музей. Дасягнуты поспех і на высакароднай ніве навучання і выхавання. Са сцен школы выйшла нямала славутых людзей. Яшчэ да рэвалюцыі 1917 года яе закончыў Герой Савецкага Саюза Апанас Дзмітрыевіч Шамянкоў, які прайшоў шлях ад панскага парабка, шахцёра Данбаса, радавога лейб-гвардзейскага палка царскай арміі, а пасля чырвонагвардзейца, затым генерала, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны.

Закончыў школу і Сцяпан Васільевіч Шэвелеў. Ён тройчы сустракаўся з Н. Крупскай, доктар хімічных навук, прафесар, ветэран Вялікай Айчыннай вайны.

Сцяпан Іванавіч Кухараў вучыўся ў Гніліцкай сямігодцы ў 6 класе. Ён вядомы беларускі пісьменнік, удзельнічаў у Вялікай Айчыннай вайне, паставіў свой подпіс воіна-пераможцы на сцяне рэйхстага ў Берліне ў 1945 годзе, а пасля праславіў родную Краснапольшчыну і вёску Стайкі ў аповесцях "Бацькавічы", "Зорка Канікула", "Сцішанае поле", у шматлікіх апавяданнях і нарысах.

Выпускнік школы і акадэмік, сын былога дырэктара школы Валерый Рыгоравіч Чарткоў, быў прэзідэнтам Магілёўскай асацыяцыі прамыслоўцаў, генеральным дырэктарам Магілёўскага завода "Трансмаш", член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Скончыў школу і генерал-лейтэнант ФСБ Расійскай Федэрацыі Анатоль Мікалаевіч Гулькоў.

Школу закончыла мноства настаўнікаў, інжынераў, урачоў, афіцэраў арміі і флоту, міліцыі, спецыялістаў народнай гаспадаркі краіны.

...Але гонар школы — яе настаўнікі. Некаторыя з іх сталі выдатнікамі асветы, заслужанымі настаўнікамі-ардэнаносцамі. Да прыкладу, выпускнік школы, выдатнік асветы, кавалер ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга Васіль Гаўрылавіч Шумялёў.

У далёкім 1950 годзе разам з А. Марзалюком свой працоўны шлях пачынаў Ф. Куксін. Яго добра ведаюць на Краснапольшчыне. Ён, заслужаны настаўнік школ БССР, узнагароджаны ордэнам "Знак Пашаны", працаваў настаўнікам, а потым дырэктарам Беразяцкай сярэдняй школы імя Героя Савецкага Саюза І. Ваксмана.

А Аляксандр Іванавіч Марзалюк па-ранейшаму выкладае гісторыю ў Ленінскай сярэдняй школе, кіруе гістарычным музеем. Сапраўды, — не старэюць душой ветэраны. А. Марзалюк з'яўляецца членам раённага савета ветэранаў, старшынёй пярвічнай ветэранскай арганізацыі Горскага сельсавета. Разам з настаўнікамі і вучнямі Аляксандр Іванавіч рыхтуецца ўрачыста адзначыць яе стогадовы юбілей.

Фёдар ГАНЧАРОЎ

У "ЛіМе" ад 22 лютага гэтага года надрукаваны артыкул Леаніда Галубовіча "Сястра наша Леся" аб беларускай паэтцы Лесі Беларусцы (Ларысе Пятроўне Марозавай), дзе ён піша: "На жаль, складваецца такое ўражанне, што ўсе мы, намагаючыся зрабіць добрую высакародную справу — літаратурнае адкрыццё па сутнасці – кінуліся ўразброд, кожны сваім шляхам, не слухаючы адзін аднаго, да такой прыцягальнай, але слаба акрэсленай мэты. Таму столькі разнабою і неадпаведнасцей... Пара вырашыць гэтае важкае, але датклівае пытанне, сумеснымі намаганнямі." Сапраўды, гэта так. Лесяй Беларускай займаліся многія. Гаварылі нават, што нехта ездзіў у Магаданскую вобласць — шукалі і там. Але вынікі росшукаў вядомыя толькі адзінкавыя. Я таксама займалася гэтай справай і хачу расказаць усё, што ведаю і думаю на гэты конт.

Справа Лесі Беларускі

Упершыню пра Лесю Беларуску я пачула напрыканцы 1997 года ў літаратурнай радыёперадачы. На пачатку якой было сказана, што знайшлася беларуская паэтка 30—40-х гадоў ахматаўскага таленту. З гэтай заявы я толькі пасміхнулася: "У вас ледзьве не кожная другая ахматаўскага таленту. Толькі чытаць няма чаго". Аднак паслухаўшы перадачу да канца, паслухаўшы вершы, была моцна ўражана. Таксама там гаварылася, што пачытаць аб паэтцы можна ў 12 нумары часопіса "Полымя" за 1997 год. Я набыла гэты нумар, дзе і былі змешчаны вершы Лесі Беларускі, рэканструяваныя (яшчэ ў лагеры Малагуша пераклаў іх на рускую мову, а зараз зноў вярталі ў беларускую) Алай Канапелькай, Валянцінай Коўтун і сулагернікам паэткі Васілём Малагушам ды артыкул Алы Канапелькі. Вынікам гэтай публікацыі было тое, што адной з самых лепшых айчынных паэтак я стала лічыць Лесю Беларуску, а адной з найвялікшых нашых страт — страту ейных рукапісных зборнікаў "Я голас ваш" і "Сага аб вечнай мерзлаце".

Праз некалькі гадоў вырашыла самастойна заняцца росшукамі звестак пра паэтку. З часопіса "Нёман" за подпісам галоўнага рэдактара быў накіраваны запыт у архіў КДБ з просьбай расшукаць дадзеныя пра Ларысу Пятроўну Марозаву, арыштаваную ў 1938 ці 1939 годзе і высланую ў лагер Эльген Магаданскай вобласці, і пра яе мужа Аляксея Марозава, супрацоўніка НКВД, арыштаванага і расстралянага ў гэтых жа гадах. Адказ, які прыйшоў дзесьці праз месяц, быў несуцяшальны. Вось ён: **"Сообщаем, что сведений в отношении Морозовой Ларисы Петровны (Леси Беларуски), а также ее мужа Морозова Алексея в МВД — КГБ Республики Беларусь, УКГБ Республики Беларусь по Гродненской области, УВД Минского облисполкома не имеется. В ходе дополнительной проверки, проводимой нами в 2002 году, сведений о судимости и отбывании наказания в Магаданской области Морозовой Ларисы Петровны в УРАФ ФСБ России, Главном информационном центре МВД России, а также УФСБ, УВД по Магаданской области не выявлено".** Гэты ліст таксама паказаў, што мы былі далёка не першымі, хто звярнуўся ў КДБ з падобнай просьбай.

Аднак я не здавалася, і вырашыла наведаць Васіля Малагушу. У госці да Васіля Андрэевіча мы прыйшлі ўдваіх з паэтам Юрыем Сапажковым і папрасілі расказаць пра Лесю Беларуску. Спачатку Васіль Андрэевіч крыху распавёў пра сябе, што ён з вёскі Гур'еўка Новаадэскага раёна, што потым жыў у горадзе Нікалаеве, пісаў вершы, у 1937 годзе яго саслалі на Калыму. З часу нашай сустрэчы прайшло некалькі гадоў. Многае з размовы, пэўна, забылася, аднак сёе-тое я запісала. У маім нататніку зафіксавана наступнае: з Лесяй Беларускай Васіль Малагуша пазнаёміўся ў бальніцы. Гэта была маладая прыгожая дзяўчына з брыгады Алены Грубэ. Дарэчы, у той жа бальніцы медсястрой працавала Яўгенія Гінзбург. Леся Беларуска запрасіла Малагушу заходзіць у ейны барак. Ён прыйшоў і ўбачыў наступнае: у Лесі быў свой куток, адгароджаны ад астатняга барака занавескай. Там знаходзіліся ложак, стол, на стале ляжалі сшыткі і фатаграфія (асаблівыя ўмовы яна мела таму, што ведала французскую і нямецкую мовы і яе выкарыстоўвалі як перакладчыцу, таму крыху і ашчаджалі — так патлумачыў Малагуша). Ён зірнуў на здымак і запытаўся, хто на ім. Леся пацікавілася, чаму ён так усхваляваўся. "У мяне ў Гур'еўцы быў такі ж. Гэта сёстры маёй бабулі Ларыса і Маланння. А хлопец, што пасярод іх — жаніх адной з іх, з Маладэчна". Выходзіла, што яны былі сваякамі. Васіль Андрэевіч расказваў шмат чаго, у хуткім часе я кінула запісваць. На развітанне ён даў нам свой зборнік вершаў "Сага аб вечнай мерзлаце", выдадзены ў Мінску на пачатку 2000-х гадоў — пачытаць. Мы змовіліся праз некаторы час сустрэцца зноў. Нешта з расказанага падавалася не вельмі праўдападобным, але Малагушу было больш як 90 гадоў, а ў такім узросце не дзіва, што людзі пачынаюць блытацца ва ўспамінах, нешта прапускаюць, нешта дасачыняюць — узрост.

Сястра наша Леся...

пра Лесю Беларуску)... Дарэчы, у біяграфічных звестках пра Я.Бяганскую (І том біябібліяграфічнага слоўніка "Беларускія пісьменнікі") яе месца адбывання тэрміну пазначана як *"будаўніцтва першага запалярнага саўгаса "Элеген", дзе яна працавала на палях і на лесапавале"*... У В. Малагушы, В. Коўтун і М. Скоблы гэта месца пазначана як лагер Эльген. Больш за тое, М. Скобла піша, што *"рукапісны зборнік Эрыніі-Беларускі пад назвай "Я голас ваш" вынес на волю ўкраінскі паэт В. Малагуша і толькі ў 1997 годзе перадаў у часопіс "Полымя", дзе ён і быў неўзабаве часткова апублікаваны"*. Першае пытанне: чаму так позна перадаў, ужо 12 гадоў як пачалася "перабудова"? Другое, сам В. Малагуша ў сваіх успамінах сцвярджае, што *"арыгіналы вершаў прапалі ў лагеры падчас вобыску"* (тое ж сцвярджае і А. Кобец-Філімонава ў сваёй кніжцы)...

Родных і блізкіх самой Ларысы Пят-

Эскізны абрыс Лесі Беларускі, зроблены графікам І. Лукіным са слоў В. Малагушы.

таго, што там у яе чамусьці 6 строф, тады як у В. Малагушы ў рускім перакладзе ўвогуле толькі 4, а 3-я не адпавядае "арыгіналу" Малагушы. Вось як трэцяя страфа гучыць у анталогіі "Краса і сіла":

З параненай душой няветлы свет.
Сяброўкі спяць і брыгадзір Алена.
Крадуцца з волі сны, і ім наўслед
Звіняць драты калючыя Эльгена.

А так яна пададзена ў зборніку В.Коўтун:

З параненай душой няветлы свет.
Сяброўкі спяць... І брыгадзір Алена
(куміра сатварыў усё ж паэт!)
спіць у цянётах зла —
ўвесь боль Эльгена.

У В. Малагушы падаюцца, як лагерны фальклор запісаны Лесяй Беларускай, такія радкі:

Сроднились с некоторых пор
в Кремле — икона и топор.

То ўжо ў В. Коўтун чытаем як твор самой Лесі наступнае:

Зрадніцца ў час які змаглі
ікона і сякера —
у Крамлі!?
Пакуль сякера ўсюды скача,
заступніца паціху плача,
на цвердзь зямную ў час пагрозы
гарачыя раняе слёзы.
...Слязінкі тыя бачыш ты
ў глыбінях вечнай мерзлаты.

Альбо наколькі па-рознаму падаецца верш "Помнік" у трактоўках Малагушы і Коўтун (у яе ўвогуле чамусьці ... на-запаветны жанр верша ... жарт). У Малагушы (спадзяёмся ... рызаваным перакладзе на ру... гэты верш у кніжцы А.Ко... вай выдрукаваны так:

Памятник

Мне поставьте ...

мець аўтарскі арыгінал альбо хоц... як у выпадку з П. Багрымам, прэтэн... дуючы на міфалагічнае самазацвяр... джэнне ў аналах нацыянальнай лі... ратуры, адпавядаць адзіна *прынят...* "арыгіналу"... Нейк бянтэжыць св... лагернай высакапарнасцю і такі ... ва ўспамінах В. Малагушы: *"...По... 1948 год. Приближалась дата ... дения Леси. Она заканчивала ... над её заветными двумя томами — "Сага о вечной мерзлоте" и ... "Я — голос ваш" (с эпиграфом из ... Ахматовой "Я — голос ваш, жар ва... дыханья")."* Ці не праўда, гэта напіс... нераўнуючы як пра цёплакватэрнага ... вецкага літаратара, а не пра асуджан... жанчыну, якая спіць у халодным бара... і гарбаціць на лесапавале за міску ... ланды...

Ёсць і біяграфічная блытаніна ... пэўнасць. В.Малагуша сведчы... Леся сышла з жыцця добра... (*"Всего за несколько дней ... бождения она вдруг узнаёт ... возлюбленный, которого она ... и нощно мысленно боготворила ... имя которого приняла всю тяжес... подневольной жизни, ещё в 1937 го... был расстрелян. Как уже было сказа... но, измученная десятилетней лаге... ной жизнью, Леся Белоруска не смог... перенести этого беспощадного уда... судьбы"*), іншыя пішуць, што яна ... мерзла выйшаўшы ноччу з барака ... двор, трэція, што сканала ад хвар... Да прыкладу, М. Скобла сцвярдж... ўрэзцы да публікацыі яе вершаў у ... талогіі "Краса і сіла", што муж, з як... яна пабралася шлюбам у 1938 год... быў афіцэрам НКУУС, якога праз ... месяцы іх сумеснага жыцця расстр... лі свае ж таварышы па службе. ... лагуша паглыбляе наш досвед і ... няе, што яна вельмі любіла і ... мужа, і калі ўведала (1947 ... яго расстралялі, то ... магубства... Што ж ...

розаву, ні пра Эрынію там не было. Аказалася, што Гінзбург таксама ведала нямецкую і французскую мовы, але ніякіх асаблівых умоў жыцця ў яе не мелася. З кнігі мне падалося, што ў лагеры не было ніякай мажлівасці пісаць і захоўваць рукапісы.

Кніга вершаў і мне, і Юрыю Міхайлавічу спадабалася. Тым часам я ўважліва прачытала "Круты маршрут" Яўгеніі Гінзбург. Ніякіх згадак ні пра Лесю Беларуску, ні пра Ларысу Ма-

Яшчэ я хадзіла ў гістарычны архіў, без асаблівых, шчыра кажучы, спадзяванняў — каб знайсці ўсіх Ларысаў Пятроўнаў, якія нарадзіліся ў гэтым горадзе ў больш-менш падыходзячым прамежку часу. Калі Леся Беларуска выйшла замуж у 1938 годзе, то яна магла нарадзіцца дзесьці ад 1921года... мінус гадоў дзесяць—пятнаццаць. У метрычных кнігах Маладзечанскай царквы аб хросце за 1901—1916, 1922 гады запісу аб нараджэнні Ларысы Пятроўны няма ніводнага. Аднак не захаваліся метрычныя кнігі па вельмі важных 1917—1921 гадах. Да таго ж, нярэдкімі былі выпадкі, калі чалавек нараджаўся ці хрысціўся ў адным месцы, а жыў у іншым.

Мы ізноў з Юрыем Міхайлавічам пайшлі да Малагушы. Аднак яго не заспелі — ён знаходзіўся ў бальніцы. Вяртаючыся назад па вуліцах прыватнага сектара, памятаю, я сказала: "Здаецца мне, што ўсё ён прыдумаў." (Зрэшты, мне не першай так падалося: некалі загаварыла аб Лесі Беларусцы з Міхасём Казлоўскім, маладзечанцам як-ніяк, ён сказаў, маўляў, напрыдумляў усё Малагуша. Але тады я нават і ўвагі не звярнула на гэткую тэзу.) Мы пачалі разважаць, супастаўляць розныя факты, і ўсё больш і больш упэўніваліся ў гэтай думцы.

Па-першае, акрамя слоў Малагушы няма ніякіх іншых сведчанняў пра Лесю Беларуску, па-другое, яго і яе вершы вельмі падобныя — нам забачыўся адзін і той жа почырк, патрэцяе, Васіль Андрэевіч ужо двойчы прарабляў такія містыфікацыі, калі пісаў вершы ад нечага імя — на Калыме і ў Фрунзе, пра што ён сам расказаў, па-чацвёртае, нам падалося дзіўным, што свой зборнік вершаў "Сага аб вечнай мерзлаце" ён назваў чужым найменнем — так зваўся сшытак прозы Лесі, па-пятае, у ягоным аповедзе шмат неверагоднага, напрыклад, тое, што яны з Лесяй аказаліся сваякамі (у палымянскай версіі, дарэчы, такога не было), пра фотаздымак бабуль — чаму яна трымала не фота маці, бацькі ці мужа? Палічыце, прыкладна ў якім часе быў зроблены той здымак — ледзьве не ў сярэдзіне XIX стагоддзя. На зары фатаграфіі. Няўжо для сялян гэта было даступна? Разумею яшчэ калі сфатаграфаваліся ўсёй сям'ёй — бацька сямейства вырашыў раскашэліцца. А то дзве сястры. Ды яшчэ здымкі ў двух экземплярах. Дарэчы, да 1939 года Маладзечна было пад Польшчай, і калі Леся называе яго родным горадам, значыць, яна там нямала пражыла. Паўстае пытанне, калі і чаму іх сям'я пераехала ў Савецкую Беларусь? Гэты момант павінен застацца ў памяці і за доўгі час сумеснага знаходжання ў лагеры мусіў быць агавораным. І гэтак далей.

І нам вымалявалася наступная карціна: імя Леся Беларуска ўзнікла па аналогіі з Лесяй Украінкай (Васіль Андрэевіч украінец усё-такі), па-другое, так звалі яго бабулю. Горад Маладзечна — таму што ён чуў пра яго ад сваякоў і, прыехаўшы ў Беларусь першы час, здаецца, жыў там, а наконт таго, што горад да 1939 года знаходзіўся пад Польшчай, не ведаў, ці проста не надта ўнікаў у гэты момант, Марозава — такое прозвішча мела адна сулагерніца (якая працавала, здаецца, у сталовай), веданне французскай і нямецкай моў — ад Яўгеніі Гінзбург. Што называецца — са свету па нітцы. Але навошта ён гэта ўсё зрабіў? Мы вырашылі — для таго, каб прыцягнуць увагу да сябе і да сваёй творчасці (якая, безумоўна, таго заслугоўвае і, згадзіцеся, гэта ў яго атрымалася), бо, без сумневу, пра гэта ён думаў, і ў размове неяк прагучала фраза "мне трэба падымаць сваю творчасць".

Памятаю, Юрый Міхайлавіч напачатку абурыўся, я ж — не: ну, падумаеш, прыдумаў чалавек легенду. Мы вырашылі прыйсці да Малагушы і адкрыта яму ўсё сказаць. Праз некаторы час так і сталася. Пачала мякка і тактоўна я: "Ведаеце, Васіль Андрэевіч, нават у юрыспрудэнцыі такое правіла: павінна быць хаця б два доказы. Тут жа, адносна Лесі Беларускі, — толькі вашы словы і больш нічога, нідзе: ні ў Гінзбург, ні ў КДБ, ні ў Маскве, ні ў Мінску, ні ў Магадане. Ну хоць бы яшчэ дзе слоўца якое. Але нідзе нічога няма". Юрый Міхайлавіч мірна, але цвёрда і перакананa падхапіў: "Васіль Андрэевіч, вы Лесю Беларуску прыдумалі. Гэта вашы вершы. Добрыя вершы.Частку іх вы вырашылі ёй падарыць. Я не веру, што яна была! Яе не было!" Васіль Андрэевіч памаўчаў. Потым ціха сказаў: "Я не магу сказаць, што яе не было." Потым пачаў нешта гаварыць, потым прамовіў: "Я ёсць!" Размова наша працягвалася. Шчыра кажучы, многага я ўжо не помню, але гэтыя дзве фразы памятаю дакладна. Калі б мы не мелі рацыю, нам здаецца, ён стаў бы, што называецца, "рваць на сабе рубаху", кшталту: ну, што вы, як гэта не было! Была, канечне, была!!! Як бачым, ён адказаў па-іншаму. Выйшлі мы ад яго яшчэ больш упэўненыя ў сваіх меркаваннях...

Цяпер маё стаўленне да гэтай справы самі разумееце якое. У артыкуле Л. Галубовіча (зразумела, ён не ведаў усяго, што ведаю я) ёсць прапанова: "...Нам, усім разам, трэба неадкладна "*кананізаваць яе міф*" як **насамрэчны**". Зрэшты я таксама не супраць. Гэта быў бы своеасаблівы помнік ахвярам сталінізму: колькі ў тых гулагах загінула таленавітых людзей. Але, думаю, што нават для міфа патрэбна хаця б крупінка рэальнага, без яе ён можа аказацца нежывучым.

У сваіх высновах я не прэтэндую на ісціну ў апошняй інстанцыі. Калі хто дакажа адваротнае, буду толькі рада.

Наталля КАПА

«У сваю дывізію пайшоў...»

Аляксей Пысін — паэт вялікі, асоба неардынарная, яго паэзія — з'ява унікальная і фенаменальная ў беларускай літаратуры. Пра гэта гаварылі і пісалі вядомыя паэты, празаікі, крытыкі. У такой ацэнцы майстэрства паэзіі Пысіна ўсе адзінадушныя: Рыгор Барадулін і Віктар Карамазаў, Янка Брыль і Ніл Гілевіч, Васіль Быкаў і Варлен Бечык, Міхась Стральцоў і Рыгор Бярозкін, Сцяпан Гаўрусёў і Мікола Мішчанка, Ігар Шклярэўскі і Таццяна Хоміч, Кайсын Кулієў...

А вось пра характар паэта Аляксея Пысіна гаварылі рознае. Адны, што ён нелюдзімы і з цяжкім характарам. Другія, што ён вельмі адкрыты і шчыры. Адны сцвярджалі, што ён не ўмее гаварыць з трыбуны, другія — што паэт цудоўны прамоўца, што яго вельмі цікава слухаць. Нават я, здавалася б, павінен ведаць пра Аляксея Васільевіча ўсё драбнюткае. У блізкім сяброўстве быў 25 гадоў і сустракаўся з ім нашмат часцей іншых. У адным з мініўспамінаў напісаў, што Пысін ніколі не гуляў у карты і шашкі, а Леанід Левановіч расказаў, як ён з паэтам у Магілёве гуляў у шахматы і які ён азартны ігрок. Тады я ўспомніў маладзейшыя нашы гады. Аднаго разу мы сем'ямі, набраўшы амаль па вядру чарніц у клічаўскім лесе, у чаканні цягніка некалькі разоў згулялі ў падкіднога. Аляксей Васільевіч з азартнай лёгкасцю кожны раз выйграваў. Відаць, што гэта засталося яшчэ з ваеннай маладосці, бо і там не кожны дзень хадзілі ў атаку на ворага, былі ж перадышкі гвардзейцам і трэба было неяк бавіць час. А вось у пазнейшыя дзесяцігоддзі, нават яшчэ ў Чэрыкаве, паэт Пысін са мной і пры мне ніколі не браў у рукі ні карт, ні шахматных фігур: ён кожную хвіліну аддаваў паэзіі. Ніколі не вёў пустых размоў, заўсёды рабіў толькі канкрэтную справу, найперш тварыў.

І ўсё ж: які характар быў у паэта Пысіна? Калі адным словам сказаць, што складаны, то амаль нічога не сказаць. Поўны адказ на гэтае пытанне чытач знойдзе ў "Вянку Аляксею Пысіну", які выдадзены ў Магілёве і ўкладальнікам якога з'яўляецца аўтар гэтых радкоў. З кароткіх успамінаў тых, хто бачыў, сябраваў, сустракаўся і гутарыў, працаваў з Аляксеем Васільевічам, атрымаўся партрэт Паэта, Чалавека, Воіна.

Аўтар уступнага слова, да "Вянка..." паэт Іван Пехцераў упэўнены, што "сваімі шчырымі радкамі ўсе яны намалявалі яркі партрэт паэта, вернага сына зямлі Магілёўскай, чый подзвіг у паэзіі можна параўнаць з подзвігам Васіля Быкава ў прозе. Фарбы гэтага партрэта не зліняюць з цягам часу. Пройдуць многія гады — і кожны, хто возьме ў рукі "Вянок Аляксею Пысіну", прачытае яго радкі, убачыць светлы вобраз паэта-воіна, які аддаў увесь жар свайго вялікага сэрца людзям, падараваў ім свае таленавітыя кнігі, ў якіх жывуць думкі і пачуцці майстра, пульсуе яго кроў. Прачытаюць людзі "Вянок" — перад імі як жывы паўстане Аляксей Пысін, улюбёны ў Беларусь, за якую ён хадзіў на бітву з ворагам, славіў яе словам".

Прапаную ўрыўкі з "Вянка Аляксею Пысіну".

Васіль Быкаў: Што датычыць мастака, то гэта яшчэ яго сутнасць. Гэтая сутнасць, чалавечая сутнасць, складалася, відаць, у тыя гады, калі не было месца для фальшу. Мне вельмі дорага гэтая франтавая і салдацкая сутнасць Пысіна-Чалавека, Пысіна-Паэта.

Хведар Жычка: У сучаснай беларускай літаратуры імя Аляксея — на пачэсным покуце. У жыцці Аляксей Васільевіч быў сціплы, нават празмерна сціплы...

Ніл Гілевіч: Так, ён быў чалавекам на рэдкасць сціплым, але не баязлівым, не бязмоўнапакорлівым, а тым больш — не дагодліва-прыслужным. О, не! У яго быў характар і была сіла волі, у яго былі перакананні і прынцыпы, якімі ён ніколі не паступаўся. А перш за ўсе ён не паступаўся пачуццём праўды і справядлівасці...

Ён быў сапраўдным сынам свайго народа, ад якога ўзяў найлепшыя рысы: сумленнасць, шчырасць, сціпласць і дабрыню. Увасабленнем іх ён быў і застаецца ў нашай памяці назаўсёды.

Мікола Аўрамчык: Ты быў просты і сціплы ў жыцці, але заўсёды бескампрамісны ў барацьбе за праўду, нецярпімы да прыстасавальніцтва і фальшу.

Мабыць, смялейшым рабіўся той, каму даводзілася ляжаць разам з табою ў адным акопе. Бо я ведаю, як добра працавалася тым, хто трымаў на цябе раўненне, і як хораша сябравалася з табою тым, хто адчуваў побач тваё плячо і поруч — твой локаць.

Янка Брыль: Якое спалучэнне мужнасці ў вершах яго, глыбокай мужнасці салдата, мужчыны, чалавека з вялікай душой. І пасля пяшчотнасць, якая ў яго вершах пра старых паважаных людзей, і ў вершах пра дзяцей, і ў вершах пра прыроду, успомніце хоць бы верш "Ёсць на свеце мой алень..." і іншыя...

Доўга-доўга будуць яго памятаць... Ён будзе заўсёды, пакуль будзе Беларусь.

Сцяпан Гаўрусёў: Адно ён ненавідзеў бескампрамісна і непрымірыма — кар'ерыстаў, прайдзісветаў і бюракратаў розных рангаў і масцей. Шчодрасць яго душэўнай аддачы была неймаверная. Ён умеў клапаціцца пра ўсіх, апрача сябе. Адкрыць хоць кволенькі парастак новага таленту, падтрымаць — лічыў найвышэйшым абавязкам і святам. Заўсёды быў ураўнаважаны, ласкавы, задушэўны. Але мне даводзілася бачыць яго і гнеўным — тады, калі прыніжалася нешта запаветнае...

Смяяўся ён рэдка і неяк коратка. Усміхнецца і задумаецца, заглыбіцца ў сябе. Маўчыць. Што ён думае, згадвае?

Віктар Карамазаў: ...На размовы Пысін не заўсёды быў ахвотнік. Ён любіў моўчкі ўглядацца ў навакольны свет, моўчкі слухаць, больш слухаць, чым гаварыць, пачутае і ўбачанае ціха занатоўваць сэрцам, і каб у гэтай працы ніхто не замінаў ні лішнім словам, ні сваёй неабавязковай прысутнасцю.

Ён не толькі ў вершы, але і ў жыцці быў ашчадны на слова.

Пятро Прыходзька: Аляксей Васільевіч быў такім чалавекам, якога цікавілі ўсе і ўсё. Ён не мог прайсці ні міма радасці, ні міма гора. Перажыванні людзей былі яго перажываннямі. Няма такога кутка на Магілёўшчыне, дзе б ён не пабываў... Аднаго ён не любіў, проста ненавідзеў усёй душой — гэта бюракратызм, пошласць, крывадушша. Ён бічаваў іх сваім вострым пяром, вусным і пісьмовым словам, рэзка выступаў супраць усялякага роду хлусні і няпраўды, змагаўся за чысціню чалавечых памкненняў, і ў яго страсных пачуццях, душэўных, глыбокіх іх перажываннях, выказаных у вершах...

Рыгор Яўсееў: Шмат ужо забылася, сплыло, сцёрлася. Але засталіся ў памяці яго жывыя рысы. Прымружу вочы, а ў іх — воблік паэта. Ён засяроджаны, заклапочаны, але ўсмешка лагодная, шчырая...

Вестка, што яго не стала, што ён "у сваю дывізію пайшоў" дагнала мяне ў дарозе на Брэстчыну. Я ў думках пажадаў яму спакойнага сну, зайшоў у Баранавічах у прывакзальны буфет і з горыччу памянуў яго душу. Сам нябожчык у свой час не быў зломкам ляснуць чарку, як дарэчы, і ўсе магілёўскія літаратары, але апошнія дзесяцігоддзі не ўжываў ні кроплі.

Даўно недзе ў небе гарыць ягоная зорка...

Віктар АРЦЕМ'ЕЎ

Матывы гераізму на вайне*

Ёсць такія гістарычныя падзеі, якія і на працягу стагоддзяў не губляюць сваёй велічы, свайго важкага і паўнамоцнага голасу ў бягучых працэсах сучаснасці. Да ліку іх, безумоўна, адносіцца і Вялікая Айчынная вайна 1941 — 1945 гг. "...Час, — як заўважыў адзін з вядомых і таленавітых палкаводцаў маршал Г.К.Жукаў у кнізе "Воспоминания и размышления», — не мае ўлады над веліччу ўсяго, што мы перажылі ў вайну. Гэта быў незвычайна цяжкі, але слаўны час. Чалавек, які перажыў аднойчы вялікія выпрабаванні, выйшаў з іх пераможцам, будзе потым чэрпаць сілы ў гэтай перамозе".

Як незабыўная памяць пра веліч чалавека і нязломнасць народнага духу савецкага народа ў гэтай цяжкай і крывапралітнай вайне, успрымаюцца і словы генерала Д.Валкагонава, які аддаў шмат увагі вывучэнню гэтай эпахальнай, сусветнага рэзанансу гістарычнай падзеі: "Нашчадкам застаецца толькі здзіўляцца, наколькі велізарнай была "веліч духу" савецкага народа, што знайшоў у сабе сілы пасля катастрофы першых дзён вайны "ўперціся" і выстаяць, хоць і каштавала гэта яму мільённых ахвяр".

Пра ўсё гэта, як і пра барацьбу з чужынцамі, што закончылася перамогай у маі 1945 года, напісана нямала твораў. Вялікі ўклад у гэту скарбонку ўнесла і мастацкая літаратура Беларусі, краіны, якая страціла на той вайне кожнага чацвёртага, а, можа, і кожнага трэцяга свайго жыхара (тут не адпала яшчэ неабходнасць ва ўдакладненнях) і якая заведчыла па-свойму класічны ўзор шырокага, масавага партызанскага руху. Сама вайна была настолькі аб'ёмнай у сваіх непасрэдна ваенных, а таксама сацыяльна-псіхалагічных, духоўных, палітычных, эканамічных і многіх іншых праявах, што для пісьменніка, гісторыка, палітолага, псіхолага тут яшчэ працы на шмат гадоў.

Гэты момант і меў на ўвазе Іван Шамякін, выказваючы такую думку: "Сапраўды, напісалі мы шмат. Пісьменнікі ўсіх пакаленняў, пачынаючы ад Якуба Коласа, Янкі Купалы, Міхася Лынькова, Петруся Броўкі, Аркадзя Куляшова, Максіма Танка, Пімена Панчанкі, творцы нашага пакалення, ўдзельнікі вайны — Янка Брыль, Іван Навуменка, Васіль Быкаў, Уладзімір Карпаў, Аляксей Кулакоўскі, Андрэй Макаёнак, Алесь Савіцкі і многія іншыя. Потым прыйшлі маладзейшыя — Іван Пташнікаў, Міхась Стральцоў, Віктар Казько, Іван Чыгрынаў, Барыс Сачанка, Павел Місько, Вячаслаў Адамчык, Анатоль Кудравец, Алесь Жук, Генрых Далідовіч, Віктар Карамазаў, Аляксей Дудараў, — можна назваць яшчэ нямала імёнаў і з тых ваенных пакаленняў і з тых, хто нарадзіўся пасля вайны. Не менш зрабілі і паэты... Але тэма гэта невычэрпная, незабыўная. І, канечне ж, пра вайну не ўсё сказана. І пра партызаншчыну нашу — таксама. Адны атрады ўтвараліся з мясцовага насельніцтва, другія пасылаліся, закідваліся ў тыл органамі ўнутраных спраў і дзяржбяспекі, трэція — па лініі армейскай разведкі. Ёсць нямала нюансаў, пра якія яшчэ не ўсё сказана.

Некаторым нашым пісьменнікам, якія самі напоўніцу зведалі цяжар мінулай вайны і багата пра яе напісалі, уяўляецца, што праробленая ў межах мастацкага асэнсавання гэтай тэмы вялікая і плённая праца з'яўляецца ўсяго толькі прэамбулай, уступам на шляху да новых эстэтычных адкрыццяў. Такое меркаванне прагучала, у прыватнасці, у адным з інтэрв'ю А.Савіцкага: "Канечне, беларускай літаратурай, паэзіяй і прозай, сказана пра вайну многае і важка, але лічу, да адлюстравання глыбіннай сутнасці таго, што знаходзілася ля вытокаў гераічнага пачатку, мужнасці народа, мастацкае слова яшчэ не дайшло. *Магчыма, гэта зробяць новыя пакаленні пісьменнікаў, для якіх нашы кнігі з'явяцца толькі парускa кажучы, "исходным материалом", якія па-свойму паглядзяць на падзеі гэтых гадоў і асэнсуюць іх...*" (курсіў мой — ***В.Ж.***).

Магчыма, што літаратурная тэндэнцыя, звязаная з ваеннай тэматыкай, пойдзе ў будучым менавіта і па такім кірунку развіцця і абнаўлення, як гэта здаецца А.Савіцкаму. Заўтрашні дзень, як і будучая мадэль літаратурнага працэсу, шмат у чым застаецца для нас сёння ў многім тайнай, хоць гэта зусім не азначае, што мы павінны поўнасцю пакласціся, паспадзявацца на волю лёсу, шчаслівага выпадку і быць тут староннімі і пасіўнымі наглядальнікамі. Стылёва-жанравая, праблемная і чалавеказнаўчая навізна ў літаратуры прыходзіла не сама сабой, не самахоць, а пры адпаведных, вялікіх унутраных намаганнях таленавітых і геніяльных майстроў слова, якія садзейнічалі яе *фарміраванню*, складванню, развіццю. Ну і, вядома, уплыў крытыкі і літаратуразнаўства тут таксама нельга прызнаць фактарам малазначным, як і ўздзеянне саміх чытачоў, якасны ўзровень і мера запатрабаванасці і зацікаўленасці якіх заўсёды ўносілі свае карэктывы на ход, дынаміку развіцця, выяўлення той або іншай ідэйна-эстэтычнай лініі ў літаратуры. Прытым, як паказвае шматгадовы вопыт сусветнага літаратурнага руху ды і наш нацыянальны літаратурны набытак, найважнейшую ролю ў плённых і эфектыўных наватарскіх пошуках пісьменніка адыгрывала яго здольнасць знайсці надзейны пункт апоры, уменне творча падысці да асэнсавання і пераасэнсавання мастацкіх дасягненняў сваіх папярэднікаў і ўдумлівага засваення не падуладных кан'юнктурна-зменліваму інтарэсу маральна-этычных духоўных асноў жыцця, якое адышло ці адыходзіць у мінулае і становіцца гісторыяй.

Усё далей адыходзіць у мінулае і становіцца гісторыяй і Вялікая Айчынная вайна 1941 — 1945 гг. Зыходзячы, аднак з векавых законаў логікі развіцця і эвалюцыі літаратурнай думкі, ёсць падставы верыць і спадзявацца, што багатая (дакладней будзе нават сказаць, найбагацейшая) мастацкая спадчына аб мінулай вайне будзе выконваць не проста сціплую ролю прэамбулы, "*исходного материала*" на шляху да новых літаратурных адкрыццяў, а замацуе за сабою права быць фундаментальнай маральна-этычнай і эстэтычнай апорай у пошуку арыгінальных метадалагічных падыходаў і свежых, незаштампаваных спосабаў і прыёмаў, скіраваных на больш заглыблены і псіхалагічна-абгрунтаваны ў параўнанні з раней дасягнутым паказ чалавека на вайне, высвятленне тых стымулаў, матываў і першапрычын, якія няспынна шырылі, памнажалі і ўзмацнялі энергію народнага супраціўлення нямецкім арміям і садзейнічалі набліжэнню доўгачаканага дня Перамогі...

Аб'ектыўнаму паказу вайны ў мастацкай і навуковай літаратуры ў апошнія дзесяць-пятнаццаць год прыкметна перашкаджае, як мне ўяўляецца, аднамерна-тэндэнцыйны (а падчас і адкрыты спекуляцыйна-палітычны) падыход некаторых аўтараў да асвятлення тых або іншых аспектаў гэтай вялікай гістарычнай падзеі. Ну, а калі да ўсяго гэтага пэўным чынам прымешваецца яшчэ і паслабленае ўспрыманне таго болю, таго трагізму і драматызму, што давялося перажыць, выцерпець салдату-франтавіку, партызану, чалавеку на акупіраванай немцамі тэрыторыі, то само паняцце *аб'ектыўнасці* падпадае ў такім разе пад моцны ўплыў сур'ёзных трансфармацый і парушэнняў.

Вядомаму беларускаму літаратуразнаўцу, аднаму з аўтараў арыгінальнай і таленавітай кнігі "Я з вогненнай вёскі..." Ул.Калесніку цяжка нават уявіць, як гэта ён, малады чалавек, не мог не стаць партызанам і не быць пакліканым голасам уласнага сумлення і асабістай адказнасці за ўсё, што адбывалася навокал...

Нельга не прыслухацца ў гэтым сэнсе і да слоў былога партызана славутай Заслонаўскай брыгады М. Крукоўскага, які настойліва сцвярджае, што пераважна "знізу", з народных глыбінь зыходзіла і галоўная ініцыятыва зараджэння і разгортвання партызанскага руху на Беларусі.

Васіль ЖУРАЎЛЁЎ

* Скарочаны варыянт артыкула

Момант ісціны Багамолава-Пташука

Распавядаючы пра фільм "У жніўні 44-га...", часцей гавораць пра рэжысёра-пастаноўшчыка Міхаіла Пташука. І гэта справядліва, бо ў стварэнні стужкі галоўная заслуга — ягоная. Але без драматургіі няма кіно. Можна зняць дрэнны фільм паводле добрага сцэнарыя, і ніколі — добры фільм паводле слабога. У аснове кінасцэнарыя — раман "Момант ісціны" — "У жніўні 44-га...". Дзве назвы. Так ён і публікаваўся пры першым выхадзе ў свет: у літаратурным часопісе "Новый мир" — адна назва, другая — у выдадзенай следам кнізе. Твор вытрымаў 99 перавыданняў.

Аўтар рамана, а потым і сцэнарыя, знакаміты рускі пісьменнік Уладзімір Багамолаў. Уладзімір Восіпавіч прайшоў Вялікую Айчынную вайну: "Я быў паслядоўна радавым, камандзірам аддзялення, памкамузвода, камандзірам узводаў — стралковага, аўтаматчыкаў, пешай разведкі, у канцы вайны быў камандзірам роты... У 1944 годзе, будучы камандзірам узвода, прайшоў Беларусь ад Краснага да Гродна. І адзін з чатырох баявых ордэнаў (Айчыннай вайны I ступені) атрыманы мною за баі чэрвеня — ліпеня таго лета. З Беларусі і жонка ў мяне, і цешча..." А Брэст ён заўсёды лічыў сваім любімым горадам. Часцяком наведваўся ў Мінск. Упершыню мы з ім сустрэліся на Нарачы, у санаторыі "Сосны", дзе штогод у апошняе дзесяцігоддзе Багамолаў адпачываў са сваёй жонкай.

Але галоўным злучным звяном, канечне, была вайна...

Акрамя Нарачы, мы шмат разоў сустракаліся з Уладзімірам Восіпавічам у ягонай кватэры ў Пратапопаўскім завулку ў Маскве. Ён з гонарам расказваў пра тое, што служыў у ваеннай контрразведцы. Па меркаванні заходніх даследчыкаў, яна была самай эфектыўнаў контрразведкай сярод спецслужбаў краін, якія ваявалі ў Другой сусветнай вайне. Багамолаў падкрэсліваў: "Менавіта гэта інфармацыя, а дакладней, ацэнка замежных спецыялістаў заахвоціла мяне напісаць раман "Момант ісціны". Нядзіўна, што ўжо тады ў мяне з'явілася спакуса экранізаваць гэты раман у Беларусі".

Зразумелымі былі Багамолаву і жахлівыя вынікі вайны: загінуў кожны чацвёрты беларус! Усё гэта, а таксама паважлівыя адносіны да Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, адыгралі вырашальную ролю ў нашых перамовах: Багамолаў даў згоду на прадастаўленне права пастаноўкі "Беларусьфільму". А 20 год пісьменнік такога права нікому не даваў.

Наведваючы кінастудыю "Беларусьфільм" у 1997-м, кіраўнік нашай краіны пагадзіўся выдаткаваць сродкі на айчынны фільм, які не сорамна будзе паказваць на самым высокім міжнародным узроўні. Аўтар гэтых радкоў, будучы намеснікам міністра культуры, азнаёміў Прэзідэнта з кінастудыяй і рызыкнуў прапанаваць экранізаваць "Момант ісціны". Прэзідэнт раман добра ведаў, лічыў цалкам беларускім і адразу падтрымаў ідэю. Пасля кіраўнік краіны гаварыў пра гэта і з Уладзімірам Багамолавым. Так тэма патрапіла ў вытворчы план кінастудыі. Угаварыць Міхаіла Пташука атрымалася не адразу, бо той працаваў над іншым сцэнарыем. Праз два тыдні ўгавораў Пташук усё-ткі пагадзіўся. Пытанне фінансавання вырашалася таксама не адразу: у часе работы над фільмам. Некалькі разоў да рэалізацыі праекта падключаўся Мікалай Чаргінец. Спачатку — як сябар Багамолава, як пісьменнік і кінадраматург. Потым — як дэпутат парламента. Праект "рухаўся", але з цяжкасцямі. Асоба расійскага прадзюсера У. Семагі, на той час дэпутата Дзярждумы, з'явілася значна пазней, калі рэсурсы Міністэрства культуры Беларусі былі вычарпаныя.

Закранаючы гісторыю стварэння стужкі, трэба ўзгадаць, што першы раз права экранізацыі Багамолаў прадаставіў 20 год таму "Мосфильму" і літоўскаму рэжысёру Вітаўтасу Жалакявічусу. Знакаміты майстар, пер — для стварэння фільма. Прэса, у першую чаргу недзяржаўная, актыўна мусіравала праблему падыходаў і адносін да будучай стужкі аўтара Уладзіміра Багамолава і рэжысёра Міхаіла Пташука. Вакол іх (і з імі!) распачалася тонкая псіхалагічная вайна: імкнуліся падштурхнуць да канфлікту (узгадаем В. Жалакявічуса) з Пташуком. Да аўтара дасылалі і лісты, і ананімныя пасквілі. На самай справе шмат чаго было зусім не так, як падавалася ў прэсе. Але канфлікт меў месца, ды яшчэ які! Багамолаў папрасіў не змяшчаць яго прозвішча ў цітрах. А ці каштаваў таго славуты канфлікт? Адказ Пташука ў газеце "Рэспубліка": "Пагалоскі, якія з прагнасцю падхапіла прэса, нават не спрабуючы разабрацца па сутнасці, не прыносілі радасці і не дапамагалі ў працы. Скажу адразу, што ў нас з аўтарам склаліся нармальныя працоўныя адносіны. Мы пастаянна раіліся — і па падборы акцёраў, і па сцэнарыі... Уладзіміру Восіпавічу паказалі адзнятага матэрыялу на 3,5 гадзіны, а фільм павінен доўжыцца 1 гадзіну 50 хвілін. Пасля прагляду ў Багамолава ўзніклі прэтэнзіі. Штосьці, з чым пагадзіўся рэжысёр — было выпраўлена, якіясьці заўвагі я не прыняў. Думаю, што нічога трагічнага не здарылася".

Рэзкі ў ацэнцы, свае згоды-нязгоды Багамолаў перадаў у СМІ: "Мне не раз казалі: "Заўвагі вашыя былі дакладныя, і яны былі рэалізаваныя". Заўважу, што гэта так: эпізоды і кадры, якія выклікалі ў мяне непрыманне сваім неразуменнем, недарэчнасцю і непрадуманымі імправізацыямі, рэжысёр, асэнсаваўшы і запознена зразумеўшы, без жалю выразаў і выкідваў".

Безумоўна, спрэчкі паміж гэтымі дзвюма выдатнымі асобамі нашага часу былі. Але ж без канфліктаў творцаў немагчыма і дасягнуць мэты! На жаль, цяпер абодвух ужо няма. Іх спрэчкі разважыў час. Сёння фільм называюць абодвума імёнамі стваральнікаў: Багамолава-Пташука. Гэта цалкам справядліва.

У стужцы "У жніўні 44-га..." паказана лакальная гісторыя дзеянняў групы контрразведчыкаў, калі па ўсім фронце ідуць наступальныя аперацыі Савецкай Арміі. Месца дзеяння — Заходняя Беларусь.

Яшчэ "цёпленькая", карціна адразу атрымала прыз на нашым фестывалі "Лістапад". Потым былі ўзнагароды на фестывалях "Кинотавр", Гран-пры на "Золотом витязе", прыз Прэзідэнта Расіі — усяго 8 фестывальных узнагарод. І галоўнае — поспех і прызнанне гледачоў.

У чым феномен фільма "У жніўні 44-га..."? Да моманту выхаду стужкі на экран глядач, перасыціўшыся нізкапробным амерыканскім і падробленым пад яго постсавецкім кіно, ужо скептычна адносіўся да "разудалой беспредельщины и сексопатологии". Прыклад гэтага фільма паказальны. У беларускім кіно даўно не было такой грунтоўнай пастаноўкі, якая прывабліве ўсеагульную ўвагу. У карціне няма нават любоўнай інтрыгі. Але любоў ёсць, і яна — да Радзімы. Героі стужкі гатовыя служыць ёй не за грошы, зорачку на пагонах альбо кар'еру. За гонар! Гэта і быў асноўны складнік усіх твораў Уладзіміра Багамолава. І творчага тандэма Багамолаў-Пташук.

Юрый ЦВЯТКОЎ

З пошты «ЛіМа»

Адна зямля

Пад такой назвай у Маладзечанскім Палацы культуры прайшла творчая сустрэча мясцовых і вілейскіх паэтаў. Мерапрыемства было наладжана літаратурна-краязнаўчай суполкай "Агмень".

Маладзечанскі бард Павел Бельскі "спрачаўся" песнямі са сваім калегам з Вілейкі Алесем Наркевічам. Узгадвалі мінулае ветэраны маладзечанскага літаб'яднання "Купалінка" Станіслаў Касаты, Лідзія Гардынец, Яніна Дзяркач.

Здзейснілі своеасаблівы гістарычны экскурс унучка айчыннага гісторыка, перакладчыка і літаратара Пятра Бітэля Тамара Бярэзіна і дачка нашага славутага земляка Міколы Ермаловіча Алена.

Госці таксама пазнаёміліся са зборнікамі вершаў сталай паэткі Лідзіі Гардынец "Саламяны капялюшык", Ахмет-Шэйха Загірбекава "Таямнічая жанчына".

Настасся ХАРУК

Вернісаж мастакоў-педагогаў

Да 30-годдзя дзіцячай мастацкай школы горада Маладзечна ў фае ўстановы адкрылася выстава мастакоў, якія працуюць у ёй выкладчыкамі. Так, свае творы прадставіў вядучы мастак Маладзечаншчыны Васіль Лазоўскі. Яго гуаш на кардоне яркая, кранаючая і вобразная: "Фальварак на ўзвышшы", "Волат", "Мінск"...

Алесь Пашкевіч, традыцыйны пейзажыст, прапанаваў свой лагодны "Спакойны дзень. Нарач". Старэйшы з мясцовых мастакоў Аляксандр Пясецкі выставіў шэраг каларыстычна багатых краявідаў: "Залатая восень", "Зімовы краявід", "У лесе", "Цёплая дарога"... Эмір Асанавіч, старэйшы з маладзечанскіх скульптараў, прадэманстраваў свой "Вясновы настрой", а дырэктар дзіцячай мастацкай школы Васіль Таркан — эпахальна-манументальнае палатно "Нараджэнне новага свету".

Алена ЦІШЭЎСКАЯ

На трох жалудах

"Тры жалуды" Зміцера Сідаровіча — гэта зборнік медыявальнай лірыкі, у якой адлюстраваліся патрыятызм і грамадская пазіцыя аўтара, яго цікавасць да гістарычнага мінулага і праекцыя гістарычнай памяці на сучаснасць. Паэтычны тэатр "Арт.С" падрыхтаваў цікавы сцэнарый, па якім асоба аўтара кнігі з кожным паваротам сюжэта ахутвалася усё большым арэолам загадкавасці...

Як зазначылі сябры пісьменніка, чалавек ён надзвычай сціплы, што адлюстравалася ў аўтабіяграфічнай даведцы, змешчанай на вокладцы ягонай кнігі." Ды наўрад ці можна некалькімі словамі акрэсліць творчую натуру Зміцера Сідаровіча. І калі ён сам пасаромеўся зрабіць гэта, то знайшліся ягоныя сябры і аднадумцы.

Мілагучнасць і вобразнасць лірыкі "Трох жалудоў" адразу ж пацвердзілася цікавым гумарыстычным дыялогам паміж аўтарам кнігі і вядучай вечарыны Аксанай Спрынчан.

Яніна ГРЫЦКЕВІЧ, студэнтка журфака БДУ

Літ

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе газета ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі"

РВУ "Літаратура і Мастацтва"

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
Анатоль КАЗЛОЎ

Рэдакцыйная калегія:
Анатоль Акушэвіч
Лілія Ананіч
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Святлана Берасцень
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Уладзімір Дуктаў
Анатоль Жук
Вольга Казлова
Анатоль Казлоў
Алесь Карлюкевіч
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Дзмітрый Лыбін
Алесь Марціновіч
Мікола Станкевіч
Юрый Цвяткоў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
220034, Мінск,
вул. Захарава, 19

Тэлефоны:
галоўны рэдактар,
намеснік — 284-66-73

Аддзелы:
публіцыстыкі — 284-66-71
пісьмаў і грамадскай думкі — 284-95-62
крытыкі
і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы і паэзіі— 284-44-04
мастацтва — 284-82-04
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73

E-mail: lim_new@mail.ru

Адрас у Інтэрнэце:
www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі, асноўнае месца працы, сваротны адрас.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.
Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва".

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва".

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку"
г. Мінск,
пр. Незалежнасці, 79.

Індэкс 63856
Наклад 3613
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 7.05.2008 у 11.00

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715
Заказ — 2391

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ISSN 0024-4686